І. Д. Воюш В. І. Аляшкевіч

# Літаратурнае чытанне 6



І. Д. Воюш В. І. Аляшкевіч

# Літаратурнае чытанне

**Вучэбны дапаможнік для 6 класа першага аддзялення дапаможнай школы з беларускай мовай навучання**

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2021

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 821.161.3.09(075.3)
ББК 83.3(4Беи)я72
В79

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра беларускай і замежнай літаратуры
філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (дацэнт кафедры, кандыдат
філалагічных навук, дацэнт *Н. В. Заяц*);
настаўнік беларускай мовы вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
дзяржаўнай установы адукацыі «Дапаможная школа г. Брэста»
*Л. Р. Дзенісевіч*

## Умоўныя абазначэнні

** — тэкст павышанай складанасці

— адказваем на пытанні, выконваем заданні

— слоўнік

— разважаем, думаем самі

— робім разам з сябрамі

— робім разам з дарослымі

— гуляем разам

— жыццёвыя парады

— цікава ведаць

**Воюш, І. Д.**
В79 Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 6-га кл. першага аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання / І. Д. Воюш, В. І. Аляшкевіч. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2021. — 208 с. : іл.
ISBN 978-985-553-735-0.

**УДК 821.161.3.09(075.3)**
**ББК 83.3(4Беи)я72**

**ISBN 978-985-553-735-0**

© Воюш І. Д., Аляшкевіч В. І., 2021
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2021

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



# ПРЫЙШЛА З ВЯТРАМІ ВОСЕНЬ, ШУМІЦЬ ВЫСОКІ ЛЕС

***

Заціх на лузе звон пчаліны,
замоўк у лесе хор птушыны,
заглухла музыка жніва*.

І першым ранкам вераснёвым
спяшаецца з настроем новым
да школы роднае дзятва*.

Сышліся класныя сямейкі
на ўрачыстую лінейку.
Званочак весела гучыць.

Краіна ведаў, адчыняйся,
ніколі, шчасце, не канчайся,
вучыцца — шчасце і вучыць.

*(Васіль Жуковіч)*

**Заглу́хла му́зыка жніва́** — *тут:* скончылася жніво.
**Дзятва́** — дзеці.

1. Чаму заціхае прырода? Якая пара года пачынаецца?
2. Куды спяшаюцца першым вераснёвым ранкам дзеці?
3. Хто іх сустракае ў школе? Як гучыць першы званок?
4. Чаму радуюцца дзеці і настаўнікі? Прачытайце апошнія тры радкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Параўнайце першы і другі радкі. Які парадак слоў у сказах? Чым яны падобныя?
6. Вывучыце верш на памяць.
7. Паразважайце, чаму школу называюць Краінай ведаў.

### Верасень

Месяц Верасень багаты — у яго залатыя шаты*. Ходзіць ён па зямлі і дорыць ёй свае багацці.

Зайшоў Верасень у сады цяністыя, атрос ігрушы залацістыя. Асыпаў з яблынь духмяныя антонаўкі, чырвоныя крамяныя малінаўкі. Захінуў туманамі слівы сінія.



Выйшаў у поле, наставіў мяхоў бульбы. На лузе склаў у копы траву і падаўся ў лес.

Ідзе Верасень лесам. Прыбірае дрэвы ў дарагія ўборы: бярэзінку — у золата, асіну — у чырвань, на дубы павесіў модны ўбор. Не забыўся і пра каліну ды рабіну, прыхарашыў іх пацеркамі* чырвонымі. Пад пянёчкі ды пад кусточкі пасадзіў грыбочкі...



Азірнуўся Верасень, паглядзеў навокал: гарыць-палае асенні лес! Вось толькі няма красак, адцвілі...

Страсянуў Верасень з дрэў буйну́ю расу — і дзіва! Упалі да камлёў* зялёных сосен ды залатых бяроз драбнюткія званочкі! Зацвілі верасы! Таму і завуць гэты месяц Верасень.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Загулі, зазвінелі званочкі! Клічуць дзяцей у школу.

*(Паводле Клаўдзіі Каліны)*

**Ша́ты** — кроны, шатры.
**Па́церкі** — упрыгожанне на шыю (*рус.*: бусы).
**Камлі́** — ствалы.

1. У якія колеры ўбіраўся Верасень?
2. Якія багацці дарыў ён зямлі? Прачытайце.
3. Як упрыгожваў лес? Якімі сталі бярозы, асіны, дубы? Апішыце сваімі словамі.
4. Як выглядалі каліна і рабіна? Чым яны адрозніваюцца? А чым падобныя?
5. Як Верасень упрыгожыў верасы? Разгледзьце фотаздымак.
6. Паразважайце, чаму так называецца першы месяц восені.
7. Верасень у творы — гэта сапраўдны ці казачны персанаж?

## Надыход восені

...Непрыкметна* зусім
праплыве павуцінкай,
гляне жоўтым лістком
з-пад зялёнай хусцінкі.

Усплыве туманом
над рачулкаю соннай,
устрывожыць дымком
з пахам бульбы пячонай.

Зачаруе агнём
маладзенькай рабіны,
на адлёце крылом
памахае буслінам.

*(Паводле Петруся Броўкі)*

**Непрыкме́тна** — незаўважна.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Пра якую пару года гэты верш?
2. Што робіць восень? Прачытайце.
3. Якую карціну вы ўяўляеце, калі чытаеце верш? Што вы намалюеце на зямлі, у паветры, на дрэвах, у небе, у полі? Якімі фарбамі?
4. Які настрой перадаецца ў вершы — радасць або лёгкі сум? Як?
5. Ці доўга цягнуцца прыгожыя асеннія дні?
6. Якія пачуцці выклікае ў вас восень? Дапоўніце: *спакой,* …, … .

***

З часоў далёкіх,
самых даўніх,
які б яму ні выпаў лёс*,
да вучняў ідучы,
настаўнік з сабой у сэрцы
сонца нёс...

*(Паводле Міколы Чарняўскага)*

**Лёс** — доля (*рус.*: судьба).

1. Прачытайце ўважліва. Што настаўнік нясе ў сэрцы да сваіх вучняў?
2. Падумайце, які гэта чалавек, што «носіць сонца ў сэрцы».
3. Ці ведаеце вы людзей з сонцам у сэрцы? Раскажыце пра іх.

## Колькі раніц месціць ранец?

Як памножыш на гады
дні і месяцы,
тады
падлічыць набудзеш шанец*,
колькі раніц
месціць ранец.

Раніц многа
ранец месціць.
Кожны дзень
і кожны месяц
іх кіруе ў школу рана,
каб вучыліся старанна.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ты расцеш —
растуць гады.
Не сцішаючы хады,
раніцы ідуць з табой
з першай радасцю,
журбой*...

*(Рыгор Барадулін)*

**Ша́нец** — магчымасць (*рус.*: шанс).
**Журба́** — сум.

1. Прачытайце. Пра што гэты верш? Да каго звяртаецца аўтар?
2. Колькі дзён у тыдні? Колькі гэта раніц? А колькі раніц у месяцы?
3. Чым падобныя словы *ранец* і *раніц*? Чым адрозніваюцца?
4. Прачытайце выразна. Па жаданні вывучыце верш або яго частку на памяць.
5. Колькі гадоў дзеці вучацца ў школе? А колькі гэта будзе месяцаў? Палічыце з дарослымі.

## Твая настаўніца

Яна — твой першы капітан*,
у жыццё ты з ёю адплываеш:
то Волгу-Дон*, то акіян*
ты з ёю адкрываеш.

А лічбы пад яе рукой —
разумныя, жывыя!
Яны становяцца ў строй,
нібыта вартавыя...

Яна — твой казачнік, паэт,
і ты, як быццам першы,
уваходзіш у прасторны свет
былін, паэм і вершаў.

І любіш ты, як ён, як я,
жанчыну ў строгім плацці.
Яна — настаўніца твая,
твая другая маці.

*(Эдзі Агняцвет)*

**Капіта́н** — камандзір, кіраўнік.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Во́лга** і **Дон** — назвы рэк; **Во́лга-Дон** — канал, які злучае гэтыя рэкі.

**Акія́н** — вялізная водная прастора.

1. Каму прысвечаны верш?
2. Чаму настаўніцу называюць капітанам? Што яна робіць?
3. Пра якія ўрокі гаворыцца ў кожным слупку? Уважліва прачытайце ланцужком з першага па трэці слупок.
4. Чаму настаўніцу называюць другой маці? Скажыце словамі верша.
5. Калі адзначаецца Дзень настаўніка? Як у гэты дзень ушаноўваюць настаўнікаў? Спытайцеся ў дарослых ці знайдзіце разам з імі звесткі ў інтэрнэце.

## Школа

*Урывак з апавядання*

Прыйшла восень. Асыпалася лісце з дрэў. Агалілася зямля. Птушкі разляцеліся. Насталі кароткія, туманныя восеньскія дні.

У нядзельку Міхасёў бацька прыйшоў з царквы і сказаў: «Заўтра пачынаецца вучэнне. Пара і нашаму Міхасю вучыцца. Годзе, брат, табе бібікі біць* і ганяць сабак* па вуліцы. Пара і за навуку!»

Апошнія словы бацька сказаў да Міхася.

Задрыжалі ўсе жылкі* ў Міхася. Многа розных думак пранеслася ў яго галаве.

«Што ж? — падумаў ён сам сабе. — Вучыцца — дык вучыцца!»

Яму даўно хацелася ў школу. Толькі баяўся ён вучыцца.

— Тата! Ці б’ецца настаўнік? — спытаў Міхась бацьку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Як будзеш дурэць у школе, не будзеш слухаць настаўніка, будзеш ленавацца вучыцца, то і будзе сердаваць. Ды і я сам не пахвалю цябе за гэта.

«Ну не, брат, гэтага не будзе! — падумаў Міхась. — Дурэць-то я не буду. А вось старацца дык буду».

*(Паводле Якуба Коласа)*

**Бі́бікі біць, саба́к ганя́ць** — гуляць, ленавацца.
**Задрыжа́лі жы́лкі** — спалохаўся.

1. Пра што гэтае апавяданне?
2. Што вырашыў бацька з вучобай Міхася? Прачытайце яго словы.
3. Ці пагадзіўся хлопчык? Чаго ён баяўся?
4. Якое абяцанне даў сабе Міхась? Прачытайце апошні сказ.
5. Паразважайце, пра якую школу расказваецца. Пра сучасную ці пра даўнейшую? Чаму? Знайдзіце доказы ў тэксце.

## Новы сшытак

### 1

Косцік вельмі любіў пачынаць новы сшытак. І першыя старонкі пісаў заўсёды вельмі акуратна, старанна. Літары выходзілі роўныя і прыгожыя.

Але чым далей пісалася ў сшытку, тым бруднейшыя выходзілі старонкі. Літары пачыналі «скакаць», рабіліся нібы гарбатыя.

Косціку і самому брыдка* было глядзець на сапсаваны сшытак. Не дапісаўшы сшытак да канца, ён кідаў і браў новы. Але з новым сшыткам выходзіла тое самае. Зноў мазаніна*, крывыя літары. І зноў прыходзілася браць новы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Аднойчы тата спыніўся каля стала, за якім рабіў урокі Косця. Узяў у рукі адкінуты сшытак.

— Бачу, сынок, не цэніш ты людской работы, — сказаў ён.

— Якая работа! — запярэчыў сын. — Колькі там той сшытак каштуе!

— Колькі каштуе, — паківаў галавою тата. — А ці ведаеш ты, колькі трэба працы, каб такі сшытак зрабіць?

— Падумаеш, — сказаў Косцік, — некалькі ліскоў сашчапіць!..

— А як тыя лісткі робяцца, ты ведаеш?

— З паперы.

— Так, з паперы, а папера з чаго?

Косцік маўчаў.

**Бры́дка** — непрыемна.
**Мазані́на** — размазаныя непрыгожыя літары.

1. У якім сшытку любіў пісаць Косцік?
2. Што адбывалася далей? Якім станавіўся новы сшытак?
3. Што не спадабалася тату? З якімі словамі ён звярнуўся да сына?
4. Ці змог Косцік адказаць на пытанне таты?
5. Прачытайце выразна. Размову бацькі з сынам прачытайце па ролях. Перадайце інтанацыяй, як спрачаліся сын і бацька.
6. Ці можаце вы адказаць на пытанне таты? Ці ведаеце, з чаго і як вырабляюць паперу? Спытайцеся ў дарослых.

## 2

— Папера з дрэва робіцца, — пачаў тлумачыць тата. — Значыць, каб сшытак зрабіць, трэба дрэва спілаваць... А каб дрэва спілаваць, бензапіла патрэбна... А пілу з мета-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

лу робяць... А каб метал атрымаць, трэба спачатку руду знайсці... Потым вывезці яе з шахтаў на машынах, на цягніках... А машыны ды цягнікі таксама зрабіць трэба. Так што на твой сшытак сотні людзей працуюць, а можа, і тысячы.








Геолагі руду шукаюць, сталявары метал выплаўляюць. Рабочыя машыны робяць. Машыністы ды шафёры водзяць цягнікі, самазвалы. А для той пілы ды самазвала яшчэ і бензін патрэбен. Значыць, і нафту* трэба з зямлі здабыць...

Косцік слухаў тату і дзівіўся. Ён ніколі не думаў, што звычайны сшытак робяць так шмат людзей.

— А тое дрэва? — гаварыў тата. — Яно расло, можа, сто гадоў. А яго спілаваць трэба. Завезці на фабрыку, каб паперу на твой сшытак зрабіць. У клетачку ці ў лінейку.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А ты дапішаш сшытак да палавіны і выкідаеш… І новы пачынаеш…

«Цікава, — думаў Косцік. — Калі на звычайны сшытак працуе тысяча чалавек… То як жа на ўсё астатняе?»

Косцік агледзеў свой стол. На ім ляжалі кніжкі, сшыткі, каляровыя алоўкі, ручка, лінейка. Ён узяў у рукі лінейку. І раптам уявіў, колькі людзей рабілі гэтую няхітрую прыладу. Асцярожна паклаў лінейку на стол. Падсунуў да сябе недапісаны сшытак. І даў цвёрдае слова — пакуль гэтага не дапіша, новага не пачне.

*(Паводле Лідзіі Арабей)*

**На́фта** — карысны выкапень, з якога робяць бензін.

1. Што даведаўся хлопчык пра паперу? Разгледзьце фотаздымкі.
2. Чым уразіў яго аповед бацькі?
3. Якое цвёрдае слова даў сабе Косцік?
4. Паглядзіце на прадметы вакол. Падзяліцеся думкамі, як гэтыя прадметы дайшлі да вас, хто іх зрабіў.

## Падранены журавель**

### 1

Сонца яшчэ гарачае, але не такое пякучае, як летам. Неба сіняе, чыстае. Рассякаючы крыламі паветра, носяцца ластаўкі. Ловяць розных мушак і мошак. На правадах сядзяць чароды шпакоў. Яны цяпер набіраюцца сілы перад адлётам у вырай.

У адзін з такіх дзён раптам чуецца ціхае курлыканне. Хлопцы задзіраюць галовы. У небе шнурочкам* выцяг-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

нуўся жураўліны клін. Наперадзе кліна, відаць, вопытны журавель, які вядзе чараду. За ім ляцяць астатнія птушкі.

Сумна ад ледзь чутнага курлыкання. Хлопцы сядзяць каля вогнішча. Яны пякуць бульбу. Што смачней за печаную бульбу, якая тут, на полі, асабліва пахне і мае выдатны смак?!

Зноў даносіцца зверху курлыканне — ціхі меладычны звон. У небе ледзь бачным шнурочкам цягнецца новы жураўліны клін...

І вось далёкае курлыканне перарываецца адчайным, рэзкім крыкам. Хлопцы заўважаюць: адна птушка зніжаецца, вось-вось кранецца зямлі. Нарэшце журавель садзіцца на ржышча*, працягвае трывожна крычаць.

Хлопцы наперагонкі кідаюцца да птушкі.

Дык вось ён які, журавель! Адно крыло ў яго звісае, цягнецца па зямлі. Яно, відаць, перабіта.

**Шнуро́чкам** — адзін за адным.
**Ржы́шча** — поле пасля ўборкі збожжа.

1. Якое надвор'е паказана ў творы? Якая пара года?
2. Як паводзілі сябе ластаўкі і шпакі? Прачытайце.
3. Чыё курлыканне чулі хлапчукі? Што назіралі?
4. Што здарылася з жураўлём?
5. Прачытайце і перакажыце блізка да тэксту.

**2**

У гэты час па пыльным шляху гоніць статак цялят Ілля Звон. Ён забірае жураўля.

У цялятніку Ілля, які зімой працаваў даглядчыкам, абсталяваў для падраненага жураўля закутак* на кармакухні*. Тут цёпла, утульна. Карміўся журавель тым, што



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і цяляты. Ахвотна еў бульбу, буракі, бручку, прызвычаіўся піць цялячае пойла*.

Усю восень і зіму хлопцы перадавалі адзін аднаму навіны пра жураўля. А вясной Ілля паклікаў іх да сябе на калгасны двор, сказаў:

— Трывожыцца журавель. Крычыць, ірвецца некуды. Відаць, жураўлі прылятаюць.



Ён адчыніў дзверцы. І адразу з катушка выскачыў журавель. Сапраўдны прыгажун — цёмна-шэры, з пышным хвастом, моцнымі нагамі. Дзівіліся хлопцы: журавель нібы пад музыку пачаў перабіраць нагамі — быццам танцаваў. Затым узляцеў, падняўся над хлявамі, хатамі, зрабіў тры-чатыры кругі і неўзабаве* знік з вачэй.

*(Паводле Івана Навуменкі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Заку́так** — адгароджанае месца.
**Кармаку́хня** — памяшканне, дзе гатуюць корм для жывёлы.
**По́йла** — вадкая ежа для жывёлы.
**Неўзаба́ве** — хутка.

1. Хто дапамог жураўлю?
2. Як клапаціўся Ілля пра жураўля? Куды пасяліў? Чым карміў?
3. Колькі часу жыў журавель на кармакухні?
4. Які́м ён стаў за гэты час? Апішыце жураўля словамі з тэксту.
5. Як журавель пакідаў двор? Прачытайце.
6. Паразважайце, чаму журавель лятаў кругамі над дваром. Каму дзякаваў? Ці выжыў бы ён, калі б яму не дапамаглі людзі?

## Услед за сонцам

Першы дзень лістапада быў празрысты, як сцюдзёная вада.

Чулася гагатанне гусей. Іх яшчэ не было відаць. Але вось на небе з'явіліся ледзь прыкметныя кропкі, якія раслі, павялічваліся. Гэта ляцела вялікая чарада дзікіх гусей. Птушкі гагаталі, нібыта спрачаліся, ці правільны кірунак трымае іх важак.

Нечакана з-за лесу насустрач гусям вырваўся самалёт. Ён прайшоў вышэй, над птушкамі.

У гусіным страі пасля гэтай сустрэчы нешта здарылася. Птушкі закружыліся на адным месцы, моцна гагочучы. Ці не сварыліся яны?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Неўзабаве ад чарады аддзяліўся адзін гусак. Гэта, відаць, быў важак. Яму ў хвост пачалі прыстройвацца астатнія птушкі. Шнур аднавіўся гэтак жа хутка, як і разбурыўся.

Самалёт даўно знік з вачэй. Не чуваць было гулу матора. А гусіны шнур усё яшчэ вісеў у чыстым блакітным небе. І да вушэй даносілася глухое гагатанне.

Гусі ляцелі на поўдзень — услед за сонцам.

*(Паводле Змітра Бяспалага)*

1. З чым параўноўваецца першы дзень лістапада?
2. Якія птушкі ляцелі высока ў небе? Як іх распазналі?
3. З чым сустрэліся птушкі?
4. Што здарылася ў птушыным кліне?
5. Як аднавіўся птушыны шнур? Хто павёў птушак?
6. Паразважайце, які быў кірунак птушак. Як вы разумееце апошні сказ тэксту?

## Бабка

Ходзіць бабка лесам-гаем,
у хусцінaчку збірае:
даланясты* ліст кляновы —
хлеб на ім пячы жытнёвы,
а дубовы ліст — для бочкі,
каб хрумсцелі агурочкі,
а бабоўнік кучаравы —
каб не страціць смак да стравы,
ліст малінавы — для чаю,
што ад кашлю памагае,
ад дакучлівай ламоты*...
Ачаплялася лістамі,
ягаднікамі, імхамі,
што, як сядзе ў цень
мурожны*,
і вавёрка не адрозніць:
ці то бабка каля сцежкі,
ці пянёк, ці сыраежка?

*(Паводле Максіма Танка)*

**Даланя́сты** (ліст) — *тут*: як далонь.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Ламóта** — боль, хвароба.
**Мурóжны** — лугавы.

1. Дзе збірае травы бабка? Знайдзіце ў вершы і прачытайце.
2. Што для чаго збірае? Дапоўніце: *ліст кляновы ..., ліст дубовы ..., бабоўнік кучаравы ..., ліст малінавы ...* . Якія з назваў раслін вам невядомыя?
3. Ці многа ўсяго назбірала бабка? З чым яе параўноўвае аўтар?
4. Прачытайце выразна. Павольна прагаворвайце пра кожную расліну.
5. Паразважайце, ці многа зёлак ведае бабка. Ці можна яе лічыць сапраўдным знаўцам прыроды?
6. Абмяркуйце з дарослымі, ці можна лячыцца раслінамі, якіх не ведаеце.
7. Якія карысныя зёлкі вы запомнілі з верша? Што будзеце збіраць асабіста вы?

## Гутарка грыбоў

...Ускрай лесу, каля поля,
дзе ў сяло вядзе дарога,
сыраежак — розны колер —
ранкам высыпала многа...

Падбярозавік да іх:
— Дзеці зрэжуць вас усіх!
— Уцякайма* лепш,
сястрычкі, —
грыбнікі ідуць сюды,
дачакаемся бяды!

— Але дзе схавацца?
— Як?
— Мо падацца
у гушчар!
У хмызняк*?! —
закрычалі ўсе грыбкі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

...Толькі той з людзей пачуе
незвычайны гэты крык,
хто з прыродай пасябруе,
хто сапраўдны сам грыбнік.

*(Авяр'ян Дзеружынскі)*

**Уцяка́йма** — давайце ўцячом.
**Хмызня́к** — зараснікі, кустоўе.

1. Прачытайце. Пра якія грыбы расказвае аўтар?
2. Якога колеру сыраежкі і лісічкі? Ці добра іх бачна на зялёным імху?
3. Аб чым хвалююцца грыбы? Каго баяцца?
4. Куды збіраліся схавацца грыбы?
5. Падумайце, гэта казачная ці сапраўдная гісторыя. Ці размаўляюць грыбы?
6. Прачытайце выразна. Звяртайце ўвагу на знакі прыпынку. Перадайце голасам, як грыбы спалохаліся і разгубіліся.
7. Каго называюць сапраўднымі грыбнікамі? У якіх месцах яны знаходзяць грыбы? Знайдзіце падказку ў вершы.
8. Абмяркуйце з дарослымі, як трэба збіраць грыбы. Чым яны карысныя? Чым небяспечныя?

## Мухамор

На ўскрайку лесу вырас вялікі мухамор. Бачылі яго многія грыбнікі. І ўсе праходзілі міма. Ну каму патрэбен гэты ядавіты грыб?

Аднойчы дзядзька Васіль пайшоў у грыбы. І таксама ўбачыў той мухамор. Спыніўся дзядзька, залюбаваўся пры-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

гажосцю мухамора. Які ж ён святочны, яркі! Шапка чырвоная, белымі кропкамі ўсыпана. Усе грыбы прытойваюцца ад грыбнікоў у траве і моху, пад лісцем хаваюцца. Гэты ўсім у вочы кідаецца. Нібы крычыць і папярэджвае: не чапайце мяне, я — мухамор!

Над мухаморам тырчала сухая галінка сасны. І грыб упіраўся ў яе шапкай. Аж ножка мухамора прагнулася. Многія грыбнікі бачылі, што галінка перашкаджае расці мухамору. Але ніхто не памог яму, не зламаў тую галінку. І навошта, лічылі яны, ратаваць паганы грыб. У кошык жа яго не пакладзеш. А нехта знарок растаптаў два мухаморы, што раслі побач. Зрабіў гэта, вядома, паганы чалавек. Сапраўдны грыбнік ніколі не будзе таптаць грыбы або збіваць іх нагой. Расце і няхай сабе расце. Лесу ўсе грыбы патрэбны. Без іх лесу дрэнна жыць. А яшчэ, кажуць леснікі, мухаморы — гэта лекі для лясных звяроў.



Дзядзька Васіль прысеў перад мухаморам. Ён зламаў галінку, якая перашкаджала мухамору расці. Мухамор хіснуўся ўбок. І пад чырвонай шырокай шапкай дзядзька ўбачыў крамяны* прысадзісты баравік.

Трэба ж, куды схаваўся, хітрун, быццам парасонам накрыўся. Ну хто б дадумаўся шукаць яго пад мухаморам? Сядзеў дзядзька Васіль, усміхаўся, удачы радаваўся. І мухамор радаваўся, быццам казаў: «Ты, чалавеча, дапамог мне, а я за гэта табе баравіка падарыў».

*(Паводле Васіля Хомчанкі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Крамя́ны** — *тут*: моцны, пругкі.

1. Пра які грыб вы даведаліся з твора? Апішыце яго.
2. Як рос мухамор? Што перашкаджала яму?
3. Чаму мухамору ніхто не дапамог?
4. Што зрабіў дзядзька Васіль? Чым яму аддзячыў мухамор?
5. Прачытайце. Звяртайце ўвагу, пра што гаворыцца ў кожным абзацы. Перакажыце тэкст па абзацах.
6. Вызначце, што гэта за твор — верш, казка ці апавяданне.
7. Паразважайце, ці любіць дзядзька Васіль прыроду, лес. Для каго мухамор небяспечны, а для каго карысны?
8. Абмяркуйце з дарослымі, чаму лесу без грыбоў дрэнна. Як трэба ў лесе ставіцца да грыбоў?
9. Як бы вы паводзілі сябе ў лесе?

## А таму!

Змітрок, Валодзя і Маня ў лес ідуць. Па грыбы, мусіць. Ромка таксама ўхапіў кошык ды на вуліцу:

— І мяне вазьміце!

— Хадзем, — кажа старэйшы Змітрок. — Што нам — лесу шкада, ці што? Толькі не адставай ад нас. Каб не згубіўся часам.

**— Добра, — паабяцаў Ромка, — не адстану.**

Да лесу рукой падаць. Збеглі ў лагчынку. Перайшлі па кладцы рэчку — і ў алешнік*. А за алешнікам на ўзгорачку сасоннік. У ім дзе-нідзе бярозкі трапляюцца. Унізе ж малады ельнік. Самы баравіковы лес!

Усе прама пайшлі. А Ромка бачком, бачком ды налева. Рашыў прабегчы па тых мясцінах, дзе яны з бацькам раней былі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вось і знаёмая канаўка паўз дарогу. Ромка адразу крок прыцішыў, прыгнуўся крыху. Пачаў уважліва заглядваць пад елачкі ды разграбаць прыўзнятыя лісточкі. І аж уздрыгнуў ад нечаканасці. З-пад лапак выглядаў каранасты баравік-прыгажун. Ромка палюбаваўся ім, не спяшаючыся, зрэзаў і паклаў у кошык. Ступіў некалькі крокаў — яшчэ адзін. Азірнуўся вакол — трэці, чацвёрты!

А дзесьці ў глыбіні лесу крычалі Змітрок, Валодзя і Маня. Яго клікалі, але Ромка не адгукнуўся. «Яшчэ сюды прыбягуць і мае баравікі пахапаюць», — думаў ён...

Галасы Змітрака, Валодзі і Мані сталі ледзь чутныя. Ромка спалохаўся і пабег да сяброў.

— Дзе гэта ты быў? — незадаволена сустрэў яго Змітрок. — Мы **ўсе ногі пазбівалі**, цябе шукаючы.

— Заблудзіўся я, — зманіў Ромка і апусціў долу вочы. — Адышоў ад вас і заблудзіўся.

Падбеглі Валодзя і Маня.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— А мы цябе шукалі, шукалі, — пачала Маня. — Думалі ўжо ў вёску бегчы ды старэйшых клікаць...

— Дадому час, — спыніў яе Змітрок і звярнуў на дарогу.

Ромку было няёмка перад сябрамі. Ён ішоў за імі, апусціўшы галаву. Але настрой яго адразу ўзняўся, калі яны ўвайшлі ў вёску.

— Глядзі ты, — дзівіліся сустрэчныя, — такі малы, а поўны кошык баравічкоў накалупаў*. А ты, Змітрок, пэўна, **варон лічыў**! Толькі дно закрыў.

Хацеў Змітрок сказаць, што не да баравікоў яму было, што вось гэтага Ромку шукаў, ды змаўчаў.

Назаўтра Ромка сам да Змітрака пайшоў. Там Валодзю і Маню застаў. З кошыкамі.

— І я з вамі! — гукнуў Ромка.

— Не, — панура адказаў Змітрок, — мы цябе з сабой не возьмем.

— А чаму?

— А таму! — адказаў за Змітрака Валодзя.

*(Паводле Міколы Янчанкі)*

**Але́шнік** — альховы лес, зараснікі вольхі.
**Накалупа́ць** — *тут*: сабраць.

---

**1.** Прачытайце або праслухайце твор. Аб кім гаворыцца ў тэксце?
**2.** Куды збіраліся дзеці?
**3.** Аб чым яны дамовіліся? Што абяцаў Ромка?
**4.** Як павёў сябе хлопчык у лесе? Чаму не паклікаў дзяцей?
**5.** А як павялі сябе дзеці?
**6.** З якім здабыткам вяртаўся з лесу Ромка? А яго сябры? Чаму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**7.** Як адчуваў сябе Ромка перад сябрамі? Ці правільна ён зрабіў?

**8.** Чаму дзеці не ўзялі яго з сабою на другі дзень? Ці надзейны сябар Ромка?

**9.** Прачытайце выразна. Перакажыце гісторыю пра Ромку сваімі словамі.

**10.** Растлумачце, як вы зразумелі выдзеленыя выразы. Калі так гавораць?

**11.** Абмяркуйце з дарослымі, ці трэба выконваць свае абяцанні. Чаму вучыць гэты твор?

## Хлеб

З любоўю
хлеб у рукі я бяру —
і дзякуй хлебаробу*
гавару:



за вырашчаны ў полі
ўраджай
і за духмяны
пышны каравай.



З любоўю
хлеб у рукі я бяру —
і дзякую за працу
млынару:

ён збожжа на муку
змалоць памог,
каб раніцою хлеб
на стол мой лёг.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З любоўю
хлеб у рукі я бяру —
і дзякуй пекару
таксама гавару:

працуе шчыра
летам і зімой,
аддaны хлебу ён
усёй душой.



З любоўю
хлеб у рукі я бяру —
і ад душы, ад сэрца
гавару:



— Дай Бог, каб хлеб
заўжды быў на стале,
дарыў любоў,
якой нам не стае*.

*(Віктар Кудлачоў;*
*пераклаў з рускай мовы Мікола Сівец)*

**Хлебаро́б** — земляроб, селянін.
**Не стае́** — не хапае.

1. Каму трэба дзякаваць за хлеб? Прачытайце.
2. Хто што робіць? Дапоўніце: *хлебароб ..., млынар ..., пекар ... .*
3. Якія яшчэ людзі працуюць, каб хлеб дайшоў да нас? Падзяліцеся думкамі.
4. Знайдзіце паўторы ў вершы. Колькі разоў яны сустракаюцца?
5. Якім пачуццём прасякнуты гэты верш?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

6. Прачытайце апошні слупок. Што жадае аўтар?
7. Прачытайце верш. Перадайце інтанацыяй павагу да хлеба.
8. Па жаданні вывучыце верш на памяць.
9. Як ставяцца да хлеба ў вашай сям'і?

## Залаты лістапад

У лясах, на балоце
лістaвей,
лістапад.
І стаіць у пяшчоце
залацісты наш сад.

Клін ляціць жураўліны
над зямлёй
наўскасяк*.
Заірдзелі* каліны.
Пажаўцеў беразняк.

Павуцінай затканы
сенажаці,
лугі.
Лёг на лес, на паляны
сіні водсвет смугі*.

Каля клёнаў барвовых
вецер кружыць лісты.
У гаях,
у дубровах
лістапад залаты.

*(Паводле Віктара Гардзея)*

**Наўскася́к** — нярoўна, пад вуглом.
**Заірдзе́ць** — пачырванець.
**Смуга́** — туман.

1. Прачытайце. Пра якую восеньскую з'яву гэты верш?
2. Чаму лістапад названы залатым? Якія яшчэ колеры апісаны ў творы?
3. Ад якога слова ўтвораны *лістaвей, лістапад*? Што азначае кожнае слова?
4. Прачытайце слупкі ланцужком. Перадавайце задумлівы настрой, замілаванне родным краем.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Як вы думаеце, гэта верш пра чалавека, пра прыроду ці пра грамадства?
6. Вывучыце верш або яго частку на памяць.

**Чыстагаворка**

Як малое птушанятка,
перабег лісток дарожку.
Кінуўся за жоўтым статкам,
мільганулі толькі ножкі.

*(Васіль Вітка)*

## Не сілай, а розумам

*Беларуская народная казка*

Адзін чалавек пайшоў у лес дровы секчы. Насек дроў, сеў на пень адпачыць. Прыходзіць мядзведзь:

— Гэй, чалавек, давай будзем барукацца*!

Паглядзеў чалавек на мядзведзя. Бачыць, не здужаць яго.

— Э, — кажа чалавек, — што мне з табой барукацца! Давай спярша паглядзім, ці маеш ты сілу.

— А як глядзець будзем? — пытаецца мядзведзь.

Узяў чалавек сякеру, расшчапіў пень зверху, убіў у расколіну* клін* і кажа:

— Калі раздзярэш гэты пень лапаю, значыць, маеш сілу. Тады я з табой буду барукацца.

Ну, мядзведзь, не падумаўшы, тыц лапу ў расколіну. А чалавек тым часам трах сякерай па кліну — той і выскачыў.

Тут пень і сціснуў мядзведзеву лапу, як абцугамі.

Раве мядзведзь, танцуе на трох лапах. Але ні расшчапіць пень, ні вырвацца з яго не можа.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ну што, — кажа чалавек, — будзеш барукацца са мной?
— Не, — енчыць* мядзведзь. — Не буду.
— То-та ж, — сказаў чалавек. — **Не толькі сілаю барукацца можна, але і розумам.**

Убіў ён клін назад у пень. Мядзведзь вырваў лапу ды ходу ў гушчар без аглядкі. З таго часу ён і баіцца сустракацца з чалавекам.

**Барука́цца** — змагацца, мерацца сілай.
**Раско́ліна** — шчыліна.
**Клін** — завостраная прылада з дрэва (дапамагае раскалоць пень ці палена).
**Е́нчыць** — плача, скуголіць.

1. Прачытайце ці праслухайце казку. Назавіце галоўных герояў.
2. Што прапанаваў мядзведзь чалавеку?
3. Што прыдумаў чалавек? Растлумачце сэнс выдзеленых слоў.
4. Чаму чалавек прышчаміў мядзведзю лапу? У каго больш сілы?
5. Прачытайце казку па ролях. Перадайце інтанацыі чалавека і мядзведзя.
6. Ці спадабалася вам казка? Раскажыце яе сябрам і сваім бацькам.
7. Чаму вучыць гэтая казка? Якая яе галоўная тэма?

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Якой тэмай аб’яднаны творы «Колькі раніц месціць ранец», «Твая настаўніца» і «Школа»? Назавіце аўтараў твораў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. У якім апавяданні хлопчык любіў пачынаць новы сшытак? Што даведаўся хлопчык ад бацькі пра сшытак? Перакажыце сваімі словамі.
3. Якая галоўная думка твора «Падранены журавель» Івана Навуменкі? Што аўтар хацеў сказаць людзям? Перакажыце твор блізка да тэксту.
4. Што вы даведаліся з твора «А таму!» Міколы Янчанкі? Якая яго тэма?
5. Якія творы з гэтага раздзела пра дабрыню? А якія — пра кемлівасць?
6. Якія прыметы восені вы запомнілі? Што назіралі ў прыродзе? Складзіце невялікі тэкст на тэму «Восенню ў лесе» па пачатку: *Лес восенню вельмі прыгожы. Вось...*
7. Параўнайце словазлучэнні: *восень у горадзе* і *восень у гародзе*. Чым яны адрозніваюцца?
8. Здагадайцеся, якіх слоў не хапае ў народнай прымеце пра восень:

   *Жураўлі ляцяць высока — зіма яшчэ ... .*
   *Жураўлі ляцяць нізка — зіма ўжо ... .*

9. Уявіце: вашы знаёмыя пытаюцца, якія творы прачытаць пра прыроду. Якія вершы вы параіце? А апавяданні?
10. Праверце свае поспехі ў пачатку навучальнага года. Прачытайце незнаёмы тэкст. Разам з дарослымі палічыце, колькі слоў за мінуту вы зараз чытаеце. Параўнайце з вашымі поспехамі за 4 і 5 класы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



# ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ

## Я — беларус

Я — беларус, я нарадзіўся
на гэтай казачнай зямлі,
дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
адвеку прашчуры* жылі.



Я — беларус, я ганаруся,
што маю гэтае імя:
аб добрай славе Беларусі
ў свеце знаюць нездарма!

Я — беларус, і я шчаслівы,
што маці мову мне дала,
што родных песень
пералівы
і зблізку чую, і здаля.

Я — беларус, і хоць сягоння
яшчэ малы, але скажу:
я родам з племя
непакорных
і прад бядой не задрыжу!

*(Ніл Гілевіч)*

**Пра́шчуры** — далёкія продкі; родзічы, з якіх пачынаўся род.

1. Ад чыйго імя напісаны гэты верш?
2. Як называюць нашу краіну? А нас? Знайдзіце паўторы ў творы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Чым ганарыцца маленькі беларус? Чытайце слупкі ланцужком.
4. Якім вырасце малы хлопчык? Паразважайце.
5. Якой аўтар бачыць Беларусь? Раскажыце сваімі словамі.
6. Падумайце, як трэба чытаць гэты верш. Весела ці ўрачыста? Гучна або ціха? Хутка ці разважліва, павольна?
7. Вывучыце верш або яго частку на памяць.

***



Вуліца маленства. Мастак *Алег Пяцін*

Ёсць у кожнага з нас незабыўны маленства куток,
як у птушак, дзе вывелі дзетак, гняздоўе.
Борам стаў стогалосы* за вёскай маленькі лясок —
для мяне ён адзіны на свеце ў маім Прыдняпроўі*.

Дзе б ні быў я далёка, куды б мяне лёс ні занёс,
хату матчыну помню — заўсёды стаіць прад вачыма.
Чую клёкат буслiны, пад акном — ціхі шэпат бяроз,
ты такой перад мной паўстаеш, дарагая Радзіма.

*(Паводле Яўгена Крупенькі)*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Стогало́сы** — шматгалосы, шумны.
**Прыдняпро́ўе** — мясціны каля ракі Днепр.

1. Прачытайце. Аб чым гэты верш?
2. Пра што ўспамінае аўтар? Дзе яго куток маленства?
3. Што герой памятае і любіць з дзяцінства? Параўнайце яго ўспаміны з карцінай Алега Пяціна «Вуліца маленства» (гл. с. 30). Падбярыце да малюнка словы з верша.
4. Як называюць месца, дзе нарадзіўся чалавек? А краіну, дзе нарадзіўся? Выберыце: *Радзіма, малая радзіма.*
5. Раскажыце пра сваю малую радзіму па пачатку: *Мая малая радзіма — гэта ... . Тут я нарадзіўся(лася) і больш за ўсё люблю ... . На маёй радзіме ёсць ... .*
6. Прачытайце верш выразна. Перадайце праз інтанацыю гонар за родны край.

## Мая Беларусь**

Неабсяжныя прасторы Беларусі! Лётаюць, плануюць тут буслы, наставіўшы белыя ветразі крылаў. Іх многія і многія тысячы. І паўсюль іх гнёзды.

І таму, мне здаецца, зямлю нашу, Беларусь, можна назваць зямлёй пад белымі крыламі.

Чаму «Беларусь»? Ёсць некалькі варыянтаў паходжання гэтай назвы. Першы: гэта белыя адзенні даўніх вясковых людзей. Іхнія белыя валасы, белы колер скуры.



Другое тлумачэнне. Гэта захаваная, зберажоная ад ворага зямля. Калі на нашы старажытныя славянскія землі прыйшлі татара-манголы, мы адбіліся. І менавіта таму мы «белая», «чыстая ад нашэсця татараў» Русь.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў. Гэта светлыя ад бяроз гаі, што аглухлі ад птушынага звону. І велічныя пушчы, падобныя на храмы. Пушчы, дзе горда нясуць свае кароны алені. Гэта бясконцыя рэкі, у якіх плешчуцца бабры і рыба на захадзе сонца. Гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці.



Гэта ў мінулым гераічная і шматпакутная зямля. Безліч разоў грукатала па ёй вайна. Але мы, дзеці Беларусі, ганарымся тым, што ў гэтых войнах яна ніколі не была агрэсарам*. Яна заўсёды мужна і да канца бараніла сваю праўду і веру.



Ёсць і горкая памяць у маёй зямлі. Кожны чацвёрты жыхар Беларусі загінуў у апошнюю вайну. Першай прыняла Беларусь удары ворага і гераічна змагалася з ім. Каб зберагчы волю, веру, Бацькаўшчыну! У лясах амаль чатырыста тысяч партызан цаною жыцця адстойвалі ад ворага сваю Радзіму.

Пранікніцеся любоўю да маёй Беларусі, людзі. Велічная, гордая, яна таго вартая*.

*(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

**Агрэ́сар** — *тут*: захопнік.
**Таго́ ва́ртая** — *тут*: дастойная павагі і гонару.

**1.** Якой краіне прысвечаны твор? Аб чым у ім расказваецца?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. Якая птушка стала сімвалам Беларусі? Чаму? Як вы разумееце выраз «зямля пад белымі крыламі»?
3. Што вы даведаліся аб паходжанні назвы *Беларусь*? Перакажыце.
4. Якія страты панесла Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны? Прачытайце.
5. З якімі словамі звяртаецца аўтар да людзей? Прачытайце апошні сказ.
6. Якія лічбы вам сустрэліся ў тэксце? Пра што яны сведчаць?
7. Дзе селяцца буслы? Ці ладзяць яны гнёзды ў шумных і неспакойных месцах? Чым вабіць іх наша зямля?

## Гульня «Фотазагадкі»

Знайдзіце ў тэксце Уладзіміра Караткевіча словы, якія адпавядаюць фотаздымкам краявідаў Беларусі.











Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Радзіма

На галінцы
маленькая птушка.
Прыляцела
з далёкіх краёў,
і спявае-шчабеча
пяюшка*
пад гамонку
зялёных лясоў.
Лёгкі ветрык
пявунню люляе*,
калыхае
ціхутка яе,
пра нягоды
яна забывае,
пра цяжкія
вандроўкі* свае.
Свеціць ласкава
сонца Радзімы,
саграваe
любімы той кут,
дзе гняздо ёсць,
прытулак адзіны,
вольна, добра
і радасна тут.

*(Авяр'ян Дзеружынскі)*

**Пяю́шка** — пявуння, спявачка.
**Люля́ць** — калыхаць.
**Вандро́ўкі** — *тут*: далёкія пералёты.

**1.** Прачытайце верш. Чаму радуецца птушка?
**2.** Адкуль яна прыляцела? Якім быў яе пералёт?
**3.** Што дапамагае птушачцы на Радзіме? Прачытайце.
**4.** Чаму аўтар называе яе *пяюшкай*? Знайдзіце ў тэксце.
**5.** Параўнайце словы *пяюшка і пявуння*. Чым яны падобныя і чым адрозніваюцца?
**6.** Знайдзіце ў канцы радкоў словы, якія рыфмуюцца. Напрыклад: ***птушка — пяюшка***, *краёў — ..., люляе — ..., Радзімы — ..., кут — ...* .
**7.** Абмяркуйце з дарослымі, ці выводзяць птушанят у цёплых краях пералётныя птушкі. Чаму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Буслы**

*Казка*

Здарылася гэта яшчэ ў той час, калі буслы ў наш край рэдка прыляталі. І ногі ў іх тады былі не чырвоныя, як цяпер, а белыя.

Аднаго разу вясной прыляцелі яны ў нашу пушчу. Селі на сухую верхавіну высокай сасны, што расла на ўзлессі.

— Вось тут і зробім сабе гняздо, — сказаў Бусел. — Тут рэчка блізка, балота побач, вужоў і жаб многа. Будзе нам і нашым дзецям спажывы даволі.

І пачалі буслы насіць на дрэва сухое ламачча*, мох. Сталі будаваць сабе дамоўку.

А трэба сказаць, што вясна таго года была няўдалая. То сонца прыпячэ, то снег пойдзе, то мароз ударыць.

Прачнуліся аднойчы буслы на досвітку, а вакол усё снегам пакрыта. Паляцелі яны на балота. Хацелі спажыву сабе здабыць, але нічога не знайшлі. Усё замерзла, заледзянела. Памарозілі буслы свае босыя ногі і вярнуліся назад.

А тут новая бяда! Вецер разбурыў і раскідаў гняздо.

Селі птушкі на сасне і засумавалі.

— Што ж мы з табой будзем рабіць? — загаласіла Бусліха. — Давядзецца памерці з голаду і холаду...

Падумаў, падумаў Бусел і так адказаў Буслісе:

— Не плач, сяброўка дарагая. Давай паляцім да людзей. Можа, яны нас пусцяць пагрэцца. Бачыш, вунь на ўзлессі хата стаіць. Давай паляцім туды.

А ў той старэнькай хатцы жылі ўдваіх дзед і баба. Ніякае гаспадаркі ў іх не было. Адна старая сівая авечка. Баба прала з воўны ніткі. Рабіла панчохі* добрым людзям. А дзед лавіў рыбу. Так яны і жылі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Тае раніцы дзед з бабай якраз былі ў хаце. Чуюць:

— Тук, тук, тук! — пастукаўся нехта ў дзверы.

— Пайдзі, дзед, паглядзі, хто гэта там стукае, — сказала баба.

Адчыніў дзед дзверы. Глядзіць, ажно буслы стаяць. Змерзлі, дрыжаць. То адну, то другую нагу падымаюць...

— Ой, баба, зірні, якія госці да нас прыйшлі! — гукнуў дзед.

— Заходзьце, заходзьце хутчэй у хату, — сказала баба.

Упусцілі дзед з бабай буслоў у хату. Абагрэлі, накармілі чым толькі маглі.

Паглядзела баба на босыя ногі птушак і кажа:

— Дам я вам, буслы, панчохі цёплыя, каб не мерзлі вашы ногі. А то вёсны ў нас халодныя часта бываюць.



І дала птушкам па пары панчох. Ды толькі панчохі тыя чырвоныя былі, з пафарбаванае пражы.

Надзелі буслы панчохі. І так ім зрабілася добра і цёпла, што і мароз не страшны.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзед старое кола на страсе сваёй хаты прыладзіў. І буслы зрабілі сабе новае гняздо. Больш надзейнае і трывалае.

Пачалі з таго часу буслы каля людзей трымацца. Рабіць свае дамоўкі на стрэхах, на дрэвах. Бліжэй да людскіх паселішчаў.

А тыя чырвоныя панчохі, што дала ім добрая бабка, буслы і цяпер носяць.

*(Паводле Клаўдзіі Каліны)*

**Ламáчча** — вецце, паламанае галлё.
**Панчóхі** — *тут*: доўгія шкарпэткі.

1. Прачытайце ці праслухайце казку. Ці чулі яе раней?
2. Дзе пасяліліся буслы? Як ладзілі гняздо?
3. Што здарылася з імі вясной?
4. Куды пайшлі буслы шукаць дапамогу?
5. Як сустрэлі іх дзед і баба? Чым дапамаглі?
6. Якія якасці людзей паказаны ў казцы? Прадоўжыце: *міласэрнасць, ... .*
7. Чаму, паводле казкі, буслы селяцца каля людзей?
8. Разыграйце пастаноўку паводле казкі. Дапоўніце казку сваімі словамі і выразамі.

## Драч і Крот

*Казка*

З далёкага цёплага выраю вяртаўся дадому Драч.

Гэтая шэрая птушачка ўлетку ў нас выводзіць сваіх дзяцей, а на зіму адпраўляецца ў Афрыку.

Цяжка ляцець Драчу. Малыя ў яго крыльцы. І таму ён дзе ляціць, а дзе і пешкі ідзе. Вось і цяпер, спусціўшыся на зямлю, ён ішоў і ішоў дадому. Ідзе сабе і думае пра гняздзечка пад кустом ракіты ў зялёным лузе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Раптам сустракае Крата. Сядзіць Крот у нары, высунуў пыску* і пытаецца ў Драча:

— Хто ты такі і куды ідзеш?

— Я — Драч. Вяртаюся з выраю на радзіму.



Расказаў Драч Крату пра свой родны край і пра далёкую афрыканскую зямлю, дзе заўсёды цёпла.

— А чаму ж ты не застаўся там, дзе заўсёды цёпла? — здзівіўся Крот. — Чаму ты кожны год выбіраешся ў такую дарогу? Ты ж да крыві скалоў свае ногі. Цябе ўсюды высочвае ястраб. Чаму ты церпіш такія пакуты*? Хто цябе кліча сюды?

— Радзіма, — адказаў Драч.

*(Паводле Анатоля Клышкі)*

**Пы́ска** — *тут*: даўганосая мордачка.
**Паку́та** — *тут*: мучэнне, цяжкасці.

**1.** Прачытайце. Назавіце галоўных герояў казкі.
**2.** Куды дабіраецца Драч? Які яго шлях дадому?
**3.** Разгледзьце малюнак. Апішыце птушку — яе памер, колер, дзюбу, лапкі, хвост, крылы.
**4.** Хто сустрэўся Драчу па дарозе?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Аб чым даведаўся Крот? Што яго здзівіла?
6. Што адказаў яму Драч?
7. Паразважайце, ці зразумеў Крот Драча. Ці бываў Крот далёка ад радзімы, ці сумаваў?
8. Даведайцеся ў дарослых, ці сумуюць людзі, калі надоўга ад'язджаюць са сваёй радзімы.

Драча яшчэ называюць дзяргач, дзяркач. Такая назва ў яго праз своеасаблівы гук, які птушка выдае вясной. Голас у драча рэзкі і падобны да слова «крррра».

### Дрымотна ціснуцца кусты

Дрымотна ціснуцца кусты
пад цёплы бок дубровы ціхай.
І ў цішыні за тры вярсты
чуваць, як п'е ваду ласіха.

*(Паводле Анатоля Грачанікава)*

1. Прачытайце верш. Аб чым гаворыцца ў ім?
2. Як апісвае родны край аўтар? Чым захапляецца?
3. Які настрой прыроды? Чаму так далёка чуваць гукі?
4. Вывучыце верш на памяць.
5. Абмяркуйце з дарослымі, калі здалёк лепш чуваць гукі: днём або ўначы.
6. Ці даводзілася вам слухаць прыроду? Хто быў побач з вамі?

### Непаўторны край**

У кожнага чалавека абавязкова ёсць свой дарагі і непаўторны край.

Ёсць такі край і ў мяне. Гэта — Віцебшчына.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Там намнога пазней, чым у цяплейшых раёнах Беларусі, зацвітае агурочнік.

Там намнога даўжэй спеюць зеленаватыя памідоры. Круглабокія гарбузы з белымі, незагарэлымі бакамі ляжаць у агародах амаль да самых замаразкаў.

Там тыдні на два пазней пачынаецца веснавая сяўба. Пазней выязджаюць у жніўнае поле камбайны. Зямля і сонца не паспяваюць за трохі меншае лета ўзгадаваць і выспеліць колас. Бо той час, калі расліна найбольш актыўна расце і выспявае, — там, у маім краі, ён хоць і не намнога, але ж карацейшы.

Там аж згінаюць да зямлі траву буйны́я і чыстыя жніўеньскія росы, якія выпадаюць раней.

Там намнога раней убельваюцца* знаёмыя мне зялёныя палі і пожні раннімі зазімкамі*.



А калі раптам па-восеньску жоўта і ўрачыста засвецяцца гаі і дубровы, то пад кожнаю бярозкаю абавязкова прарэжацца падбярозавік, пад кожнаю асінаю — падасінавік. А баравікі, гэтыя асмялелыя лесяняты*, выходзяць тады з-пад змрочных ялін.

Штосьці ад сапраўднай Поўначы ма́е, здаецца, мой край, мая Віцебшчына.

*(Паводле Янкі Сіпакова)*

**Убе́львацца** — пакрывацца белым інеем.
**За́зімкі** — першыя маразы.
**Лесяня́ты** — *тут*: жыхары лесу, дзеці лесу.

**1.** Пра які край гаворыцца ў творы?
**2.** Што пазней зацвітае і паспявае на Віцебшчыне? Чаму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Чым багатыя лясы Віцебшчыны?
4. Прачытайце тэкст выразна, быццам вы — экскурсавод па Віцебшчыне.
5. Ці ведаеце вы, дзе знаходзіцца Віцебшчына? Які горад з’яўляецца яе цэнтрам?
6. Спытайцеся ў дарослых, чым знакамітая Віцебшчына.
7. Як называецца ваша малая радзіма? У чым яе прыгажосць? Раскажыце сваімі словамі.

На поўдні Беларусі лета наступае ў самым пачатку мая, а на поўначы толькі праз два тыдні — у сярэдзіне мая. Дзень летам даўжэйшы на поўначы, а зімой — на поўдні.

## Дзіва-пшаніца

Каласіцца жыта. Побач з жытам дзесяць гектараў* пшаніцы. Яна кліча да сябе ўсіх... Бо гэта не пшаніца, а дзіва.



Высокая, каласы павіслі пад сваім цяжарам, глядзяць у зацянёную матухну-зямлю. Пшаніца спее, пад сонцам яна, як вылітая з медзі.

Глянь вокам на палетак — разлітая медзь. Цяжка ветру зварухнуць яе. А калі і паплывуць хвалі, то яны цяжкія, павольныя, не спяшаюцца наганяць адна адну.

Сюды любіць прыходзіць стары Несцер. Асабліва ранкам, калі на свеце толькі сонца


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

купаецца ў росах і ў лесе шчабечуць птушкі. І больш нічога і нікога. Яго сюды ніхто не пасылае. Ён як быццам яшчэ не верыць, што пшаніца сапраўды вырасла такая ўдалая...

Ходзіць стары Несцер і не можа адарваць вачэй ад гэтага залатога палетка. І на сэрцы такое шчасце!..

Ці хто думаў, што ў гэтай балотнай няўдаліцы* ды можна зрабіць з полем такое дзіва? Залатыя людзі ёсць на свеце, і залатыя ў іх рукі!

*(Паводле Піліпа Пестрака)*

**Гекта́р** — плошча зямлі сто метраў у даўжыню і сто ў шырыню.

**Няўда́ліца** — *тут*: неўрадлівая балотная зямля, няўдобіца.

1. Прачытайце. Пра якую расліну расказваецца ў творы?
2. Як апісана пшаніца? З чым параўноўваецца? Прачытайце.
3. Чаму прыходзіць на поле стары Несцер? Чым любуецца?
4. Чым здзіўляе людзей пшаніца? Якая яна вырасла?
5. На якім полі вырасла пшаніца? Хто яе вырасціў?
6. Намалюйце пшанічны колас. Якія колеры выберацe?
7. Паразважайце, пра каго так кажуць: *Залатыя людзі ёсць на свеце, і залатыя ў іх рукі!*
8. Абмяркуйце з дарослымі, што вырабляюць з пшаніцы.

**Гульня «Параўнанні»**

З чым бы вы параўналі спелыя каласы пшаніцы? Да чаго яны падобныя? Выберыце: *медзь, мора, золата, сонца, снег, васількі, вецер, дарога, рабіна, аксаміт, бярозавы гай*. Чаму вы зрабілі такі выбар?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Галасы поля


Гарох


Авёс

Звініць мяцёлкамі авёс:
— Я ў полі ўзрос,
мой добры лёс!
Каля яго бубніць
гарох:
— Расту за трох
каля дарог!


Канюшына


Лубін

— Я каню-ш-шына,
каню-ш-шына,
ружавашчокая
дзяў-ч-чына...

— Мяне хто ведае?
Я лубін!..
Мой кожны струк гудзе,
як бубен!


Ячмень


Жыта

— А пакланіся мне,
ячменю,
то атрымаеш
крупак жменю...

І шэпча жыта
самавіта:
— Людзей кармлю я хлебам
сыта!

*(Еўдакія Лось)*

1. Пра якія расліны гаворыцца ў вершы? Знайдзіце іх на фотаздымках.
2. Як апісаны галасы раслін? Прадоўжыце: *авёс звініць, гарох ... .*


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Як падае голас канюшына? Прачытайце.
4. Якія з раслін ідуць на корм жывёлам?
5. Пра якую канюшыну ідзе гаворка — белую ці чырвоную? Як вы здагадаліся?
6. Прачытайце верш па ролях.
7. Абмяркуйце з настаўнікам, што вырабляюць з аўса, жыта, гароху. Утварыце словазлучэнні са слоў. Напрыклад: ***ячменная мука***, ... *каша*, ... *хлеб*, ... *суп*.
8. Даведайцеся ў бацькоў, якія расліны вырошчваюць на палях вашай малой радзімы.

**Гульня «Ядомае — неядомае»**

Папрасіце сябра загадаць вам расліны. Калі ён назаве ядомую расліну, пакажыце, быццам вы ясцё лыжкай. Калі неядомую — схавайце рукі пад парту.

Словы для гульні: *лубін, авёс, жыта, грэчка, гарох, рамонкі, канюшына, боб, уюнок, бульба, васількі, кукуруза*.

## Зайцава помста

Ні за што ні пра што мядзведзь пакрыўдзіў зайца. Так стукнуў па галаве лапай, што ў таго ажно іскры з вачэй пасыпаліся.

— За што, Міхайла Патапавіч? — застагнаў заяц.

— Не крыўдуй, Даўгавухавіч, — сказаў мядзведзь. — Я пажартаваў.

— А каб я гэтак пажартаваў?

— Ха-ха-ха! — зарагатаў мядзведзь. — Каб гэтак жартаваць, трэба маю сілу мець.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прайшоў час. Аднаго разу заяц убачыў свайго крыўдзіцеля на другім беразе ракі. Мядзведзь збіраў маліны.

— Міхайла Патапавіч, плыві сюды, нешта цікавае скажу! — гукнуў заяц.

— Лепш ты плыві да мяне!

— Які з мяне плывец! Я і вады баюся.

Мядзведзь зацікавіўся, пераплыў раку. Заяц нізка апусціў галаву, пачухаў за вухам, быццам штосьці прыпамінаючы, уздыхнуў:

— Прабач, Міхайла Патапавіч, забыўся. Пакуль ты плыў, усё вылецела з галавы.

Мядзведзь моўчкі паплыў назад, у маліннік.

Праз нейкі час заяц гукае:

— Успомніў, Міхайла Патапавіч! Плыві хутчэй!

— А ты адтуль гавары.

— Нельга! Трэба, каб ніхто не чуў.

Мядзведзь, крэкчучы, палез у ваду, пераплыў раку.

Заяц зноў маўчыць.

— Што, забыўся?!





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Забыўся, — ледзь не плача заяц. — Сам не ведаю, што сёння са мной!

— Глядзі, Даўгавухавіч! Яшчэ раз забудзешся — вушы адарву! — пагразіў мядзведзь і паплыў у маліннік.

Толькі вылез з вады, а заяц гукае:

— Успомніў, Міхайла Патапавіч! Плыві хутчэй, пакуль не забыўся!

Мядзведзь зноў пераплыў раку.

— Дык што ты хочаш сказаць мне?

— На тым беразе малін шмат.

— І ўсё?!

— А хіба мала? — нібы здзівіўся заяц. — Спяшайся, а то абяруць дзеці.

Мядзведзь паплыў на другі бераг.

А заяц глядзіць услед ды пасміхаецца: «Лічыў мяне зусім слабым, а я адпомсціў табе, касалапаму здаравяку. Прымусіў паплаваць туды-сюды. Будзеш ведаць, як крыўдзіць зайцоў!»

*(Паводле Расціслава Бензерука)*

1. Прачытайце. Назавіце галоўных герояў твора.
2. Як мядзведзь пакрыўдзіў зайца? Ці справядліва зрабіў?
3. Як правучыў яго заяц? А ці быў мядзведзь у чымсьці вінаваты?
4. Ацаніце ўчынкі мядзведзя і зайца. Хто вам больш спадабаўся?
5. Прачытайце казку па ролях. Перадайце інтанацыю мядзведзя і зайца.
6. Чаму вучыць гэтая казка? Ці добра дужаму крыўдзіць слабага?
7. Ці здараюцца такія выпадкі ў жыцці людзей? Паразважайце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Яблыня

Пасадзіў калісьці на світанку
яблыньку малую каля ганку.
— Хай расце.

Працаваць мне хмара памагала —
клапатліва глебу палівала.
— Хай расце.

Я і сонца ў зімнюю часінку
саграва́лі кволую* сцяблінку.
— Хай расце.

Хутка я з кватэры пераеду.
А ўраджай знімаць майму суседу.
— Хай расце.

Пэўна, недзе ля другога дома
садзіць дрэўца друг мой незнаёмы...
— Хай расце.

*(Пятрусь Макаль)*

**Кво́лая** — *тут*: малая, слабая.

1. Прачытайце верш. Што пасадзіў чалавек?
2. Для чаго было пасаджана дрэўца?
3. Хто дапамагаў яблыньцы расці? Прачытайце.
4. Хто будзе збіраць ураджай з яблынькі?
5. Якая галоўная думка верша? Да чаго заклікае аўтар?
6. Што трэба зрабіць, каб паўсюль раслі дрэўцы? Прачытайце апошні слупок.
7. Прачытайце выразна. Перадайце інтанацыяй, як гаспадар клапаціўся пра маладую яблыньку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**8.** Абмяркуйце, для чаго садзяць дрэвы. Ці садзілі вы дрэўцы? Раскажыце, дзе і як гэта адбывалася.

**9.** У вольны час намалюйце, як расла яблынька. Спачатку была маленькая, потым большая, а пасля вялікая, з пладамі.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Успомніце, як называецца раздзел, творы з якога вы чыталі. Пры неабходнасці звяртайцеся да «Зместу» ў канцы дапаможніка.
2. Як называюць нашу краіну?
3. Што вы даведаліся пра паходжанне назвы «Беларусь»?
4. Якая птушка з'яўляецца сімвалам Беларусі? Чаму буслы селяцца каля людзей? Назавіце твор, у якім пра гэта расказваецца.
5. Якой тэмай аб'яднаны творы «Радзіма» Авяр'яна Дзеружынскага і «Драч і Крот» Анатоля Клышкі? Перачытайце гэтыя творы.
6. Што называюць малой радзімай? Як расказвае пра сваю малую радзіму Янка Сіпакоў у творы «Непаўторны край»?
7. Назавіце сваю малую радзіму. Раскажыце, што вы ведаеце аб ёй.
8. Аб чым успамінае герой верша «Ёсць у кожнага з нас...» Яўгена Крупенькі? А пра якія мясціны вы памятаеце з дзяцінства?
9. Якія віды твораў вы прачыталі ў раздзеле? Выберыце: *казкі*, *вершы*, *байкі*, *апавяданні*, *прыказкі*, *загадкі*, *песні*.
10. Які твор з гэтага раздзела вам спадабаўся? Якія новыя словы вы запомнілі?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



# ЗНОЎ ДА НАС ПРЫЙШЛА ЗІМА
# РУПНАЙ ГАСПАДЫНЯЮ

**Зімовы вечар**

Свеціць месяц серабраны,
зоркі рэзва* зіхацяць;
дрэвы інеем убраны,
зачарованы стаяць.

Па шырокаму абшару*,
неаглянднаму кругом,
плывуць цені лёгкай хмары
то паціху, то бягом.

*(Цішка Гартны)*

**Рэ́зва** — *тут*: ярка.
**Абша́р** — прастора.

1. Прачытайце. Якую карціну вы ўяўляеце са слоў верша?
2. Які час сутак апісаны ў вершы? Як вы здагадаліся?
3. Які стан прыроды ў вершы — мяцеліца ці зацішша? Знайдзіце доказы ў тэксце.
4. Якімі словамі аўтар апісвае з'явы прыроды? *Месяц (які?) ..., абшар (які?) ..., хмара (якая?) ...* .
5. Які гэта верш — пра прыроду, пра пачуцці чалавека або пра грамадства, дзяржаву?
6. Па жаданні вывучыце верш або яго частку на памяць.
7. Ці даводзілася вам назіраць прыроду ў зімовы вечар? Раскажыце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Снег



Снег у садзе, агародзе,
снег ідзе, ідзе, ідзе...
Ты не скажаш снегу: «Годзе*!»
Ад яго схавацца — дзе?

Ён павіс на дрэвах ватай,
прыляпіўся пакрысе*
белай воўнаю калматай
на платах і на страсе.

Навалiла снегу многа,
дык на вуліцу пайду
і да нашага парога
я сцяжынку пракладу...

*(Мікола Хведаровіч)*

**Го́дзе** — *тут*: хопіць, дастаткова.
**Пакрысе́** — *тут*: патроху, павольна.

1. Якая з’ява прыроды апісваецца ў вершы?
2. Што пакрыта снегам? Прачытайце.
3. З чым параўноўваецца снег? Знайдзіце ў тэксце.
4. Як выбрацца на вуліцу? Прачытайце апошні слупок.
5. Паразважайце, дзе ішоў снег. У вёсцы ці ў горадзе? Знайдзіце доказы ў творы.
6. Знайдзіце паўторы ў вершы. Як вы думаеце, ці доўга ішоў снег?
7. Хто чысціць снег у горадзе? А ў вёсцы? Падзяліцеся думкамі.
8. Прыдумайце фізхвілінку на словы верша.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Надыход зімы

Адшумелі свой час восеньскія вятры. Нізкія хмары выплакалі халодныя слёзы.

І вось у адзін дзень неспакойныя хмары падняліся вышэй, зрабіліся больш тугімі. Падзьмула з поўначы здаровым халадком. Зямля сушэла, пакрывалася цвёрдай скарынкаю. А пад ноч пасыпаў сняжок, спорны*, густы і сухі. Снег ішоў усю ноч і ўвесь заўтрашні дзень. Пад вечар снег суняўся*. На захадзе бліснула ласкавая ўсмешка сонца і патухла. У небе засвяціліся першыя зоркі. Прыціснуў мароз.

Кругом было так чыста, такая бель, аж сляпіла вочы. Лес пасвятлеў, пабялеў пад чысцюткаю белаю посцілкаю. Кашлатыя* лапы ялін гнуліся пад халодным пластом снегу. А маленькія елачкі на ўскрайку лесу і пні панадзявалі пышныя белыя шапкі-башлыкі* і хаваліся пад імі. І нельга было ўтрымацца, каб не памераць сваімі нагамі глыбіню снегавога покрыва...

*(Паводле Якуба Коласа)*

**Спо́рны** — *тут*: часты.
**Суня́цца** — перастаць.
**Кашла́тыя** — *тут*: пышныя, разгалістыя.
**Ша́пкі-башлыкі́** — *тут*: гурбы снегу.

1. Які час апісаны ў творы?
2. Прачытайце другі сказ. Што і як сказана пра дождж?
3. Якім быў надыход зімы? Апішыце паслядоўна: *Хмары... Зямля... Снег... Першыя зоркі... Мароз...*
4. Як выглядаў лес? Якімі сталі пасля першага снегападу *лес, лапы ялін, маленькія елачкі, пні*?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**5.** Параўнайце словы: *бель, пабялеў, белаю*. Чым яны падобныя? Што азначаюць? Што яны апісваюць у тэксце?

**6.** Прачытайце і перакажыце тэкст у паслядоўнасці, адзначанай у пытаннях 3 і 4.

**7.** Паразважайце, ці многа выпала снегу. Знайдзіце адказ у апошнім абзацы.

**8.** Як аўтар паказвае прыроду — як жывую ці нежывую істоту? Для даведкі: *хмары выплакалі слёзы, бліснула ласкавая ўсмешка сонца, елачкі панадзявалі пышныя белыя шапкі-башлыкі.*

**Чыстагаворка**

Белыя сыплюцца долу крышталікі,
белыя крышацца хмаркі ўгары.
Сосны захутаны ў белыя шалікі.
Белая мітусь у белым бары.

*(Ніл Гілевіч)*

### Зімой

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
і волен* лёгкіх санак бег.

Як мары*, белыя бярозы
пад сінявой начной стаяць,
у небе зоркі ад марозу
пахаладзеўшыя дрыжаць.

*(Паводле Максіма Багдановіча)*

**Во́лен** — вольны, свабодны.
**Ма́ры** — *тут*: прывіды, здані.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Якую пару́ вітае аўтар? Прачытайце першыя два радкі.
2. Знайдзіце ў вершы апісанні. Дапоўніце: *снег (які?) ..., вечар (які?) ..., бярозы (якія?) ..., зоркі (якія?) ... .* Ці прыгожую карціну намаляваў словамі паэт?
3. Які настрой верша? Задумлівы ці вясёлы?
4. Вывучыце верш на памяць.
5. Апішыце словамі, якую карціну ўяўляеце, чытаючы гэты верш.

## Неўміручая зорка паэта



Нарадзіўся Максім Багдановіч у Мінску. Тут, у сталіцы ёсць яго музей. А злева ад цэнтральнага ўваходу ў Вялікі тэатр оперы і балета стаіць яму помнік.

Дажываючы свае апошнія гады на поўдні, у далёкай ад радзімы Ялце, Багдановіч пісаў вершы. Ён меў ужо кнігу вершаў, якую назваў «Вянок». І гэта была яго адзіная ўцеха, што жыццё пражыта не марна. «Я не самотны*, я кнігу маю», — былі апошнія напісаныя ім словы.

Усяго дваццаць пяць гадоў пражыў ён на свеце. А неўміручая зорка паэта, якая ўзышла над зямлёю, будзе свяціць нам заўсёды ярка і высока.

*(Паводле Васіля Віткі)*

**Само́тны** — адзінокі.

1. Што вы даведаліся аб жыцці Максіма Багдановіча?
2. Як называецца яго кніга вершаў?
3. Абмяркуйце з дарослымі, чаму яго лічаць неўміручай зоркай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**4.** У вольны час наведайце музей Максіма Багдановіча ў Мінску.

Бацька Максіма Багдановіча больш за ўсё ганарыўся сваім малодшым сынам Львом. Той падчас вучобы ў гімназіі быў выдатным матэматыкам. Тады бацька яшчэ не ведаў, што яго сын Максім стане славутым паэтам, якога будзе ведаць увесь свет.

### Зіма-матуля

Добры дзень, зіма-матуля!
Ліпам белыя кашулі
падарыла,
а бярозам —
снежных хустак ад марозу
нарабіла.

Сонейка па снезе скача
і казыча* твар дзіцячы
жартаўліва.
Коўдру цёплую саткала,
каб зямля адпачывала, —
проста дзіва!

*(Аксана Данільчык)*

**Казытáць** — *тут*: свяціць на тварык (*рус.*: щекотать).

**1.** Каго вітае аўтар? Як ён называе зіму?
**2.** Якія падарункі ад зімы атрымалі ліпы, бярозы, зямля?
**3.** Што назіраецца ў прыродзе? Прачытайце апошні слупок.
**4.** Калі прачнецца зямля? У якую пару?
**5.** Знайдзіце апісанні па ўзоры: *ліпы (якія?)* ..., *хусткі (якія?)* ..., *коўдра (якая?)* ... .
**6.** Што рабіла зіма? Знайдзіце яе словы-дзеянні. А сонейка?
**7.** Прачытайце выразна. Па жаданні вывучыце верш або яго частку на памяць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## На лыжах

### 1

Прыехаў Рыгорка на зімовыя канікулы ў Селішча да дзеда Хведара. Тут, вакол вёскі, вельмі многа зручных для лыжнікаў узгоркаў. Поле за вёскай нагадвае хвалістае мора. Улетку, калі зямля квітнее ў пышнай зеляніне, яны не так кідаюцца ў вочы. А цяпер, у белым убранні, і сапраўды падобныя на замёрзлыя і зацярушаныя снегам высокія марскія хвалі.

Рыгорка не ўпершыню ў Селішчы. Ён бываў тут разы тры ўлетку, то з бацькам, то з маці. Меў тут сяброў, неаднойчы гойсаў* з імі па ваколіцах вёскі. Нават ездзіў на камбайне ў час жніва. Купаўся, лавіў рыбу, хадзіў у далёкі лес у грыбы і ягады. Але аднаго яго, ды яшчэ ў зімовую пару, адпусцілі з дому ў першы раз. Выпраўляючы ў дарогу, маці клапатліва і строга наказвала Рыгорку:

— Будзь асцярожны, нікуды далёка не адлучайся адзін — мала што можа здарыцца.

— Нічога не здарыцца, — сказаў на гэта бацька. — Канькі і лыжы — вось твой гарт*, Рыгорка! Запомні і дзейнічай.

**Гóйсаў** — *тут*: бегаў, гуляў, насіўся.
**Гарт** — *тут*: шанец загартаваць сябе.

1. Прачытайце. Назавіце галоўнага героя.
2. Куды прыехаў Рыгорка? Калі тут бываў раней?
3. Як бавіў час Рыгорка летам?
4. Што збіраўся рабіць зімой?
5. Які наказ ён атрымаў ад маці? А які — ад бацькі?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 2

Канькі як канькі — на іх не вельмі разгонішся ў вёсцы па заснежаных лужынах і рэчцы. А вось лыжы — іншая рэч. Яны ў Рыгоркі новыя, іх купіў бацька ў пачатку зімы. Лыжы такія хуткія, што трэба мець вялікі спрыт*, каб утрымацца на іх.

Вясковыя хлапчукі тут жа прыбеглі, як толькі даведаліся, што прыехаў Рыгорка да дзеда. А праз якую гадзіну ён з сябрамі быў ужо на полі.

Амаль усе прыйшлі на лыжах. Але кожны захацеў з'ехаць уніз на новых лыжах Рыгоркі.

Рыгорку ажно не верылася, калі ён назіраў, якія выкрутасы выраблеў на яго лыжах Валодзя. Ён то прысядаў на хаду, то спыняўся на ўсім разгоне. То рабіў нечаканы круты паварот, і снегавая замець* уздымалася за ім следам. Не, што ні кажы, гэта быў сапраўдны майстар. Куды там Рыгорку да яго!

Рыгорка, з'язджаючы ўніз, убіраў галаву ў плечы. Сутуліўся і моцна сціскаў палкі, трымаючы іх напагатове,





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

каб не ўпасці і паспець затармазіць. Ён некалькі разоў упаў, выкачаўся ў снезе.

На шчасце, сябры як быццам не заўважалі гэтага. Яны разбрыліся па полі, ганяліся адзін за адным. І вясёлы дзіцячы гоман і смех абуджалі наваколле.

— Ой і хораша! — радасна ўсклікнуў Рыгорка. Сэрца яго білася часта-часта. Ён з прагнасцю ўдыхаў паветра, усё цела яго напаўняла бадзёрасць.

*(Паводле Тараса Хадкевіча)*

**Спрыт** — умельства.
**За́мець** — снежныя пырскі.

1. Што прывёз Рыгорка на канікулы? Якія былі яго лыжы?
2. Як сустрэлі яго вясковыя хлапчукі?
3. На чыіх лыжах каталіся дзеці?
4. Як катаўся Валодзя? Прачытайце.
5. А як катаўся Рыгорка?
6. Як ставіліся хлапчукі да яго няўмелай язды? Ці заўважалі памылкі Рыгоркі? Чаму не смяяліся з яго?
7. Прачытайце і перакажыце па пытаннях. Дайце назву кожнай частцы.
8. Паразважайце, ці сапраўдныя сябры ў хлопчыка. Чаму? Ці навучыцца хлопчык катацца з такімі сябрамі?
9. Ці хацелі б вы мець такіх сяброў? Якія вашы сябры?

Каток павінен быць гладкі. Таму яго заліваюць не халоднай, а гарачай вадой. Халодная вада адразу застывае на марозе — і паверхня атрымліваецца няроўная, хвалістая. На такім лёдзе нязручна катацца. А гарачая вада пакуль астывае, то паспявае роўна расцячыся. І каток становіцца гладкі, як шкло.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Пакатаўся

Бег на рэчку, на каток,
бег пакоўзацца каток.
А прыбег — і разгубіўся,
пасярод катка спыніўся:

едзе задняя наперад,
а пярэдняя — назад,
быццам сто ў яго тых ног
і пад кожнай сто дарог!

— Як пачаць? З якой нагі? —
уваччу* плывуць кругі.
Едзе левая направа,
едзе правая налева,

і з якой пачаць нарэшце,
сам ніяк не разбярэшся.
Запытацца трэба ў таты —
і пабег каток дахаты...

*(Васіль Зуёнак)*

**Уваччу́** — у вачах.

1. Прачытайце. Які гэта верш — сур'ёзны ці жартоўны?
2. Хто галоўны герой верша? Ці дарослы каток?
3. Куды прыбег каток? Як у яго атрымалася пакоўзацца? Чаму?
4. Колькі лапак у катка? Што пра іх сказана? Куды яны едуць? Паспрабуйце паўтарыць ягоныя рухі.
5. Прачытайце першы і другі радок. Растлумачце сэнс слова «каток» у кожным радку.
6. Прачытайце выразна. Перадайце інтанацыяй разгубленасць катка.
7. Ці ўмееце вы катацца на каньках? Хто вас вучыў? Раскажыце.

## Сініца-жартаўніца

Сонечны дзень. На дрэвах шмат снегу. Белыя бярозы яшчэ больш пабялелі. Голле іх звісае, як карункі*. Ціха, ветру няма. Ні гуку, ні шолаху. Усё заснула мёртвым сном.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Стаю пад бярозаю. Вачэй не адвесці ад зімовага лесу. І раптам на галаву падае камяк снегу. Хто кінуў? Узнімаю галаву. Другі камяк трапляе проста ў твар. Расплюшчваю вочы. Хто гэта жартуе? Бачу: на тонкай галінцы сініца.

Скокнула на іншую галінку, а на мяне зноў упаў камяк снегу.

Абсыпала сініца мяне снегам і пераляцела на суседнюю бярозу. Стаю. Не варушуся. Чакаю. Мо вернецца назад?

Не вярнулася. Пераляцела на трэцюю бярозу і знікла ў снежнай белі*.

*(Паводле Змітра Бяспалага)*

**Кару́нкі** — *тут*: узоры, упрыгажэнне са снегу.
**Бель** — белая заслона.

1. Дзе адбываецца дзеянне ў творы?
2. Як выглядаў зімовы лес? Апішыце сваімі словамі.
3. Хто абсыпаў чалавека снегам?
4. Як паводзіў сябе чалавек у прыродзе?
5. Ці на самай справе жартавала сініца? Гэта казка ці апавяданне?
6. Прачытайце словы: *белыя, пабялелі, бель*. Чым яны падобныя? Чым адрозніваюцца? Якое са слоў — назоўнік, прыметнік, дзеяслоў?
7. Перакажыце змест ад свайго імя.
8. Прыдумайце з бацькамі працяг апавядання пра сініцу.

### Смяшынка

Ідзе ўрок малявання. Дзеці расфарбоўваюць грудку сініцы жоўтым колерам.
Настаўніца пытаецца:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Саша, а чаму ў цябе ўся птушка сіняя?
— Алена Іванаўна, дык яна ж так і завецца — сініца.

## Бегаў зайчык

Бегаў зайчык па сумётах,
пагубляў панчошкі.
Акалелі, азалелі*
зайчыкавы ножкі.

Босыя сляды на рэчцы
як пабачыў Вася,
клікаў зайчыка пагрэцца,
ды не дагукаўся*...

*(Васіль Зуёнак)*

**Акале́лі, азале́лі** — *тут*: вельмі замерзлі.
**Не дагука́ўся** — не змог даклікацца.

1. Прачытайце верш. Ці бывае такое на самай справе? Ці носяць зайкі панчошкі або шкарпэткі?
2. Ці трэба зайчыку грэцца ў хаце? Як зімуе заяц?
3. Чаму Вася клікаў зайчыка пагрэцца?
4. Вывучыце верш на памяць.

## Зайцу не спіцца

Пасля працяглых снегападаў выглянула марознае сонца. У такі дзень ішоў я паўз лес, слухаў гоман бору. Справа зіхацелі заснежаныя далі. На верхавіне старой хваіны, якая густа разраслася на ўзлеску, гойдалася шэрая варона. Над галавою захісталася галіна і пасыпаўся снег. Я глянуў туды. Вавёрка, узняўшы вушкі-кутасікі, сядзела на галіне і глядзела на мяне. «Вось якая я. А ты куды?» — нібы казала яна.

Раптам недалёка ад мяне з-за куста — скок заяц-шарак. «Выгаладаўся. Не дачакаўся ночы», — падумаў я. Заяц сеў, паварушыў вушкамі, нібы хацеў даведацца, ці можна бегчы далей у поле. Потым панюхаў паветра, узняў пярэднія лапкі. Паварушыў імі — відаць, замерзлі пасля цёплай


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



лежні*. Згрыз сухую сцябліну, якая бадзёра стаяла ля куста. Працёр лапкамі шчокі, падняў вушкі і спакойна паскакаў на заснежанае поле, дзе ўлетку раслі буракі. Пасля сябе на пульхным* снезе зайка пакідаў глыбокія сляды: два ў радок, два адзін за адным.

*(Паводле Яўгена Крамко)*

**Ле́жня** — месца, дзе начаваў заяц.
**Пу́льхны** — мяккі, рыхлы.

1. Якое надвор'е ўсталявалася пасля снегападу?
2. Што герой бачыў у лесе? Прачытайце і перакажыце сваімі словамі.
3. Чым была занята шэрая варона?
4. Як паводзіла сябе вавёрка?
5. Як апісаны паводзіны зайца? Знайдзіце і прачытайце.
6. Ці баяліся лясныя жыхары чалавека? Чаму? Як ён сябе паводзіў?
7. Перакажыце тэкст ад свайго імя. Выкарыстайце словы, ужытыя ў творы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Гульня «Лясныя жыхары»**

Пакажыце па чарзе, як паводзяць сябе жыхары зімовага лесу. Папрасіце сяброў адгадаць, каго вы паказалі.

Напрыклад: *заяц скача, натапырыўшы вушкі, варона ляціць і падае́ голас, зубр наставіў рогі і рые капытом, сініца ціўкае, воўк шчоўкае зубамі, вавёрка грызе шышку, алень горда паводзіць рагамі, сарока чэкае, глушэц пырхае са снегу.*

## Дабрадзей

Дзяцел —
лесу дабрадзей —
корміць
дарагіх гасцей:
снегіроў,
сінічак шустрых —
ежа ім
усім
па густу.
У глухім,
старым ляску
на яловым на суку
дзюбай моцна,
моцна б'е,
семкі з шышак
дастае,
выкідае
на сняжок:
— На, сілкуйся,
снегірок,
паспытай*, сініца,
смачнага гасцінца.

*(Авяр'ян Дзеружынскі)*

**Паспыта́ць** — пакаштаваць.

1. Прачытайце. Пра каго гэты верш?
2. Што робіць дзяцел? Каго ён частуе? Чым?
3. Як назваў верш аўтар? Прачытайце слова *дабрадзей*. З якіх частак яно складаецца?
4. Як вы думаеце, гэта казачная ці сапраўдная гісторыя? Што ў ёй казачнага? Што сапраўднага?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Што новага вы даведаліся з верша? Чаму можна павучыцца ў птушак?
6. Паразважайце, якіх людзей называюць дабрадзеямі. Ці ведаеце такіх людзей? Ці часта вы робіце добрыя справы?

## Зіма

Сыплецца мяккі, пушысты сняжок.
Белаю коўдрай накрыўся лужок,
лес нерухома стаіць за сялом.
Рэчка замоўкла пад тоўстым ільдом.
Птушкам знайсці зараз ежу цяжэй.
— Дзеці! Змайструем кармушкі хутчэй!
Зерне насыплем — хай птушкі дзяўбуць.
Песню ўдзячную нам прапяюць.

*(Алесь Ставер)*

1. Прачытайце. Пра якую белую коўдру гаворыцца ў вершы?
2. Чаму птушкам стала цяжка знайсці ежу?
3. Раскажыце сваімі словамі пра *сняжок, лужок, лес, рэчку* і *птушак*.
4. З якімі словамі аўтар звяртаецца да дзяцей? Прачытайце.
5. Вывучыце верш на памяць.
6. Якія кармушкі вы ўмееце рабіць? Дзе іх лепш размяшчаць?

Птушкі баяцца рэзкіх гукаў, яркіх колераў, шоргату і бляску, постацяў драпежнікаў. Таму кармушкі не трэба ўпрыгожваць званочкамі, мішурой, люстэркамі, фігуркамі птушак. Лепш аздобіць кармушку шышкамі, карой дрэў або іншымі прыроднымі матэрыяламі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Маленькі лесавічок

Аднойчы ў час палявання я заблудзіўся ў лесе.

І вось нечаканая сустрэча. З-за павароту лясной дарогі выкаціўся* насустрач мне гадоў дзевяці хлапчук. Ён быў у чорных валёнках і насунутай на вочы вушанцы. Усім сваім выглядам ён нагадваў мужычка-лесавічка.

— Як мне адгэтуль, хлопчык, у Зялёнае Вяззе трапіць? — пытаю я.

— Пойдзем, пакажу, — упэўнена, як бывалы чалавек, адказаў ён.

Па дарозе я даведаўся, што Васілёк — так звалі майго новага знаёмага — сын лесніка, які жыве недалёка адгэтуль.

— Напэўна, абед бацькаў у лес нясеш? — пацікавіўся я, заўважыўшы ў руцэ хлопчыка маленькую кужэльную* торбачку.

— Не, — адказаў ён. — Абед, але не бацьку.

— А каму ж?

— Курапаткам.

— А ці многа курапатак да тваёй кармушкі прылятае? — пытаюся ў хлапчука.

— Штук пятнаццаць.

— І што ж ты ім даеш?

— Усё тое, што і курам. Але асабліва яны грэчку любяць.

— Грэчку, кажаш?

— Нарасхват дзяўбуць!

За размовай мы не заўважылі, як падышлі да маленькага ляснога яра*.

— Вось бачыце, колькі іх сабралася там? — паказаў Васілёк рукой наперад.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



На схіле яра я ўбачыў з дзясятак натапыраных шэрых курапатак. Калі мы падышлі бліжэй, птушкі ўзняліся і паляцелі.

— Гэта яны вас спалохаліся, — растлумачыў Васілёк.

У яры, пад кустамі алешніку, я заўважыў некалькі маленькіх буданчыкаў*.

— Гэта такія кармушкі? — здзівіўся я. — А хіба не ўсё роўна: у такую кармушку сыпаць ці проста на снег?

— Вядома, не. Корм снегам не так замятае.

Мне нічога не заставалася, як згадзіцца. Адышоўшы з паўсотні крокаў, я азірнуўся. Маленькі лесавічок сыпаў у адзін з буданчыкаў прынесены птушкам корм.

*(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

**Вы́каціўся** — *тут*: нечакана з'явіўся, выйшаў.
**Кужэ́льная** — ільняная.
**Яр** — роў, лагчына.
**Буда́нчыкі** — шалашыкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Што здарылася з паляўнічым? Каго ён сустрэў у лесе?
2. Пра што даведаўся паляўнічы ад хлопчыка? Чаму назваў яго «бывалым чалавекам»?
3. Якімі былі кармушкі для курапатак? Чаму?
4. Ацаніце ўчынак хлопчыка. Ці можна назваць яго дабрадзеем?
5. Прачытайце па ролях, перадаючы інтанацыю герояў.
6. Паразважайце, чаму тэкст мае такую назву. Хто выступае знаўцам лесу — малы ці дарослы? Як вы думаеце, гэта казка ці апавяданне?
7. Што новага для сябе вы даведаліся з твора? Якія кармушкі патрэбныя курапаткам? Якое зерне яны любяць?

## Што прыносіць Новы год?

Што прыносіць Новы год?
Новы снег і новы лёд.
Новы ў полі лыжны след.
Новы ў новы цырк білет.
Новыя канькі, свісткі.
Новыя канікулы.
Новы дождж. І новы гром.
Пераезд у новы дом.
Новы смачны апельсін.
Не злічыць усіх навін!
Дык па-новаму жывіце,
толькі ўважліва сачыце,
каб у торбе Дзед Мароз
новых двоек не прынёс.

*(Леанід Дайнека)*

1. Прачытайце верш. Якое свята набліжаецца?
2. Якія пажаданні на Новы год змешчаны ў вершы?
3. З якога слова пачынаецца кожны радок? Колькі разоў паўтараецца гэтае слова ў вершы? Як гэта звязана з назвай свята?
4. Прачытайце апошні сказ. Пра што жартуе аўтар?
5. Вывучыце верш на памяць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**6.** Што б вы хацелі, каб прынёс вам Новы год? Раскажыце.
**7.** Што будзе новае ў наступным годзе для аднакласнікаў?

## Ёлка

Завітала ў госці ёлка —
з намі Новы год спаткаць,
ззяе ёлка, як вясёлка,
рада пець і танцаваць.

Зухаваты*, барадаты,
сыпле жарты Дзед Мароз.
Са Снягуркаю на свята
падарункі ён прынёс.

Вочы весняцца* ў Снягуркі,
добра ўсім каля яе:
нам Снягурка падарункі,
як усмешкі, раздае.

Што за дзіва — наша ёлка!
Што за свята — Новы год!
Ззяе ёлка, як вясёлка,
водзіць з намі карагод.

*(Мікола Чарняўскі)*

**Зухава́ты** — *тут*: вясёлы, смешны.
**Ве́сняцца** — ад слова «вясна»: яскрава свецяцца, радуюцца.

---

**1.** Прачытайце верш. Як вы можаце апісаць настрой твора?
**2.** Якое свята надышло? Хто галоўныя госці?
**3.** Знайдзіце і прачытайце паўторы. Якое ў іх заключана параўнанне?
**4.** Як паказана святкаванне Новага года? Перакажыце словамі з верша: *якая ёлка; што робяць Дзед Мароз і Снягурка; што робяць дзеці.*
**5.** Якія знакі прыпынку перадаюць радасць свята? Прачытайце апошні слупок.
**6.** Вывучыце верш на памяць. Прачытайце яго каля ёлкі ў школе або дома.
**7.** Новы год — гэта дзяржаўнае ці сямейнае свята?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Пустыя кармушкі

У школьным садзе дзеці
павесілі кармушкі,
каб у мароз і вецер
не галадалі птушкі.

Нацешыліся ўволю
каля кармушак-хатак,
не крышаць хлеба болей,
не сыплюць і зярнятак.

Відаць, заняты вельмі,
забыліся пра птушак,
і замяла завея
сцяжынкі да кармушак.

І аблятаюць птушкі
і сад, і хаткі тыя:
не радуюць кармушкі,
калі яны — пустыя.

*(Мікола Маляўка)*

1. Прачытайце верш. Якая яго тэма?
2. Што павесілі дзеці ў садзе? Як дапамаглі птушкам?
3. Пра што забыліся дзеці? Чаму птушкі аблятаюць кармушкі?
4. Ці вясёлы гэты верш? Прачытайце выразна. Перадайце настрой.
5. Да чаго заклікае аўтар у вершы? Што ён хоча сказаць?
6. Разам з дарослымі паразважайце, калі добры ўчынак можа зрабіцца нядобрым.
7. Што вы параіце дзецям? Як трэба было зрабіць? А як робіце вы?

## Калінавая рукавічка**

### 1

Расла на ўзлессі каліна. Была-была маленькай ды раптам, зусім неяк непрыкметна, вырасла. Зацвіла белым цветам, закрасавала — на дзіва і зайздрасць усім суседнім дрэвам.

— Ф-фарсуха, — пазіраючы на яе, аж трэсліся ад зайздрасці асіны. Яны былі заўсёды бледныя і зялёныя, і заўсёды ім было холадна.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Падумаеш, выстраілася*, — шапталі хмурыя яліны. Яны насілі цёмнае адзенне і размаўлялі толькі шэптам.

Дубкі таксама непрыхільна паглядалі на маладую каліну: яна зусім не звяртала на іх увагі.



Толькі старая яліна-казачніца спачувальна пазірала на каліну-прыгажуню і жаласна ківала галавой:

— Пацвіце, пакрасуецца ды і завяне. Не яна першая, не яна апошняя... Па лесе гуляе бура, ломіцца грубая жывёла, чалавек ходзіць... А ў яго нядобрыя рукі. Ён ломіць і крышыць усё, што ні стрэне на дарозе.

Яліна-казачніца пражыла доўгае жыццё і ўсяго нагледзелася за свой век. Цэлымі днямі гойдалася яна на старэчых нагах. Ды моўчкі прыглядалася да ляснога жыцця: як трымаюцца і пра што вядуць гутарку маладзейшыя дрэвы. Аб чым пяюць птушкі, куды лятае вецер-бяздомнік... Прыглядалася, прыслухоўвалася і ўсё шаптала сабе нешта, усё нешта шаптала...

**Вы́страілася** — *тут*: прыбралася, упрыгожылася (*рус.*: вырядилась).

1. Прачытайце або праслухайце казку. Назавіце яе галоўных герояў.
2. Якая вырасла каліна? Чаму ёй зайздросцілі суседзі?
3. Што аб ёй гаварылі асіны і яліны? Прачытайце.
4. Як глядзелі на каліну-прыгажуню маладыя дубкі? Чаму?
5. Што прадказала ёй старая яліна-казачніца? Прачытайце.
6. Якімі старая яліна лічыла людзей?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 2

Вавёрка жыла па суседстве з ялінай у цёплым асінавым дупле. Яна была свавольніца і балаболка*. Але старая яліна паважала вавёрку за працавітасць і спрыт. Усё лета рыжым полымем гойсала яна з дрэва на дрэва. Быццам нельга было прыдумаць іншага занятку. Але варта было толькі паказацца недзе яшчэ зусім далёка восені, як вавёрка кідала гульні і бралася за работу. Рамантавала сваю хату. Высцілала яе цёплым мохам. Законапачвала* ўсе дзірачкі. Потым з ранку да вечара насіла смачныя лясныя арэхі. Не прысядала ні на хвіліну...

Старая яліна толькі дзівілася: адкуль у вавёркі столькі сілы, каб цэлымі днямі працаваць? І сама не вытрымлівала. Набярэ духмяных зярністых шышак і высыпле вавёрцы.

— На вось табе. Будзеш зімой лускаць і дзякаваць бабулі-яліне.

— Дзякуй, дзякуй, бабулечка. Яны такія смачныя, такія смачныя, — дзякавала вавёрка, набіваючы да столі засекі ў сваім дупле.

І зноў: цок-цок — зноў рыжай маланкай мільгала ў суседнім арэшніку. Ого, вавёрка была вельмі руплівая гаспадыня. Пра гэта не раз гаварыла старая яліна зязюлі.

— Паглядзі, як трэба пра дом клапаціцца ды пра дзяцей: і каб цёпленька ім было, і каб смачненька. А ў цябе, матухна, паслухай, як плачуць дзеці, — дакарала яна зязюлю.

І сапраўды, у лясным гушчары, дзесьці далёка-далёка, чутно было адзінокае жаласнае «ку-ку»...



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Няхай не лётаюць гэтак далёка, дык і блудзіцца не будуць. Няхай дома сядзяць... — адмахвалася ад папрокаў зязюля.

— Дома, —ківала галавой яліна. — Дома... Які ж у іх дом? Вунь ты падкінула іх да мухалоўкі... Ну гадуе яна іх, ну корміць. Але ж не родная маці. Смачнейшага чарвяка яна аддасць не тваім дзецям, а сваім...

— Не твая справа, — не жадала слухаць яліну зязюля, — усюды ты свой нос уткнеш...

— Ага, не хочацца слухаць праўду. Горкая яна... — казала ўслед зязюлі яліна.

**Балабóлка** — балбатуха.
**Заканапáчваць** — шчыльна затыкаць.

1. Дзе жыла вавёрка? Якой яна была гаспадыняй?
2. За што яе паважала старая яліна?
3. Што значыць «гойсала рыжым полымем», «мільгала рыжай маланкай»? Чаму так сказана пра вавёрку?
4. Каму ў прыклад ставіла старая яліна вавёрку?
5. Як яна дакарала зязюлю-мачыху? Каго шкадавала? Прачытайце іх размову.
6. Ці можна назваць зязюлю клапатлівай маці і добрай гаспадыняй?

## 3

Яліна змаўкала, збіраючыся крыху падрамаць. Але тут налятаў халодны сівер*. Ён трос яе, выкручваў скурчанае ад старасці і холаду голле. І ўзнімаў такі свіст і трэск, што спуджаная вавёрка хавалася ў сваё дупло.

— Шалёны, — адмахвалася старая яліна, — адкуль цябе прыгнала?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



— Ой, цётухна, адкуль прыгнала, не пытай. Скажы лепей, куды гоніць! — рагатаў вецер.

— Ведаю ўжо... Ляці сваёй дарогай.

Сівер узмахваў доўгім халатам, перакручваўся некалькі разоў у паветры і імкліва знікаў — гэтак, як і прыляцеў.

— Ох, скруціць ён галаву гэтай каліне! Вунь як яна хіліцца, ледзь не да самай зямлі яму кланяецца...

Старой яліне з узгорка было добра відаць усё, што рабілася на ўзлессі. І сапраўды, маладзенькая каліна яшчэ больш чырванела і харашэла, сустракаючы ветра.

— Ляцім са мной па свеце! — шаптаў ёй вецер-сівер. — Што ты тут бачыш, стоячы вунь ужо колькі год усё на адным месцы, усё пры гэтай дарозе?

— Людзі тут ходзяць і ездзяць...

— «Людзі ходзяць і ездзяць...» Ты паслухай, што кажа пра гэтых людзей старая яліна. Яны загубяць цябе, паламаюць твае рукі... А ягады твае — навошта яны ім?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Не кажы так. Мае ягады лечаць людзей... У цябе няма сэрца, і ты не ведаеш, як гэта цяжка, калі яно баліць. А людзі ўмеюць варыць з маіх ягад лекі і лечацца імі...

— «Людзі», «лекі»... Навошта яны табе здаліся! Мы з табой паляцім за мора, паляцім да такіх высачэзных гор, якіх ты і не сніла ніколі. І ты тады забудзеш пра гэты свой лес, пра гэтую дарогу, на якую ты дзень і ноч глядзіш.

— І ніколі больш не вярнуся сюды? Не, я не змагу... Я высахну і памру без свайго лесу, — плакала каліна.

— Ну дык і заставайся тут! А мне няма часу з табой валаводзіцца*. Не спадзявайся, каб я яшчэ лятаў да цябе...

Вецер-сівер узмахваў сваім халатам, пранізваў каліну смяротным холадам. Каліна калацілася, дрыжала, і на зямлю чырвонымі ягадамі сыпаліся яе горкія слёзы.

— Пачакай, не пакідай мяне адну!.. — стагнала наўздагон ветру каліна.

Але вецер ужо не чуў яе.

**Сі́вер** — пранізлівы халодны вецер.
**Валаво́дзіцца** — затрымлівацца, траціць час.

1. Як з'яўляўся ў лесе вецер? Чаму сварылася на яго старая яліна?
2. Як заляцаўся вецер да прыгажуні-каліны? Куды яе клікаў? Знайдзіце ў тэксце іх дыялог.
3. Чаму каліна не згадзілася на ўгаворы ветру? Для каго зберагала свае лекавыя ягады?
4. Які характар у яліны, каліны і ветру? Выберыце адпаведныя словы: *разважлів..., клапатлів..., мудр..., легкадумн..., бесклапотн..., добр..., чэрств..., чул...* .
5. Перакажыце змест часткі сваімі словамі.
6. Прачытайце тэкст па ролях.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 4

А калі настала зіма і ў лесе не было ўжо ніводнага зялёнага лісціка, ніводнай кветачкі, ішла гэтай самай дарогай, каля якой расла каліна, жанчына з маленькім хлопчыкам.

— Мамачка! — закрычаў хлопчык і запляскаў у далоні. — Зірні, зірні — ягады!



Яны спыніліся.

— Гэта каліна, сынок. Бачыш, якая яна: зіма, мароз, а яна не баіцца...

— Можна сарваць?

— Толькі асцярожна. Не паламай галінак.

Хлопчык ірваў чырвоныя калінавыя ягады, клаў іх у сваю рукавічку і пяшчотна прыгаворваў:





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Не бойся, калінка-малінка. Мае ручкі не злыя. Галінак тваіх не паломяць, вершалінкі не скрышаць. Толькі ягадкі сарвуць — маме на лякарства...

Так ён прыгаворваў і ўсё клаў у сваю рукавічку чырвоныя ягады. І каліна радавалася: ашукваў* яе вецер, і яліна-казачніца памылялася. Добрыя ў чалавека рукі, разумныя...

Вось і канец гэтай лясной казцы. Той маленькі хлопчык захацеў назваць яе казкай пра калінавую рукавічку. Ну што ж, няхай сабе рукавічка, няхай сабе калінавая...

*(Паводле Алены Васілевіч)*

**Ашу́кваў** — падманваў.

1. Як выглядала каліна зімой? Чаму яе заўважыў хлопчык?
2. Як ірваў ягады хлопчык? Што прыгаворваў? Прачытайце.
3. Чаму радавалася каліна? Якімі былі чалавечыя рукі? Што значыць «разумныя»?
4. Ці спраўдзіліся словы старой яліны і ветру?
5. Прачытайце часткі па ролях.
6. Дайце назву кожнай частцы. Складзіце план разам з настаўнікам. Перакажыце казку сваімі словамі ў школе і дома.

## Мяцеліца

— Ну і мяцеліца круціць, свету белага не відаць! — усклікнуў бацька, абтрасаючы снег.

— Татка! А як мяцеліца круціць? — ускочыў з пасцелі Лёнька. — Якая яна?

— Добра, раскажу, — абяцае бацька.

...Далёка-далёка, на поўначы, жыве вецер. Вялікі працаўнік і весялун. Многа ў яго спраў. Трэба і хмары прыгнаць, і мора ўсхваляваць, і птушанят пакалыхаць на галінцы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Стоміцца вецер за дзень. І хочацца яму адпачыць, пацешыцца. Тады ідзе ён на стайню*. Выводзіць і запрагае ў лёгкія санкі трыста белых летуноў-коней. І гайда! Па палях, па лугах, па вуліцах!



Людзі дзівяцца: «Вось мяцеліца разгулялася!» І не бачаць, дзівакі, як ляцяць белыя коні. Як сцелюцца доўгія грывы і хвасты. Не чуюць, як звіняць падковы. Людзі шмат чаго не чуюць і не бачаць...

А вецер! Прыгажун вецер! Левай рукой кіруе, а правай шапку прытрымлівае. Імкліва* лятуць коні. Але ветру яшчэ хутчэй хочацца. Як свісне ды гікне вецер:

— Гэй вы! Грывастыя!

Але паспрабуй злавіць вецер, злавіць мяцеліцу. Іх і след прастыў... Паімчаліся далей, далей...

— Далей... далей... — шэпча Лёнька і засынае. І ўсміхаецца скрозь сон. Пальчыкамі перабірае. Напэўна, вецер лейцы* яму перадаў. І Лёнька сам кіруе мяцеліцай.

*(Паводле Міколы Янчанкі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Ста́йня** — *тут*: канюшня.
**Імклі́ва** — *тут*: вельмі хутка.
**Ле́йцы** — збруя для кіравання коньмі.

1. Прачытайце. Назавіце галоўных герояў твора.
2. Якога ўзросту быў Лёнька? Ці ўсе словы разумееў?
3. Якую казку прыдумаў бацька?
4. Якія справы былі ў ветра? Прачытайце.
5. У вобразе каго паўстае вецер? Знайдзіце апісанне.
6. Як цешыўся вецер? Колькі запрагаў коней?
7. Што назіралі ў гэты час людзі?
8. Ці спадабалася Лёньку казка? А вам?
9. Перакажыце казку так, быццам перад вамі малы хлопчык. Пакажыце яму, як вые вецер, як паганяе коней лейцамі.
10. Чаму вецер названы *вялікі працаўнік* і *весялун*? Падзяліцеся думкамі.

## Знаходка

Стаяў прыгожы зімовы дзень. Ярка свяціла сонца.

Я і Лёня не ведалі, як лепш правесці выхадны дзень.

Нарэшце я прапанаваў:

— Давай паедзем на лыжах у лес.

Мы апрануліся па-спартыўнаму, сталі на лыжы і паехалі.

Як толькі выехалі за сяло, у твар падзьмуў калючы вецер. Лёня моршчыўся, заплюшчваў вочы. Нарэшце ўехалі ў лес.

Лёня звярнуў убок, спыніўся і паклікаў мяне. На круглай паляне стаяла невялікае каржакаватае* дрэва. Ствол яго ўверсе раздвойваўся, як рагатка. Крона круглая, шырокая, але рэдкая. На тоненькіх, быццам драцяных, галінках тырчалі вострыя іголкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Першы раз бачу ў лесе яблыню, — сказаў Лёня.

— А што дзіўнага? Гэта ж дзічка, — адказаў я. І тут у мяне мільганула думка: «На ёй, напэўна, былі яблыкі. А калі так, то цяпер яны на зямлі, пад снегам».

Я зняў лыжы і пачаў разграбаць снег. Ён быў мяккі і сыпучы, як мука.

— Што ты робіш? — здзівіўся Лёня. — На ёй і не магло быць яблыкаў, бо яна лясная і ніхто яе не даглядаў. А калі і вырасла колькі, дык увосень апалі, і іх птушкі здзяўблі. І наогул, ты, мабыць, ніколі не каштаваў дзікіх яблыкаў. Бо не гроб бы снег, як барсук. Яны ж кіслейшыя за воцат*...

І вось на дне ямы паказалася леташняя трава, зашамацела сухое лісце. Раптам у руку мне трапіў невялікі цвёрды шарык. Яблык!.. Адзін бок яго быў бледна-жоўты, нібы залаты, другі — чырвоны.

Я трымаў яблык за тоненькі хвосцік. Пакручваў то жоўтым, то чырвоным бокам і не мог нацешыцца. Потым паднёс да рота і адкусіў. Яблык быў халодны, салодкі і духмяны.

Лёня глядзеў на мяне, нібы не верачы сваім вачам.

— На, пакаштуй, — сказаў я.

Ён недаверліва ўзяў яблык. Адкусіў, пажаваў, схіліўшы галаву, быццам прыслухоўваючыся...

— Ну, як на смак? — спытаў я.

— Як мёд! Сам у роце растае, — засвяціўся ўсмешкай Лёня. — Ніколі не ведаў, што лясныя яблыкі могуць быць такія смачныя!

— Нічога дзіўнага. Яны паспелі і доўга ляжалі. Бач, як яблыня ўкрыла іх сваім лісцем.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Яблыкаў было столькі, што мы набралі поўныя кішэні. Дадому мы прыехалі пад самы вечар, задаволеныя і прагулкай на лыжах, і нечаканай знаходкай.

*(Паводле Міколы Корзуна)*

**Каржакава́тае** — *тут*: моцнае, невысокае.
**Во́цат** — *рус.*: уксус.

1. Прачытайце. Назавіце галоўных герояў твора.
2. Як хлопчыкі праводзілі выхадны дзень? Куды адправіліся?
3. Якое дрэва ўразіла хлопчыкаў? Раскажыце аб ім у такой паслядоўнасці: *дрэва ..., ствол ..., крона ..., галінкі ..., іголкі ...* .
4. Дзе дзеці знайшлі яблык? Які ён быў на выгляд? А на смак?
5. З якім настроем вярталіся хлопчыкі з лесу? Што назвалі знаходкай?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**6.** З якой небяспекай можна сустрэцца зімой у лесе? Абмяркуйце з дарослымі.

**7.** Што новага для сябе вы даведаліся з гэтага твора?

## Зайцаў кажушок

*Казка*

У лес прыйшла зіма, а за ёю — маразы і сцюжа. Усе зайцы адзелі белыя кажушкі. Цёпла.

Толькі адзін Малады Заяц яшчэ ў шэрым скача. Скача і дрыжыць ад холаду. Заўважыў гэта Стары Заяц і прынёс кажушок.

— На, пераапраніся, цяплей будзе.

Узрадаваўся Малады Заяц. Надзеў новы кажушок, а стары пад куст закінуў.

— Павесь на відным месцы, каб потым не прыйшлося шукаць, — напомніў Стары Заяц. Але Малады махнуў толькі лапкай:

— Калі яшчэ тая вясна!

Ішлі дні за днямі, і не агледзеўся Малады Заяц, калі вясна ў лес прыйшла. Усе зайцы знайшлі сваё адзенне і адразу парыжэлі, скачуць вясёлыя. Адзін толькі Малады Заяц ніяк не можа ўспомніць, пад які куст свой кажушок кінуў. Горача яму ў лесе.

Забіўся Малады Заяц пад дрэва, хацеў адпачыць у цяньку. А паджары* галодны пасля зімы Воўк тут як тут. Стаіць, зубамі ляскае.

Кінуўся Заяц наўцёкі, а Воўк кажа:

— Не ўцячэш. Белага ўсюды відаць.

Бег-бег Заяц, пакуль не стаміўся.

Прысеў перавесці дух*, паглядзеў вакол, і здалася яму знаёмай гэтая мясціна.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

«Ці не тут я свой кажушок пакінуў? — падумаў ён. — Трэба пашукаць, пакуль Воўк не дагнаў».

Зазірнуў Малады Заяц пад ядлоўцавы куст, а там — шэры кажушок. Хуценька схапіў яго, апрануўся і прытаіўся.

А тут і Воўк на паляну выскачыў.

— Дзе ж гэта Заяц падзеўся? Толькі што тут быў... — і кінуўся шукаць.

А да Маладога Зайца падышоў Стары:

— Хай табе гэта будзе навукай на ўсё жыццё. **Запамінай, дзе ўвосень кладзеш свой кажушок, тады вясной лёгка знойдзеш.**

А той і сам ужо зразумеў гэта.

*(Паводле Расціслава Бензерука)*

**Паджáры** — худы, схуднелы.
**Перавéсці дух** — *тут*: перадыхнуць, адпачыць.

1. Што зрабілі зайцы з надыходам зімы?
2. Як паводзіў сябе Малады Заяц? Ці слухаў ён старэйшых?
3. Што з гэтага атрымалася?
4. Чаму Воўк так лёгка яго знайшоў?
5. Што выратавала Зайца? Якую навуку атрымаў ён ад Старога Зайца?
6. Чаму вучыць гэтая казка? Растлумачце сэнс выдзеленых слоў.
7. Што ў гэтай гісторыі казачнае, а што сапраўднае?
8. Перакажыце казку сваімі словамі. Прыдумайце працяг.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Як называецца раздзел, які вы прачыталі? Якія вершаваныя творы ў ім змешчаны? Пры неабходнасці звяртайцеся да «Зместу» ў канцы дапаможніка.
2. Якой тэмай аб’яднаны творы «Зімовы вечар» Цішкі Гартнага, «Снег» Міколы Хведаровіча і «Надыход зімы» Якуба Коласа?
3. Што вы даведаліся аб жыцці Максіма Багдановіча? Які яго верш чыталі? Як ушаноўваюць памяць паэта ў Беларусі?
4. Які аўтар называе зіму матуляй? Знайдзіце ў раздзеле яго твор. Якія падарункі прынесла зіма-матуля?
5. Якой тэмай аб’яднаны творы «Сініца-жартаўніца» Змітра Бяспалага і «Зайцу не спіцца» Яўгена Крамко? Пра якіх жыхароў лесу ў іх расказваецца? Коратка перакажыце, пра што гэтыя творы.
6. Пра каго расказваецца ў вершы «Дабрадзей» Авяр’яна Дзеружынскага? Як утварылася слова «дабрадзей» і што яно азначае? Якіх людзей называюць дабрадзеямі?
7. Раскажыце аб добрай справе хлопчыка з твора «Маленькі лесавічок» Рыгора Ігнаценкі.
8. Якая тэма верша «Пустыя кармушкі» Міколы Маляўкі? Аб чым ён напамінае дзецям? Ці ляцяць птушкі да вашых кармушак?
9. Якія зімовыя святы вы ведаеце? Назавіце творы, прысвечаныя гэтым святам. Успомніце традыцыі зімовых свят.
10. Якія творы з гэтага раздзела вам спадабаліся, запомніліся? Раскажыце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




## Шануйце ўсё жывое

Як толькі я сябе помню, бацькі мае і старэйшыя людзі — суседзі — прывучалі нас, малых, шанаваць усё жывое, што вакол нас.

— Не тапчы травіцы, хадзі сцежачкай. Трава вырасце. Яе скосяць — будзе сена кароўкам...

— Не чапай, не ламай малога дубочка або сасонкі. З іх вырастаюць вялікія дрэвы.

— Асцярожна рві яблыкі — не паламай галінкі. Дрэва будзе хварэць, на паламаным суку не будзе яблыкаў...

— Напрасткі праз жыта не хадзі. Ты патопчаш нагамі хлеб...


*Дзівасіл*


*Васількі*

Штодня чуў я ад людзей нешта новае і цікавае.

— Гэтая зёлка* называецца дзівасіл. Калі выкапаюць і пасушаць карэнне дзівасілу, яно будзе найлепшае лякарства ад болю ў грудзях...

— А гэтая красачка* — валошка, або васілёк, ад хваробы вачэй.

З маленства расло ў мяне вялікае замілаванне да прыроды. Нават крапіву-жыгучку



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Крапіва

я не збіваў ні кіем, ні пугаю. Бо і яна расце на карысць чалавеку. Крапіва лечыць ад многіх хвароб. А вясною з яе гатуюць салаты, халаднікі — самыя багатыя вітамінамі стравы.

*(Паводле Уладзіміра Дубоўкі)*

**Зёлка** — лекавая трава.
**Кра́сачка** — кветка.

1. Прачытайце. Аб чым успамінае аўтар?
2. Чаму раней вучылі малых? Што тлумачылі дзецям дарослыя? Дапоўніце: *не тапчы, бо ...; не чапай, бо ...; не рві, бо ...; не хадзі, бо ... .*
3. А ці трэба сёння вучыць дзяцей быць уважлівымі да кожнай траўкі?
4. Якія расліны называюць лекавымі? Пра якія з іх вы даведаліся з тэксту?
5. Успомніце з урокаў «Чалавек і свет», што такое жывая і нежывая прырода. Чаму трэба шанаваць прыроду?
6. Абмяркуйце з дарослымі, якія дзеці лепш ведаюць прыроду — гарадскія ці вясковыя.

## Малайчына

Тату слухае і маму.
Ходзіць кожны дзень у краму,
памагае засцілаць,
падмятаць і гатаваць.

Прапяе «ката» малому.
Пагуляе каля дому.
Не нарадуюцца ўсе,
што такі ўдалец расце.

Хлопчык ты
або дзяўчынка —
малайчына!
Малайчынка!

*(Уладзімір Паўлаў)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Хто галоўны герой верша?
2. Калі хваляць словам *малайчына*? За якія справы? Адкажыце словамі верша.
3. Растлумачце выраз «Прапяе „ката“ малому», замяніце блізкім па сэнсе выразам.
4. Знайдзіце і прачытайце ў вершы словы-дзеянні (дзеясловы). Ці шмат паспявае галоўны герой? Што з гэтых спраў вы ўмееце? А што робіце?
5. Дзе часцей вас называюць *малайчына* — дома ці ў школе? За што?
6. Вывучыце верш на памяць.

## Як Сяргейка навучыўся шкадаваць

Малы Сяргейка гуляў каля сажалкі*. Ён убачыў дзяўчынку, што сядзела на беразе.

Калі Сяргейка падышоў да яе, яна сказала:

— Не замінай мне слухаць, як пяюць хвалі.

Сяргейка здзівіўся. Ён шпурнуў у сажалку каменьчык. Дзяўчынка спыталася:





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Што ты кінуў у ваду?

Сяргейка яшчэ больш здзівіўся:

— Няўжо ты не бачыш? Я кінуў каменьчык.

Дзяўчынка сказала:

— Я нічога не бачу, бо я сляпая.

Сяргейка шырока раскрыў вочы і доўга глядзеў на дзяўчынку.

Здзіўлены ён і дадому прыйшоў. Ён не мог зразумець: як гэта, калі чалавек зусім нічога-нічога не бачыць?

Настала ноч. Сяргейка лёг спаць. Так ён і заснуў у здзіўленні.

Сярод ночы Сяргейка прахапіўся*. Яго разбудзіў шум за акном. Шумеў вецер, у шыбы* стукаў дождж. А ў хаце было цёмна. Сяргейку стала страшна. Яму ўспомнілася сляпая дзяўчынка. Сэрца сціснулася ад жалю. Як жа яна жыве ў такой цемры?

Сяргейку хацелася, каб хутчэй пачаўся дзень. Ён пойдзе да сляпой дзяўчынкі. Цяпер ён будзе з ёю сябраваць.

*(Паводле Васіля Сухамлінскага)*

**Са́жалка** — *тут*: вадаём, зроблены людзьмі.
**Прахапі́цца** — нечакана, хутка прачнуцца.
**Шы́бы** — *тут*: вокны.

---

?!

1. Прачытайце. Хто галоўны герой твора?
2. З кім сустрэўся Сяргейка на беразе сажалкі? Чаму дзяўчынка слухала шум ракі?
3. Аб чым гаварылі дзеці? Прачытайце іх дыялог.
4. Што ўразіла хлопчыка?
5. Чаго ён спалохаўся ноччу? Як цемра дапамагла яму зразумець сляпую дзяўчынку?
6. Што вырашыў зрабіць хлопчык? Ці добрае ў яго сэрца?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**7.** Паразважайце, ці сапраўдным сябрам будзе Сяргейка. Чаму?

**8.** Адгарніце сшытак і заплюшчыце вочы. Паспрабуйце знайсці на парце ручку і напісаць сваё імя. Ці лёгка гэта атрымалася?

**Беражыце зрок. Калі займаецеся за камп'ютарам ці гуляеце ў гульні на тэлефоне, рабіце перапынкі. Сачыце, каб не стамлялася шыя: праз яе да вачэй ідуць карысныя рэчывы. Ешце болей садавіны і гародніны.**

**Выконвайце фізхвілінкі для вачэй.**

## Гора

Мяне мама з татам любяць,
шчыра дбаюць* пра мяне:
што ні папрашу —
усё купяць,
дорага яно ці не.

Нават просьбаў
не чакаюць, —
толькі б я не ведаў бед.
Я такія джынсы маю!..
Ах, які ў мяне мапед*!..

Тата з мамаю гавораць:
мушу* я шчаслівым быць.
А ў мяне такое гора:
дзе ж мне сябра раздабыць?

*(Ніна Мацяш)*

**Дбаць** — клапаціцца.
**Мапе́д** — маленькі матацыкл.
**Му́шу** — павінен.

**1.** Чым хваліўся герой верша?

**2.** Як дбалі пра яго бацькі? Што куплялі? Перакажыце сваімі словамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Ці задаволены хлопчык? Чаго яму не хапае?
**4.** Прачытайце верш выразна. З якім настроем трэба яго чытаць?
**5.** Паразважайце, чаму хлопчык не мае сябра. Ці могуць рэчы зрабіць чалавека шчаслівым?
**6.** Раскажыце, ці ёсць у вас сябры. З кім вы сябруеце?

## Бяроза і сасна



Бяроза кпіла*,
пасміхалася з сасны:
— Я прыгажэй цябе,
у час ранняе вясны
ўсе любуюцца
адною толькі мной.

— Чакай да восені, —
сасна сказала ёй.
Падзьмуў асенні вецер,
абарваў лісты,
не стала ў той бярозы
пекнаты*.

Стаіць, самотна* голле
звесіла яна.
— Хто ж прыгажэй цяпер? —
спыталася сасна.

*(Авяр'ян Дзержынскі)*

**Кпіць** — смяяцца, здзекавацца.
**Пекнатá** — прыгажосць, краса.
**Самóтна** — сумна.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Чым ганарылася бяроза?
2. Як пасміхалася яна з сасны? Што пачула ў адказ? Раскажыце.
3. Што сталася з бярозай восенню? Разгледзьце фотаздымак.
4. Чым гэты верш нагадвае казку?
5. Якія недахопы людзей паказаны ў гэтым творы?
6. Прачытайце выразна. Перадайце інтанацыі бярозы і сасны. Ці аднолькавыя яны?
7. Паразважайце, ці добрая рыса, калі нехта кпіць і смяецца з іншых. Ці знойдзе такі чалавек сяброў?
8. Чые паводзіны вам больш спадабаліся? Чаму?

**Прыказкі**

- Пахвальбы поўны мяшок, а ў мяшку пуста.
- Пусты збан гучна звініць.
- Чым хваліўся, на тым і праваліўся.

## Добрая фея

### 1

Свяціла сонейка, зелянела трава, клёнікі толькі што павыкідвалі* свае клейкія лісточкі. Весела забаўляліся ў двары хлопчыкі. Яны бегалі навыперадкі, гулялі ў хованкі, гушкаліся на арэлях. З імі бегаў, залівіста гаўкаў руды сабачка. Ён не баяўся, што яго пакрыўдзяць або прагоняць, бо ведаў — усе дзеці яго любілі.

А яшчэ адзін хлопчык сядзеў у крэсле каля пад'езда і сумна пазіраў на дзяцей. Ён зайздросціў не толькі гэтым хлопчыкам, але і сабачку, які так спрытна скакаў на сваіх лапках.

Гэтаму хлопчыку таксама хацелася пабегаць, пагуляць, але ён не мог бегаць, ён не мог нават хадзіць, бо ў яго былі хворыя ногі. Хлопчык сядзеў у крэсле, пазіраў на дзяцей, слухаў іх звонкія галасы. Але дзеці не падыходзілі да яго,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



не размаўлялі з ім. І вочы ў хлопчыка былі заўсёды сумныя, а твар не ведаў усмешкі.

**Павыкі́дваць** — *тут*: выпусціць.

1. Чым займаліся хлопчыкі ў двары? Перакажыце.
2. Як весяліўся сабачка? Чаму не баяўся дзяцей?
3. Які настрой быў у хлопчыка ў крэсле? Што значыць «твар не ведаў усмешкі»?
4. Чаму ён не гуляў з дзецьмі?

## 2

Аднойчы ў двары з'явілася дзяўчынка. У яе былі светлыя кучаравыя валасы, вялікія сінія вочы і тонкая шыйка*. Хлопчыкі заўважылі яе, і яна ім спадабалася.

— Ідзі да нас гуляць! — паклікаў адзін.

Але дзяўчынка не пайшла да іх. Яна спынілася каля хлопчыка, які сядзеў у крэсле.

— Як цябе зваць? — спытала яна.

— Віця, — адказаў хлопчык.

— А мяне Іра. Скажы, чаму ты не гуляеш з дзецьмі?

— У мяне ногі хворыя, я не ўмею хадзіць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— А з кім ты сябруеш? — спытала дзяўчынка.

— Я ні з кім не сябрую, — апусціў вочы хлопчык. — Са мною ніхто не хоча сябраваць.

— Я буду з табой сябраваць.

— Праўда? — узрадаваўся Віця. Твар яго асвяціла ўсмешка. Дзяўчынка таксама ўсміхнулася свайму новаму сябру і раптам сказала:

— Віця, твае ногі не такія ўжо хворыя. І калі ты вельмі захочаш, то зможаш хадзіць.

— Не, — уздыхнуў Віця. — Я спрабаваў... Не ўмею...

— А я табе дапамагу, — сказала Іра. — Дай руку!

Віця падаў дзяўчынцы руку, і здарыўся цуд. Хлопчык стаў на ногі!

Ён стаяў яшчэ не вельмі цвёрда, але стаяў.

— Вось бачыш, — сказала Іра, — ты ўжо ўмееш стаяць. А цяпер ідзі за мною... Ідзі!..



Хлопчык зрабіў адзін крок, другі. Дзеці, якія гулялі ў двары, сабраліся каля Віці. Нават руды сабачка прыбег з імі. Ён таксама з цікавасцю глядзеў на Віцю.

— Ты чараўніца? — пыталіся ў Іры хлопчыкі. — Ты добрая фея?

— Не, — адказала Іра. — Я звычайная дзяўчынка...

Хлопчыкі не ведалі, што добрае слова дапамагае часам, як чароўныя лекі.

*(Паводле Лідзіі Арабей)*

**Шы́йка** — шыя.

1. Хто з’явіўся ў двары? Як звалі дзяўчынку?
2. Да каго падышла Іра? Аб чым гаварылі дзеці? Прачытайце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Як дзяўчынка дапамагла Віцю?
4. Чаго не ведалі хлопчыкі? Знайдзіце адказ у апошнім сказе.
5. Ці добра рабілі хлопчыкі? А што зрабілі б вы? Ці былі ў вас падобныя выпадкі?

Людзі, якія не могуць хадзіць, таксама жывуць цікавым жыццём. Яны выдатна спяваюць, іграюць на музычных інструментах, маюць поспехі ў навуках. Многія займаюцца спортам. Для такіх людзей ёсць спаборніцтвы па спартыўных танцах, баскетболе, тэнісе, грэблі, стральбе з лука і іншых відах спорту. Беларускія спартсмены-калясачнікі ўдзельнічаюць і перамагаюць у чэмпіянатах свету і Алімпійскіх гульнях.

**Бабуля захварэла**

Вясну забаўляюць птушыныя трэлі,
у квецені — яблыні, вішні і слівы...
І толькі бабуля мая захварэла,
ляжыць на канапе маўклівa, тужлівa*.
На лоб на яе я паклала далоні:
«Бабуля, бабуля, ты ўся аж палаеш*».
Яна ж: «Супакойся, унучка Алёна,
я проста стамілася, бо я — старая».
«Няпраўда, — кажу я. — Хіба ты старая?»
Заплакала б я, ды бабулю ўзрушу*.
І я ёй вясёлыя песні спяваю —
пра поле, пра рэчку, пра сад наш, пра птушак.
Бабуля ўсміхнулася — ёй стала лепей.
Няўжо мае песні — найлепшыя лекі?

*(Іван Мурaвейка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Тужлі́ва** — сумна, журботна.
**Пала́ць** — *тут*: гарэць, адчуваць гарачыню пры высокай тэмпературы.
**Узру́шыць** — расхваляваць.

1. Прачытайце. Якая назва верша?
2. Якой парой захварэла бабуля? Прачытайце.
3. Што значыць «ты ўся аж палаеш»? Калі такое бывае?
4. Як лячыла бабулю дзяўчынка? Чаму яна спявала вясёлыя песні? Ці было ўнучцы весела?
5. Як стала адчуваць сябе бабуля? Якія «лекі» дапамаглі?
6. Прачытайце выразна. Перадайце інтанацыі хворай бабулі і клапатлівай унучкі. Уявіце, што гэта вы лечыце сваю бабулю.
7. Чаму вучыць гэты верш? Які прыклад вам падае дзяўчынка?
8. Паразважайце, якім чалавекам вырасце Алёна.

## Прытворка

Захварэў раптоўна,
захварэў сур'ёзна:
на ўсю хату стогне,
енчыць, плача слёзна.

На двары ўжо раніца
сонцам разгараецца.
Мама з бабкай раяцца,
як з хваробай справіцца.

— Трэба даць уколы
беднаму Міколу.
А Мікола: «Што вы!
Я даўно здаровы».

З ложка ўсхапіўся,
за партфель схапіўся:
— Не жадаю ўколаў,
лепш пайду я ў школу.

*(Іван Муравейка)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Хто такі прытворка? Растлумачце сэнс слова.
2. Што раптоўна сталася з Міколам? Як ён паказваў сваю хваробу? Прачытайце.
3. Гэта сур'ёзны верш ці жартоўны? Ці сапраўды захварэў хлопчык?
4. Якія лекі параілі яму мама з бабкай?
5. Што зрабіў ён замест лекаў?
6. Паразважайце, ці здагадаліся мама і бабка пра яго «хваробу».
7. Ці здаралася з вамі нешта падобнае? Прытворка — гэта добрая ці дрэнная якасць чалавека? Падзяліцеся думкамі.

## Іліпка

*Байка*

Антось, Міхась, Кастусь, Змітрок,
Святлана, Люда і Пятрок
надумалі рабіць каток.
Дасталі мётлы і лапаты,
спачатку правялі дакладна плаціроўку*,
затым расчысцілі і падмялі пляцоўку,
а вечарам, як зоркі заіскрыліся над хатай,
усёю грамадой
каток старанна палілі вадой.
Адзін Піліпка ім нічым не дапамог,
хоць сілы меў за трох...
Назаўтра ж першым ён з'явіўся,
трымаючы пад пахаю* канькі:
— Ну і каточак! Любата, браткі!
Але дарэмна ён лісой круціўся
і язычком матляў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



— Як працаваць — дык «хворы»,
а да катання — скоры?
Прэч, абібок*! Каб і настрою не псаваў!
І ўміг Піліпку тут адшылі*.
І правільна зрабілі:
**катацца любіш — дык любі і саначкі вазіць,**
**не думай ты сяброў перахітрыць.**

*(Эдуард Валасевіч)*

**Правялі́ планіро́ўку** — *тут*: выбралі і ўзгаднілі месца.
**Пад па́хаю** — *тут*: прыхінаючы рукою (*рус.*: под мышкой).
**Абібо́к** — гультай, лайдак.
**Адшы́лі** — адправілі прэч.

**1.** Што надумалі рабіць дзеці? Як падрыхтаваліся?
**2.** Раскажыце па парадку, як яны залівалі каток.
**3.** Растлумачце выраз «усёю грамадой».



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Ці дапамагаў дзецям Піліпка? Куды ён прыбег з самага ранку?
5. Як абышліся з Піліпкам дзеці? Чаму? Ці справядліва яны прагналі Піліпку?
6. Прачытайце апошнія выдзеленыя радкі. Гэта галоўная думка байкі, або, як кажуць, мараль байкі.
7. Чаму вучыць гэтая байка? Які вывад для сябе вы зрабілі? Каго пахваліце, Піліпку ці дзяцей?

## Загадкі з адгадкамі

Крыўляецца хлопчык,
як малпа-макака*...
— Адгадка знайшлася:
той хлопчык — **крыўляка.**

— У ход пускае кулакі
ў часе спрэчкі ўсякай...
Што за «герой» такі?
— Ён не герой, а **забіяка.**

— На просьбу памагчы
адкажа лёгка: «Ай...»
І хто ж гэта такі?
— Вядома, што — **гультай.**

— Не ведае нічога,
да ведаў не імкнецца.
Ці чулі пра такога?
— Ён **не́вукам** завецца.

*(Васіль Жуковіч)*

**Мака́ка** — малпачка, мартышка.

1. Прачытайце. Якія загадкі прапануе аўтар? Пра каго?
2. Прачытайце выдзеленыя словы. Гэта добрыя ці дрэнныя якасці людзей?
3. Супраць якіх недахопаў выступае аўтар?
4. Паразважайце, гэта загадкі пра аднаго чалавека або пра некалькіх.
5. Ці хочацца вам быць падобнымі да іх?
6. Абмяркуйце з дарослымі, ці паважаюць людзей з такімі якасцямі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Гасцінцы

### 1

Андрэйка — цікаўны і рухавы хлопчык. У вёсцы яго ведаюць усе. І, трэба сказаць, паважаюць і любяць Андрэйку. Кемлівы і знаходлівы, ён умее знайсці такі занятак, ад якога і самому навука, і добрая дапамога другому.

Вось ён заглянуў на гаспадарчы двор. Тут кіпіць руплівая работа. Ад'язджаюць у поле падводы*, запрагаюць дзядзькі коней. Андрэйка падыходзіць да каго-небудзь, просіць:

— Дзядзечка, дазвольце мне запрэгчы каня.

— Ну што ж, запрагай, калі табе так хочацца, — кажа дзядзька.

І хлопчык хутка і спрытна запрагае каня.

Прыйдзе Андрэйка на вясковую стайню. Конюх, дзядзька Арцём, чысціць коней. Коні ад задавальнення выцягваюць шыі, стрыгуць вушамі, б'юць капытамі зямлю.

Андрэйка назірае, назірае, а потым і кажа:

— Дзядзька, давайце дапамагу.

Возьме Андрэйка скрэбла, шчотку і — за работу. І запэцканы, з пераблытанай грывай конь робіцца чыстым і прыгожым, як лялька. А Андрэйка па-гаспадарску завядзе каня ў стайню і выведзе адтуль другога.

Загляне Андрэйка ў цялятнік. Цётка Ганна па чарзе поіць пойлам гадаванцаў*. Яны рвуцца са сваіх загародак, хутчэй хочуць напіцца. Возьме Андрэйка вядро — і да цялят. Калі жывёла напоена, Андрэйка выганяе статак на выган, у спецыяльную загарадзь. Цётка Ганна тым часам прыбярэ цялятнік.

Зойдзе Андрэйка ў калгасны сад. Возьме кошык, пойдзе пад дрэвы і пачне збіраць ападкі. Вартаўнік Рыгор, кульгавы дзядок, пачастуе яго за гэта смачнымі яблыкамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Падво́ды** — вазы.
**Гадава́нцаў** — *тут*: цялят.

1. Назавіце галоўнага героя твора.
2. Які быў Андрэйка? Знайдзіце адказ у першых двух абзацах.
3. Як ён дапамагаў дарослым? Дапоўніце: *запрагаў* ..., *чысціў* ..., *паіў* ..., *выганяў* ... .
4. Які прыклад падае хлопчык? Як ён ставіцца да працы?
5. Як вы думаеце, ці часта Андрэйка сумаваў без справы?
6. Прачытайце выразна. Перакажыце змест блізка да тэксту.

## 2

Аднойчы Андрэйка захварэў. Маці схадзіла па доктара. Той паслухаў Андрэйку і сказаў, што ён прастудзіўся. Трэба папіць таблеткі і не выходзіць на вуліцу. Андрэйка злёг. Маці ідзе на работу, а ён ляжыць дома. Сумна робіцца аднаму, без справы. «Калі ж я падымуся?» — думае ён тужліва.

Раптам у сенцах пачуўся тупат.

«Гэта мама!» — радасна падумаў Андрэйка.

Адчыніліся дзверы, і ў хату зайшоў конюх, дзядзька Арцём. Чаго яму трэба? Ён жа ніколі да іх не заходзіў.



А госць сеў на табурэт і сказаў:

— Прынёс табе ягад. Папрасі маці, няхай зробіць з іх настой — дапаможа.

І перадаў слоік з ягадамі.

У сенцах зноў пачуўся тупат.

— Мама ідзе, — сказаў Андрэйка.

Але зайшла не мама, а цётка Ганна.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Прынесла свежага малачка, сырадою*, — яшчэ з парога сказала яна. — Як пап'еш, дык паправішся.

І паставіла збан на стол.

Ніхто ў гэты час не заўважыў, як у хату зайшоў вартаўнік саду дзед Рыгор. Кульгаючы, ён падышоў да ложка і паставіў кошык з чырванабокімі яблыкамі.

Калі госці пайшлі, Андрэйка адчуў сябе лепш.

Яму зрабілася нават весела. А калі з работы вярнулася маці, ён радасна сказаў:

— Мамачка, я ўжо зусім выздаравеў!

*(Паводле Яўхіма Івановіча)*

**Сырадóй** — свежае, толькі што надоенае малако.

1. Што здарылася з хлопчыкам? Якое лячэнне прапісаў доктар?
2. З чым завітаў да яго дзядзька Арцём?
3. Які гасцінец прынесла цётка Ганна?
4. Што атрымаў хлопчык ад дзеда Рыгора?
5. Як адчуваў сябе хлопчык? Што сказаў маме?
6. Паразважайце, чаму дарослыя людзі неслі гасцінцы хлопчыку.
7. Дайце назву кожнай частцы. Перакажыце змест бацькам блізка да тэксту па пытаннях.

## Вавёрачка і Зубраня

*Байка*

Аднойчы неяк у нядзелю
сям'я Зуброў
па тэлевізары глядзела
канцэрт звяроў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Там быў адзін выдатны нумар:
Вавёрачка чытала гумар*.
Яна так хораша чытала,
так натуральна жартавала,
аж пазайздросціла Зубрыха,
свайго малога папракнула ціха:
— А ты хіба, маё дзіцятка,
так, як Вавёрка, не змагло б?..
Ды Зубранятка
паморшчыла шырокі лоб,
пасля крутнула смешна мызай*:
— Хіба ж я ўлезу ў тэлевізар?

*(Васіль Жуковіч)*

**Гу́мар** — *тут*: вясёлы жарт.
**Мы́за** — *тут*: морда зубраняці.

1. Прачытайце байку. Хто яе галоўныя героі?
2. Якую перадачу глядзела сям’я Зуброў?
3. Што асабліва спадабалася маці? Які нумар?
4. Каму пазайздросціла Зубрыха? Чаго чакала яна ад свайго сына?
5. Ці зразумеў яе сынок? Як вы здагадаліся?
6. Прачытайце выразна. Перадайце інтанацыі Зубрыхі і Зубраняці.
7. Каго нагадваюць жывёлы ў байцы? Ці бываюць зайздрослівыя людзі?
8. Зайздрасць — гэта станоўчая ці адмоўная рыса характару?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Ілгун*

Ён не толькі балбатун,
ён найгоршы ў нас ілгун.
Хлус* папросту наш
Валерык,
і ніхто яму не верыць.
Заўсягды без перабою
ён займаецца хлуснёю.

Каб ён нават прысягаў,
кожны скажа: зноў салгаў.
Я ўсялякім ілгунам
вось такую раду дам:
лепей, дружа, памаўчы,
чымсьці ўсцяж*
хлусню таўчы*.

*(Віктар Швед)*

**Ілгу́н, хлус** — *тут*: той, хто маніць, кажа няпраўду.
**Усця́ж** — *тут*: паўсюль, заўсёды.
**Таўчы́ хлусню́** — падманваць, гаварыць лухту.

1. Прачытайце верш. Назавіце галоўнага героя.
2. Чым выдзяляўся Валерык?
3. Чаму яму ніхто не верыў?
4. Якую параду дае аўтар такім людзям? Прачытайце апошнія два радкі.
5. Абмяркуйце з дарослымі, ці паважаюць такіх хлусаў і ілгуноў.
6. Што будзе, калі хлус раптам скажа праўду? Ці павераць яму?

## Два яблыкі

Бацькі Веры і Марынкі збіраліся ў санаторый, а дачок адвялі да бабулі з дзядулем. Каб тыя прыглядзелі за дзяўчынкамі.

— Распранайцеся, дзяўчаткі, і будзьце як дома, — заўсміхалася бабуля. — Я пайду на кухню гатаваць абед, а ты, дзед, пагуляй з унучкамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзед Макар пасадзіў дзяўчынак на канапу і пачаў распытваць, як яны вучацца. Потым спытаў, чым займаліся дома ў вольны час, ці памагалі маме.

— Памагалі, — жвава адгукнулася Вера.

Марынка ж неахвотна дадала:

— Што мама гаварыла рабіць, тое мы і рабілі...

Слухаючы дзяўчынак, дзед Макар падумаў: «А ці заўсёды вы дапамагалі? І як?»

Нічога не кажучы, ён узяў венік і пачаў, не спяшаючыся, падмятаць падлогу.

— Дзедка, дай мне венік, я дамяту, — саскочыўшы з канапы, падбегла да яго Вера. — А ты адпачні. Табе ж цяжка...

Дзед Макар аддаў ёй венік, выпрастаўся і пачаў нібыта выціраць пот з твару. Выцірае і сочыць за Марынкай: што яна будзе рабіць? А тая пачырванела і адвярнулася ад сястрычкі, якая спрытна завіхалася з венікам. Дзед зразумеў, што робіцца ў душы дзяўчынкі, і перавёў позірк на Веру. Міжволі падумаў: «Сястрычкі, а характары, відаць, розныя. Гэтая хоць і малая, ды не раўня Марынцы». Вера тым часам падмяла хату і весела спытала:

— Дзедка, у што сабраць смецце? Я вынесу яго на двор.

— Вунь у кутку ля печы шуфлік*, — паказаў рукою дзед Макар.

Ён з любасцю паглядзеў на працавітую ўнучку. Потым прынёс з кладоўкі два яблыкі, большы і меншы, паклаў іх на стол і сказаў:

— Частуйцеся, яблыкі з нашага саду, смачныя...

Марынка першая падышла да стала, выбрала большы яблык і падала сястрычцы. А сама ўзяла меншы. Ела і ві-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

навата паглядвала на дзеда. Нібы прасіла прабачэння за тое, што не памагла яму месці падлогу.

А дзед Макар радаваўся: Марынка таксама будзе добрай памочніцай.

*(Паводле Пятра Рунца)*

**Шу́флік** — *тут*: лапатка для збору смецця (*рус.*: совок).

1. Прачытайце. Назавіце герояў твора.
2. Чаму бацькі прывялі дачок да дзеда і бабулі?
3. Аб чым гаварыў дзед з унучкамі?
4. Як ён правяраў сваіх унучак?
5. Хто першым парадаваў дзеда? Як працавала Вера?
6. Чым парадавала Марынка? Чаму аддала лепшы яблык сястрычцы?
7. Паразважайце, які чалавек аддае лепшае іншым. Ці справядліва падзяліла яблыкі Марынка?
8. Складзіце працяг апавядання па пачатку: *Назаўтра бабулі трэба было дапамагчы вымыць посуд...*

## Як Шурык з дому ўцякаў

### 1

Выйшаў Шурык з хаты на двор. Сумны-сумны.

— Ты чаго такі? — пытаецца дзед. Ён на прызбе сядзіць, на кіёк абапіраецца.

— Вось вазьму і ўцяку з дому, — адказвае Шурык.

— Куды?

— Абы-куды. Давай, дзедка, разам, га?

— Які з мяне ўцякач? Па сваім панадворку* ногі ледзьве перастаўляю. Я лепш дома пасяджу.

— Добра старому. Ніхто не крыўдзіць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Напэўна, табе ад маці перапала?

— Не любіць яна мяне зусім. Купіла ў краме цукерак, шакаладку адну. Каб хоць пакаштаваць дала.

— Можа, не заслужыў?

— Не заслужыў? Яна кожны раз гэтак кажа, калі не хоча пачаставаць.

— Нялёгка табе.

— Цяжка, дзедка. Пайду з дому. Назусім. Тады маці наплачацца.

— Хочаш, каб пра цябе не забываліся?

— Вядома.

— Тады памяць аб сабе добрую пакінуць трэба. Зрабі што-небудзь карыснае.

— Што?

— Дровы ля хлява бачыш? Знасі іх пад паветку. Складзі там. Толькі памногу не бяры.

— Добра, знашу.

**Панадво́рак** — двор.

1. У якім настроі выйшаў з дому Шурык?
2. На каго скардзіўся дзеду? Чаму?
3. Што наважыўся зрабіць хлопчык?
4. Што параіў яму дзядуля? Ці пагадзіўся хлопчык?
5. Прачытайце выразна па ролях. Перадайце інтанацыі хлопчыка і дзеда.

**2**

Пачаў хлопчык працаваць. Паленцы паколаты не тоўста. Шурык іх па тры за раз браў. Доўга працаваў. Ажно ўспацеў. Але ўсе дровы склаў. Скончыў, падышоў да дзеда, пытаецца:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ну, як, дзядуля?

— Акуратна зроблена. Яшчэ двор падмесці варта.

Уздыхнуў Шурык. Аднак венік узяў і пачаў падмятаць.

Толькі скончыў — мама выйшла. Агледзела двор, усміхнулася.

Шурык у хату шмыгнуў. Паглядзела мама на чысты двор, на складзеныя дровы і пайшла ў хату.

Адзін дзядуля на прызбе застаўся. Сядзіць, грэецца на сонцы.

Прайшло колькі часу, выйшаў на ганак Шурык.

— Склаў торбу? — пытаецца дзед.

— Якую торбу?





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Кожны, хто ў дарогу збіраецца, харчу* нарыхтаваць павінен. Ты ж не за блізкі свет* адправішся?

— А-а... — адказаў Шурык. — Я ўцякаць перадумаў. Застаюся.

І аблізаў выпацканыя ў шакалад пальцы.

*(Паводле Даіра Слаўковіча)*

**Харч** — ежа.
**Не за блі́зкі свет** — *тут*: далёка-далёка.

---

1. Як працаваў хлопчык? Як яго работу ацаніў дзед?
2. Што яшчэ ён прапанаваў зрабіць Шурыку?
3. Ці заслужыў Шурык узнагароду ад мамы?
4. Чаму ён перадумаў уцякаць?
5. Прачытайце апавяданне па ролях.
6. Падрыхтуйце кароткі пераказ.
7. Ці можна браць з Шурыка прыклад? У чым?

## Подзвіг даяра

### 1

Стасік Клімак нарадзіўся, калі закончылася вайна. Як падрос і закончыў школу, застаўся ў роднай вёсцы. Вырошчваў цялят. А пасля замяніў сястру Галю на ферме. Стаў даяром*.

Весела працаваў Стась. Любіў спяваць. Цэлымі днямі звінеў яго голас на ферме. Яго статак кароў стаў самым удойным*. Кожную жывёліну ўмеў прылашчыць, пачысціць, расчасаць. Імёны ім выдумліваў: Мілка, Царыца, Венера, Лялька...

Аднойчы зімою здарылася бяда. Стась ішоў са сваёй вёскі Тур'і на ферму. Пачыналася дзённая дойка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Раптам бачыць: гарыць ферма. Ён як ірвануў уперад. Усіх абагнаў. Першым ускочыў у палаючы хлеў. Ведаў Стась: там цяляты, каровы. Іх трэба ратаваць.

Густы едкі дым лез у вочы. Неставала паветра. Стась не звяртаў увагі. Намацаў загарадку, адчыніў і выгнаў на вуліцу пяцьдзясят цялят.

Вогненны віхор ірваўся і гудзеў. Вецер раздзімаў полымя. Горача. Хаця б глыток вады. Толькі адзін глыток. Выскачыў на двор, дзе ўжо мітусліва бегалі людзі, адганялі ад вогніва ачмурэлых* цялят. Стась ухапіў абпаленымі рукамі жменю снегу, прыклаў да твару. І зноў у полымя.

**Дая́р** — прафесія: майстар дойкі кароў.
**Удо́йны** — дае добры ўдой, шмат малака.
**Ачмурэ́лы** — *тут*: ашалелы, спалоханы, застылы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Прачытайце. Хто галоўны герой твора?
2. Кім працаваў Стасік Клімак?
3. Як адносіўся да сваёй працы? Знайдзіце адказ у другім абзацы.
4. Што здарылася аднойчы зімою?
5. Што зрабіў Стась? Каго кінуўся ратаваць?
6. Прачытайце і перакажыце апошнія два абзацы.

## 2

— Куды?! Нельга!.. — крычалі яму ўслед.

— Там — каровы! — крыкнуў ён. — А маме перадайце, што я...

Ніхто не пачуў, не паспеў пачуць ягоных апошніх слоў. Толькі ўбачылі яго ўсмешку.

У густым спякотным дыме ён з цяжкасцю намацваў ланцугі, якімі былі прывязаны каровы. Адчэпліваў іх, а то і вырываў разам з крукам. Сем кароў... Шаснаццаць... Дваццаць тры... Але ж ці ўсе?..

Вопратка яго дымілася. Полымя асмальвала валасы. Кроплі поту каціліся па твары, як слёзы. Душыў дым. Глыток бы марознага паветра...

Ды раптам вогненны хлеў абрынуўся.

Стасік загінуў, ратуючы жывёл.

Станіслава Клімака пасмяротна ўзнагародзілі баявым медалём «За адвагу». Яго імем назвалі жывёлагадоўчую ферму. А ў вёсцы насупраць двухпавярховай канторы адкрыты помнік мужнаму даяру.

І стаіць на п’едэстале* бронзавы Станіслаў Клімак. З гонарам і надзеяй пазірае сялянскі хлопец у светлы заў-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

трашні дзень сваіх землякоў. Не ў баі, а ў мірныя дні загінуў юнак. Аддаў жыццё, ратуючы народнае дабро.

*(Паводле Уладзіміра Ліпскага)*

**П'едэста́л** — *тут*: ніжняя частка статуй, абеліскаў.

**1.** Як ратаваў Стась кароў? Колькі вывеў з агню?
**2.** Што здарылася далей? Ці выйшаў даяр з фермы?
**3.** За што загінуў юнак? Ці любіў ён сваіх гадаванцаў?
**4.** Як вяскоўцы шануюць памяць Станіслава Клімака?
**5.** Прачытайце і перакажыце тэкст.

Каб не ўзнік пажар, перад выхадам з дому выключаюць святло, газ, прас, камп'ютар. Асабліва сочаць, каб не пагрызлі правады хатнія гадаванцы. Штогод запрашаюць інспектара для праверкі электрычнай праводкі.

Калі ўсё ж з'яўляецца дым або агонь, клічуць дарослых словам: «Пажар!» Ідуць далей ад дыму: на вуліцу або на балкон. Дым — самая вялікая небяспека!

## Рукі рабочыя

Да працы ахвочыя
рукі рабочыя,
за паверхам паверх
узнімаюць уверх.

Рытмічна, няспынна
кладуцца цагліны
адна за адной —
вырастаюць сцяной...

За паверхам паверх
узнімаюць уверх
рукі нястомныя,
рукі працоўныя.

*(Ніна Галіноўская)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**1.** Прачытайце верш. Якая яго тэма?
**2.** Якія рукі апяваюцца ў вершы? Што робяць рукі?
**3.** Як называюць рукі? Знайдзіце адказы: *рукі (якія?)* ... .
**4.** Назавіце, што вакол вас зроблена рабочымі рукамі.
**5.** Вывучыце верш на памяць.

## Зароблены рубель**

*Грузінская народная казка*

Жыў на свеце каваль. І быў у яго сын, ды такі гультай, што ва ўсім свеце не знойдзеш другога. Ні капейкі не зарабіў ён за ўсё жыццё, хаця і споўнілася яму ўжо дваццаць гадоў. Усё на бацькавым жыў.

Захварэў стары бацька, злёг. Адчувае — хутка смерць прыйдзе.

Паклікаў ён сына і гаворыць яму:

— Я ўсё жыццё працаваў. Сваімі рукамі дабро нажываў, а ты нават рубель зарабіць не можаш.

— Рубель зарабіць — не вялікая справа, — гаворыць сын.

— Ну што ж, ідзі зарабі, — гаворыць бацька. — Заробіш рубель — усю сваю гаспадарку пакіну табе ў спадчыну*, не заробіш — нічога не атрымаеш.

Што рабіць? Хочацца гультаю спадчыну атрымаць, а працаваць не хочацца. Ці ж гэта смешкі — цэлы рубель зарабіць, калі ён капейкі не нажыў!

А спрачацца з бацькам таксама не станеш — калі бацька сказаў, так і будзе. Бацькава слова — нібы гара каменная. Гару каменную не пасунуць, бацькава слова не змяніць.

Ну а маці шкада свайго сына. І гаворыць яна яму:


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Паслухай, сынок, вось табе рубель. Ты ідзі пагуляй да вечара, а вечарам прыйдзеш нібы з работы і аддасі бацьку грошы.

Лянуецца сын нават устаць, ды няма чаго рабіць — трэба ісці, каб бацька ні пра што не здагадаўся. Узяў у маці рубель і пайшоў. А вечарам прыйшоў дамоў, дае бацьку рубель і кажа:

— Вось, бацька, вазьмі. Цяжка мне гэты рубель даўся, спіны разагнуць не магу — так напрацаваўся.

Узяў бацька рубель, пакруціў, з усіх бакоў паглядзеў, з далоні на далонь перакінуў ды і кінуў у агонь.

— Не, — кажа, — ты гэты рубель не зарабіў.

Сын толькі плячыма паціснуў: «Не верыш — не трэба». І спаць пайшоў.

І на другі дзень сын прынёс бацьку рубель, які дала маці, а бацька не паверыў і зноў кінуў грошы ў агонь.

А на трэці дзень маці кажа сыну:

— Вось што, сынок, давядзецца табе і сапраўды папрацаваць, калі хочаш спадчыну атрымаць.

Няма чаго рабіць — давялося гультаю паслухацца. Цэлы тыдзень ён працаваў і зарабіў-такі рубель. Прыйшоў да бацькі і паклаў грошы на стол.

А бацька зноў кажа:

— Не, падманваеш ты мяне, сынок. Не ты гэтыя грошы зарабіў.

І кінуў іх у агонь, нібы смецце.

Не стрымаўся тут сын. Кінуўся да агню, голымі рукамі вуглі разграбае, з самага полымя грошы выхоплівае.

— Ды што ж гэта такое! — плача. — Я тыдзень спіну гнуў, а ты мае грошы ў агні спаліць хочаш!

Паглядзеў на яго бацька і кажа:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Вось цяпер я веру, што ты сам гэты рубель зарабіў. Чужых грошай табе не было шкада, а свае працай даліся, вось ты іх і пашкадаваў. Помні мае словы: «**Будзеш працаваць — і грошы будуць, і ўсё ў цябе будзе. А не будзеш працаваць — дык і чужыя грошы табе не дапамогуць**».

**Чужому рублю цана — капейка.**

**Пакі́нуць у спа́дчыну** — *тут*: перадаць нажытае дабро нашчадкам.

1. Прачытайце або паслухайце казку. Назавіце яе герояў.
2. Якая гэта казка — пра жывёл, пра чарадзейныя прадметы ці пра штодзённы побыт людзей?
3. Чым зарабляў бацька? Што рабіў сын?
4. Якую ўмову паставіў хворы бацька сыну?
5. Ці працаваў сын? Як паводзіў сябе, калі грошы дасталіся агню?
6. Чаму маці ў трэці раз не дала рубель? Чаму сын кінуўся бараніць свае грошы?
7. Паразважайце, чаму бацька паставіў сыну ўмову. Ці было яму шкада спадчыны для сына?
8. Якую навуку пакінуў сыну бацька? Выберыце з выдзеленых сказаў галоўнае.
9. Чым заканчваецца казка? Абмяркуйце з дарослымі сэнс прыказкі.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Успомніце назву раздзела, які вы прачыталі.
2. Як вы разумееце выраз «сапраўдны чалавек»? Прывядзіце прыклады, з якімі сапраўднымі людзьмі вам давялося сустрэцца.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Якая тэма твораў «Як Сяргейка навучыўся шкадаваць» Васіля Сухамлінскага і «Добрая фея» Лідзіі Арабей? Перакажыце каратка іх змест.
4. Што агульнага ў вершах «Малайчына» Уладзіміра Паўлава і «Бабуля захварэла» Івана Муравейкі? Якія чалавечыя якасці ўхваляюцца?
5. Якія людскія недахопы высмейваюцца ў творах «Прытворка» Івана Муравейкі, «Піліпка» Эдуарда Валасевіча, «Загадкі з адгадкамі» Васіля Жуковіча, «Ілгун» Віктара Шведа? Ці можна назваць такіх людзей сапраўднымі?
6. Чаму вучыць твор «Гасцінцы» Яўхіма Івановіча? Чаму малы хлопчык меў такую павагу сярод дарослых людзей? Які з яго вырасце чалавек?
7. Пра які подзвіг вы даведаліся з апавядання «Подзвіг даяра» Уладзіміра Ліпскага?
8. Чаму вучыць грузінская казка «Зароблены рубель»?
9. Прывядзіце прыклад прыказкі аб працы і прымаўкі пра рабочыя рукі.
10. Які з прачытаных твораў вам больш за ўсё спадабаўся? Чым?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



# З НАРОДНАЙ КРЫНІЦЫ

Здаўна наш народ стварыў мноства казак. Іх вусна пераказвалі, перадавалі з пакалення ў пакаленне. Казкі, што ствараліся народам, атрымалі назву народных.

Вылучаюць тры групы казак: казкі пра жывёл, чарадзейныя і бытавыя.

Надзвычай багатыя беларускія народныя казкі на сюжэты **пра жывёл**. Сваімі паводзінамі яны вельмі нагадваюць людзей. Добрых, працавітых, надзейных, разумных. Або злых, жорсткіх, хітрых. Жывёлы, як людзі, думаюць і размаўляюць, радуюцца і перажываюць, смяюцца і плачуць. У гэтых казках сцвярджаюцца працавітасць, дабрыня, мудрасць і знаходлівасць.

**Чарадзейныя казкі** — гэта фантастычныя гісторыі. Акрамя простых людзей у іх дзейнічаюць незвычайныя героі — асілкі, злыя і добрыя чараўнікі, фантастычныя істоты (цмок, вадзянік, жар-птушка). Звычайна галоўнаму герою дапамагаюць сілы прыроды (вецер, сонца) і чарадзейныя прадметы (жывая і мёртвая вада, клубочак, чароўная палачка). Героі чарадзейных казак выпраўляюцца ў небяспечныя падарожжы. Змагаюцца са злом і несправядлівасцю. І заўсёды перамагаюць.

**У бытавых казках** асуджаюцца недахопы і дрэнныя якасці (заганы) людзей — жорсткасць, сквапнасць, глуп-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ства. Высмейваюцца ілгуны, баязліўцы, гультаі. Героі бытавых казак — сяляне, працоўны люд і паны, служкі і князі, цары. Галоўныя героі перамагаюць ворагаў сваім розумам, мудрасцю, знаходлівасцю і дабрынёй.

?!
1. Пра якія групы беларускіх народных казак вы даведаліся?
2. Аб чым гаворыцца ў казках пра жывёл? Каго нагадваюць жывёлы?
3. Хто галоўныя героі чарадзейных казак? Якія чарадзейныя прадметы ім дапамагаюць?
4. Што асуджаецца ў бытавых казках? Якія якасці людзей ухваляюцца?

### Казка пра быка і яго сяброў

*Беларуская народная казка*

Пасвіўся на лузе бык. Убачыў ён каля рэчкі туман і спалохаўся: падумаў, што зямля і вада гараць.

«Пабягу я лепш адгэтуль на край свету!» — вырашыў бык.

Задраў хвост і пабег.

Сустрэўся яму па дарозе казёл:

— Бык, куды бяжыш?

— На край свету.

— Чаго?

— У нас зямля і вада гараць. Баюся, каб і мне не згарэць.

— Пабягу і я з табою.

— Бяжы.

Бягуць яны, а насустрач ім парсюк. Расказалі яны парсюку пра бяду, і той пабег разам з імі. Бягуць яны ўтрох. Потым па дарозе сустрэлі гусака, а далей і пеўня. Сталі ўсе бегчы разам. Беглі, беглі і прыбеглі ў лес. А тут і зіма надыходзіць. Бык кажа:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ну, хопіць бегчы: зімою зямля не загарыцца. Давайце будзем хату рабіць ды запасы на зіму рыхтаваць.

Парсюк кажа:

— Мне хаты не трэба, я выкапаю сабе яму. Нанашу туды моху на падсцілку, жалудоў на харч ды буду зімаваць. Мне і так цёпла будзе!

Казёл кажа:

— А я карою пракармлюся, у дупле пагрэюся.

— А ты, гусак? — пытаецца бык.

— У мяне пер’е цёплае, я дзюбу ў яго схаваю ды так перазімую.

— А ты, певень?

— А мне што, я і пад ялінкаю паначую.

Што рабіць? Узяўся бык адзін хату будаваць. Нанасіў бярвення, моху, збудаваў цёплую хату. Жыве ў ёй сабе і бяды не ведае.

І вось насталі маразы.

*А што адбылося далей, даведаецеся, калі прачытаеце казку самастойна. Звярніцеся за казкай у бібліятэку. Адкажыце на пытанні.*

1. Што напалохала быка на лузе? Ад чаго ён уцякаў?
2. З кім сустрэўся па дарозе бык?
3. Як вырашылі сустракаць зіму парсюк, казёл, гусак, певень? Адкажыце словамі казкі.
4. А як сустракаў зіму бык?
5. Прачытайце казку па ролях. Перадайце галасы і інтанацыі жывёл.
6. Назавіце ўсіх герояў казкі. Хто вам спадабаўся больш за ўсіх? Чаму?
7. Гэта казка чарадзейная, бытавая ці пра жывёл? Як вы здагадаліся?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**8.** Чаму вучыць гэтая казка? Ці можна пражыць не працуючы? Як называюць людзей, падобных у паводзінах да казла, парсюка, гусака і пеўня?

**9.** У вольны час падрыхтуйце з настаўнікам інсцэніроўку казкі.

## Стары бацька**

*Беларуская народная казка*

Вельмі даўно быў у людзей благі звычай. Як састарэе бацька, то сын завязе яго ў глухую пушчу ды і пакіне там...

Вось аднаго разу павёз сын бацьку ў пушчу. Шкада яму бацькі, вельмі любіў яго. Але што зробіш? Не павязеш — людзі смяяцца будуць. Скажуць, звычаяў не выконваеш, ды яшчэ з сяла выганяць...

Едзе ён такі маркотны*, а бацька і кажа яму:

— Няўжо ты, сынку, мяне, старога ды нядужага, аднаго ў пушчы пакінеш?

Падумаў сын, змахнуў слязу і кажа:

— Не, бацька, не пакіну. Уночы я прыеду па цябе. Забяру і схаваю ў цёмнай каморцы*, каб ніхто не бачыў.

Так сын і зрабіў. Як прыйшла ноч, прывёз ён бацьку з пушчы ды схаваў у цёмнай каморцы.

Здарылася праз некаторы час няшчасце. Град усё жыта выбіў, і няма чым нават новага пасеяць.

Прыйшоў сын да бацькі ў цёмную каморку, бядуе:

— Што рабіць? Не пасеем жыта — і на лета без хлеба будзем.

Бацька кажа:

— Не, сынку, пакуль я жывы, без хлеба мы не будзем. Слухай мяне. Як ты быў яшчэ малы, тады я гумно* ставіў. А ў тым годзе быў вельмі ж добры ўраджай. Дык



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

я немалочаным жытам гумно накрыў. Здзяры страху, абмалаці і будзеш мець насенне.

Сын так і зрабіў. Садраў страху з гумна, абмалаціў і пасеяў увосень жыта. Суседзі дзівяцца: адкуль ён насенне ўзяў? А сын маўчыць, бо нельга ж прызнацца, што гэта стары бацька яму дапамог.

Прыйшла зіма. Няма чаго есці. Зноў ідзе сын да бацькі ў цёмную каморку.

— Так і так, — кажа, — давядзецца з голаду паміраць...

— Не, — кажа бацька, — з голаду не памром. Слухай, што я табе скажу. У хаце пад лаваю, калі я быў яшчэ малады і дужы, закапаў трохі грошай на чорны дзень*. Жыццё, сынку, пражыць — не поле перайсці: усё можа здарыцца.

Узрадаваўся сын, выкапаў бацькавы грошы і купіў збожжа.

Сам з сям'ёю хлеб есць ды яшчэ і суседзям пазычае. Вось яны і пытаюцца ў яго:

— Скажы ты нам, брацe, адкуль ты хлеб бярэш?

Прызнаўся сын.

— Бацька, — кажа, — мяне корміць.

— Як жа так? — дзівяцца суседзі. — Ты ж завёз свайго бацьку ў лес, як і ўсе добрыя сыны!

— Не, — кажа ён, — я не рабіў так, як вы робіце. Я пакінуў бацьку пры сабе дажываць век. Затое як прыйшла бяда — бацька мне і дапамог. **Старыя людзі большы розум маюць, чым маладыя.**

Перасталі з таго часу сыны бацькоў у пушчу вазіць, а пачалі пад старасць шанаваць іх і даглядаць.

**Маркóтны** — *тут*: сумны.
**Камóрка** — *тут*: памяшканне без вокнаў для захавання прадуктаў (*рус.*: кладовка).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Гумно́** — збудаванне для сена, зерня.
**Чо́рны дзень** — *тут*: бяда, няшчасце.

1. Які быў звычай у даўнія часы? Ці добры ён?
2. Чаму сын парушыў гэты звычай?
3. Чым дапамог бацька, калі загінуў ураджай?
4. Як дапамог у галодны год? Што захаваў бацька на чорны дзень?
5. Што даказаў сын людзям? Прачытайце выдзелены сказ.
6. Як змянілася стаўленне да старых людзей?
7. Прачытайце выразна па ролях. Перакажыце казку блізка да тэксту.
8. Да якой групы адносіцца гэтая казка?
9. Чаму ву́чыць твор? Чаму трэба слухацца старэйшых?

Прыслухоўвайцеся, што вам кажуць дарослыя. Разважайце над іх словамі і парадамі. Яны пражылі даўжэйшы век, і ў іх багаты жыццёвы вопыт. Старэйшыя члены сям'і зычаць дабра дзецям.

## Разумная дачка**

*Беларуская народная казка*

**1**

Жыў адзін вельмі бедны чалавек з жонкаю. Нарадзілася ў іх дачка, а гасцей няма чым частаваць. Пайшоў бядняк на рэчку па ваду. Аж бачыць — ляжыць у кустах цялушачка. Ды такая слабая, што сама і не ўстане.

Прынёс ён цялушачку дахаты і кажа сваёй жонцы:

— Давай зарэжам яе: будзе чым гасцей пачаставаць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Спадабалася жонцы цялушачка — такая рыжанькая ды лысенькая.

— Не, — адказвае яна, — хай лепш гадуецца.

— Дык жа яна зусім кволенькая*. Яе, відаць, нехта знарок выкінуў, каб у хляве не здохла.

— Нічога, можа, як і выгадуем. Падрасце дачка — будзе ёй малако.

Паслухаў чалавек жонку, і пачалі яны гадаваць цялушачку.

Акрыяла* тая, расце як на дражджах. І дачка таксама расце як на дражджах. Ды такая разумніца ўдалася, што і старыя ахвотна слухаюць яе.

Выгадавалася з лысенькай цялушкі слаўная карова.

Падрасла дзяўчынка, стала ёй сем гадоў, пачала сама пасвіць карову. Але ж багаты зайздросны сусед захацеў адабраць у беднага карову. Абвінаваціў яго і прывёў да пана на расправу.

Выслухаў пан багатага і бедняка. А потым і кажа ім:

— Добра. Суд мой будзе такі. Загадаю вам тры загадкі: што на свеце сыцейшае за ўсё? Што на свеце саладзейшае за ўсё? Што на свеце шпарчэйшае* за ўсё? Хто адгадае, таму і карова застанецца. А цяпер ідзіце дахаты, падумайце. Заўтра прыйдзеце з адгадкамі.

**Кво́ленькая** — *тут*: слабенькая, нядужая.
**Акрыя́ць** — *тут*: набрацца сіл, акрэпнуць.
**Шпарчэ́йшы** — *тут*: хутчэйшы.

---

?! 1. Хто нарадзіўся ў сям'і бедняка? Як жыла сям'я?
2. Каго знайшоў бядняк на беразе? Што зрабілі з цялушкай?
3. Як гадавалася цялушка? Хто яе пасвіў?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**4.** Што значыць «расце як на дражджах»? Калі так гавораць?

**5.** Якой расла дачушка бедняка?

**2**

Вярнуўся бедны чалавек дахаты, сеў і плача.

— Чаго ты, тата, плачаш? — пытаецца дачка.

— Ды так і так, — адказвае бацька, — хоча багаты сусед адабраць у нас карову. Пайшлі мы з ім да пана на суд. А той загадаў нам тры загадкі. Хто з нас адгадае, таму і карова застанецца.

— А якія, тата, загадкі? — пытаецца дачка.

Бацька сказаў:

— Трэба адгадаць, па-першае, што на свеце сыцейшае за ўсё; па-другое, што на свеце саладзейшае за ўсё; і па-трэцяе, што на свеце шпарчэйшае за ўсё.



— Нічога, тата, не турбуйся, — кажа дачка. — Ідзі кладзіся спаць. Заўтра што-небудзь прыдумаем...

Назаўтра прыходзяць бедны з багатым да пана.

— Ну што, адгадалі мае загадкі? — пытаецца пан.

Багаты выйшаў наперад:

— Вось дзіва! Ды тут і адгадваць няма чаго. Нікога і нічога на свеце няма сыцейшага за майго рабога парсюка, саладзейшага за ліпавы мёд ад маіх пчол і шпарчэйшага за майго гнядога жарабца.

— А ты, — пытаецца пан у бедняка, — адгадаў?

— Адгадаў, пане: няма нічога сыцейшага за зямлю, бо яна ўсіх корміць. Няма нічога саладзейшага за сон, бо хоць



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

якое гора, а заснеш, дык і забудзешся. І няма нічога шпарчэйшага за людскія думкі. Бо сам ты яшчэ тут, а думкі ўжо далёка-далёка...

— Хто гэта цябе навучыў так адказваць? — пытаецца пан у бедняка.

— Мая дачка.

Прыйшлося пану прысудзіць бедняку карову.

1. Як адгадаў багацей загадкі пана?
2. Як іх разгадала дачка бедняка? Прачытайце яе адгадкі.
3. Каму пан прысудзіў карову?
4. Да якой групы належыць гэтая казка: пра жывёл, чарадзейная ці бытавая?
5. Прачытайце і пераказвайце спачатку па частках, пасля перакажыце казку цалкам у класе і дома.
6. Што ў гэтай казцы перамагае: багацце ці розум?

## Залаты птах**

*Беларуская народная казка*

Былі ў аднаго чалавека тры сыны: два разумныя, а трэці — дурны.

Старэйшы сын, Сцяпан, умеў на скрыпцы іграць. Сярэдні, Піліп, — на дудцы. А меншы, Іван, ні да чаго спрыту не меў. Сядзеў у запечку ды лучынкі стругаў.

Вырасла ў таго чалавека ў садзе яблынька. А на ёй — залатыя яблыкі. Цешыцца бацька з яблыкаў, і сыны цешацца. Кожную раніцу ў сад ходзяць глядзець, ці цэлыя.

Праверылі гэтак аднаго разу — не хапае яблыка! І на другую раніцу недалічыліся аднаго яблыка...



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Засумаваў бацька. «Відаць, — думае, — нейкі злодзей панадзіўся ў сад цягацца». Кажа ён старэйшаму сыну, Сцяпану:

— Ідзі ты, сынку, пільнаваць яблыкі.

Пайшоў Сцяпан пільнаваць. Усю ноч на скрыпцы іграў. А пад ранак заснуў. Калі прахапіўся, працёр вочы — нідзе нікога няма. Толькі аднаго яблыка не хапае...

Вярнуўся ён да бацькі маркотны.

— Не ўпільнаваў, — кажа, — злодзея: зноў адзін яблык сарваў...

На другую ноч сярэдні сын, Піліп, кажа:

— Пайду я пільнаваць. Быць таго не можа, каб не ўпільнаваў!

Пайшоў Піліп. Усю ноч на дудцы розныя полечкі іграў. А пад раніцу дужа спаць захацелася — ён і задрамаў. Пакуль прачнуўся — зноў аднаго яблыка няма!

Брыдка яму ў хату ісці. Ды што зробіш: не дапільнаваў злодзея.

На трэці дзень меншы сын, Іван, кажа:

— Дрэнныя з вас, браты, вартаўнікі. Вось я пайду, то на чым ні стане, а прыпільную злодзея.

Усе толькі пасмяяліся з яго гаворкі: ат, вядома, — дурань!

Набраў Іван цэлы жмут лучынак і пайшоў на варту. Сядзіць на драбінах. Стружа лучынкі ды песенькі пад нос сабе мармыча.

Пачало на дзень займацца. Чуе Іван — нешта здалёку зашумела. Стаіўся ён, углядаецца. Аж бачыць — ляціць да яблыні вялікі залаты птах. Падляцеў блізка і хацеў яблык схапіць. А Іван злаўчыўся — ды цап яго за доўгі хвост!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вырваўся птах і паляцеў без яблыка. Глядзіць Іван, аж у яго руцэ тры залатыя пёрцы засталіся.

Прыбег ён у хату, пабудзіў усіх.

— Глядзіце, — кажа, — я злодзея дапільнаваў. І тры залатыя пяры ў яго з хваста вырваў...

Паглядзелі браты і пачырванелі ад сораму, што не яны, а дурань справіўся. Узяла іх зайздрасць.

— Добра ж, — кажа старэйшы брат, — паеду я ў свет залатога птаха шукаць.



Узяў ён адно пяро для прыметы. Набраў харчоў, грошай на дарогу ды паехаў.

Мінула, можа, з паўгода. А ні Сцяпана, ні птаха няма. Тады сярэдні брат кажа да бацькі:

— Паеду хіба я шукаць залатога птаха. Можа, заадно і брата знайду.

Набраў і ён усялякіх прыпасаў на дарогу ды паехаў.

Мінуў цэлы год. А ні братоў, ні птаха і слыхам не чуваць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Бядуе бацька. А Іван струж лучынкі ў запечку ды мармыча сабе пад нос:

— Трэба, мусіць, мне самому ў дарогу выбірацца.

Падумаў бацька: «Што ж, прапалі разумныя сыны. Няхай і гэты, дурань, прападае». І не стаў яму пярэчыць.

Нічога не ўзяў Іван з сабою: ні грошай, ні хлеба. Толькі ўзяў трэцяе пяро, кій у рукі і ножык-сцізорык. Той, якім лучынкі стругаў. І пайшоў пехатою залатога птаха шукаць...

*Пра прыгоды Івана прачытайце самастойна. Звярніцеся за казкай у бібліятэку. Адкажыце на пытанні.*

1. Аб чым папярэдзіла Івана ваўчыха?
2. Як павёў сябе Іван у палацы? Хто яго выратаваў?
3. Як знайшоў Іван братоў? Што яны зрабілі?
4. Хто ажывіў Івана? Што расказала яму ваўчыха?
5. Што рабіў дома Іван? Што зрабіў яго бацька?
6. Праслухайце або прачытайце казку. Да якой групы казак яна адносіцца?
7. Які герой вам спадабаўся? Хто перамог у гэтай казцы? Чаму?

## Хітры мужык**

*Беларуская народная казка*

Даўным-даўно гэта было. Калі былі паны і беднякоў (мужыкоў) за людзей не лічылі. Нават прыказка ў паноў была: **дурны мужык, як варона**. Не хацелі мужыкі мірыцца з панскімі здзекамі. Часам прыкідваліся яны неразумнымі прастакамі і разыгрывалі паноў, здзекаваліся з іх праз жарты.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вось аднойчы так і здарылася. Вёз адзін чалавек у горад воз дроў прадаваць. Даганяе яго пан у брычцы*.

— Гэй, мужык! — крычыць пан. — Прэч з дарогі!

Прывыклі паны, каб ім дарогу саступалі. Мужык быў разумны і знаходлівы. Кажуць: **востры на язык, хітры, як ліс**. Вось і вырашыў ён разыграць пана, заступіцца за сябе.

Мужык пакінуў воз сярод дарогі, сышоў з дарогі і кажа:

— Едзь, пане, хоць да д’ябла!

Пан падумаў, што мужык дурны, не зразумеў яго.

— Прэч з канём! — растлумачыў ён мужыку.

Мужык выпраг каня, звёў убок, а воз пакінуў на дарозе. Узлаваўся пан на мужыка:

— Прэч з возам!

— То так бы ты адразу і казаў! — усміхнуўся мужык.

Запрог каня і з’ехаў з дарогі.

Прыехаў пан у горад і назаўтра пайшоў на рынак шукаць аўса.

Ходзіць па рынку, шукае, хто прадае авёс. Падышоў і да таго чалавека, якога ўчора дагнаў на дарозе. Людзей на рынку многа, і пан яго не пазнаў.

— Ці не чуваць тут аўса? — пытаецца пан.

— Аўса? — перапытвае мужык.

— Але, аўса.

Мужык зрабіў выгляд, што не зразумеў пытання пана.

— Пачакай, пане, — кажа мужык, — зараз даведаемся.

Узлез ён на воз і ветрыць носам*. Панюхаў, панюхаў і адказвае:

— Не, пане, не чуваць...

Бачыць пан — жартуе з яго мужык.

— Ці не ўчарашні ты? — пытаецца пан.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А мужык зноў смяецца.

— Бадай цябе, пане, качкі стапталі*! — адказвае. — Мне ўжо гадоў за сорак мінула, а ты кажаш — учарашні!

Пан злуецца:

— Чый ты, мужык?

Ён хацеў пачуць, якому пану належыць мужык. А той зноў жартуе:

— Мар'янін.

— А хто Мар'яна?

— Жонка мая.

Пан аж пачырванеў ад злосці:

— А хто ў вас старшы?

Мужык зноў прыкінуўся, што не разумее пана:

— Ёсць у нас, пане, адна бабка, Даміцэля. Дык ёй ужо гадоў за сотню будзе: яна за ўсіх старэйшая.

Плюнуў пан і аж зайшоўся ад злосці:

— Я не аб тым цябе пытаю: каго вы слухаеце?

— А-а... То так бы і казаў! Ёсць у нас у вёсцы хлопчык гадоў васьмі ці дзевяці. Ён як пачне граць на дудачцы, дык уся вёска збягаецца слухаць.

— Ды не! — тупае пан. — Я пытаюся: каго ты баішся?

— А-а... Ёсць у нашага Піліпа сабака паганы, дык мы ўсе яго баімся: хто каля Піліпавага двара ідзе, палку нясе.

— Вось жа бесталковы мужык! Я пытаюся, хто ў вас вышэйшы за ўсіх!

— А ёсць у нас, пане, мужык Аўдзей — ён за ўсіх вышэйшы.

Бачыць пан, што з мужыком не згаварыцца, пачаў у іншых дапытвацца, чый гэта мужык, якога пана.

Дапытаўся і паехаў да таго пана скардзіцца.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



— Твой мужык з мяне жартуе, — скардзіцца ён пану.

Загадаў пан цівуну* прывесці мужыка.

Павёў цівун мужыка ў панскія пакоі.

— Што з ім рабіць?

— Даць розаг*! — раіць пан-госць.

— Гэй, цівун, даць мужыку розаг! — крыкнуў пан.

Прынёс цівун пук розаг. А мужык узяў розгі:

— Яны мне ў гаспадарцы спатрэбяцца, — і шусь за парог.

Паны так і аслупянелі*.

**Бры́чка** — *тут*: закрыты вазок з мяккім сядзеннем.
**Ве́трыць** (носам) — *тут*: прынюхвацца ва ўсе бакі.
**Бада́й цябе́ ка́чкі стапта́лі** — трапны народны выраз, прымаўка.
**Цівýн** — *тут*: слуга пана.
**Ро́згі** — *тут*: гнуткія лазіны для пакарання. У тыя часы простыя людзі, нібыта рэчы ці жывёлы, належалі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

панам. У любы час і за любую правіннасць пан мог пабіць розгамі.

**Аслупянéлі** — *тут*: застылі ад здзіўлення, сталі нерухомымі, як слупы.

1. Прачытайце або праслухайце казку. Назавіце герояў.
2. Які быў мужык? Дапоўніце: *кемлівы, разумны, ...* .
3. Як называлі мужыка паны? Выберыце з выдзеленых слоў.
4. Растлумачце выразы «востры на язык», «хітры, як ліс».
5. Як мужык здзекаваўся з пана? Ці сапраўды ён не разумеў пана? Прачытайце іх дыялог па ролях.
6. Якое пакаранне прасіў для мужыка пан? Як знаходлівы мужык выратаваў сябе ад розаг?
7. Да якой групы належыць гэта казка? На якую яна тэму?
8. Што высмейваецца ў казцы, а што ўхваляецца?
9. Па жаданні разам з настаўнікам падрыхтуйце інсцэніроўку казкі.

## Як мужык гусей дзяліў

*Беларуская народная казка*

Жыў адзін бедны мужык. Зіму сяк-так перакідаўся. А прыйшла вясна — **хоць зубы на паліцу кладзі**. Адна гуска засталася, ды і тая худая.

— Занясу, — кажа мужык жонцы, — я гэтую гуску пану. Можа, ён дасць за яе крыху жыта. А там лебяда вырасце — як-небудзь і перакідаемся да новага хлеба.

— Добра, — адказвае жонка, — нясі. Нам з гускі мала карысці: без хлеба — і мяса не яда.

Зарэзаў бедны мужык гуску, аскуб і прынёс да пана.

— Што хочаш за яе? — пытаецца пан.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Дорага з пана не вазьму, — адказвае мужык. — Дасі гарцы* з два жыта...

Пан падумаў: гуска хоць і худая, але не дарагая.

— Ну, добра, — кажа, — куплю тваю гуску. Але падзялі ты яе на маю сям’ю.

— А якая ў пана сям’я? — пытаецца мужык.

— Я, пані мая, два сынкі і дзве дачкі.

Мужык падумаў і кажа:

— Пан — галава сям’і, пану і выдзелім галаву. Пані — першая пасля пана асоба, ёй няхай шыйка будзе. Сынкі падрастуць трошкі ды пойдуць таптаць бацькоўскія дарожкі — ім няхай будуць ножкі. А дочкам — па крылу, каб хутчэй замуж з дому вылятались.

— А рэшту* каму? — пытаецца пан.

— А рэшту мне. За тое, што падзяліў.

— Ну і хітры ж ты, мужык! — дзівіцца пан. — Удала падзяліў. Нічога не скажаш.

Аддаў пан мужыку гуску і яшчэ мех жыта ў прыдачу. Ідзе мужык дахаты, пасвіствае.

Даведаўся пра гэта яго сусед, багаты мужык. Схапіў ён пад пахі ажно пяць адкормленых гусак і — да пана.

— Вось, — кажа, засопшыся, — прынёс табе, панок, пяць гусак. Дай мне за іх пяць мяхоў жыта.

Пан кажа:

— Добра, дам табе пяць мяхоў жыта. Але падзялі ты гэтых гусак на шэсць душ маёй сям’і.

Дзяліў, дзяліў багаты мужык гусак — нічога не выходзіць. А тут якраз недалёка бедны мужык праходзіў. Пан паклікаў яго.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Падзялі ты гэтых гусак, — кажа, — на шэсць душ маёй сям'і. Бо твой сусед зусім бесталковы — не можа падзяліць пяць гусак на шэсць душ.

Падумаў бедны мужык і пытаецца ў пана:

— Ці верыць пан у святую тройцу?

— А як жа! — адказвае пан. — У святую тройцу веру.

— Ну дык будзем дзяліць. Пан, пані і гуска — святая тройца. Два панскія сынкі і гуска — яшчэ святая тройца. Дзве панскія дачкі і гуска — таксама святая тройца.

— Ну, бачыш, — кажа пан да багатага мужыка, — як трэба дзяліць?

Аддаў пан беднаму мужыку астатнія дзве гускі, а багатага выгнаў прэч.

**Га́рнец** — *тут*: народная мера сыпкіх рэчываў.
**Рэ́шта** — астатак.

1. Прачытайце або праслухайце казку. Хто яе галоўны герой?
2. Чаму мужык панёс апошнюю гуску пану? Што хацеў узамен?
3. Знайдзіце выдзелены выраз. Скажыце сваімі словамі, як жыла сям'я мужыка.
4. Як дзяліў мужык гуску? Прачытайце. Перакажыце, каму што дасталося.
5. Якім паказаны мужык у казцы? Як ацаніў яго пан?
6. Чаму багаты сусед не змог падзяліць сваіх гусак?
7. Як мужыку ўдалося падзяліць і на гэты раз? Ці змаглі б вы так падзяліць?
8. Да якой групы належыць гэта казка? Што ў казцы ўхваляецца?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Андрэй за ўсіх мудрэй

*Беларуская народная казка*

**1**

Жыў адзін цікаўны хлопец Андрэй. Хацеў ён усё ведаць. Куды ні гляне, што ні ўбачыць, — аб усім у людзей дапытваецца. Плывуць у небе хмары... Адкуль яны ўзяліся? Куды плывуць? Шуміць за вёскаю рака... Куды бяжыць яе вада?

Адказвалі яму людзі. Нарэшце бачаць, што і самі не ведаюць, што адказваць.

— Ты, Андрэй, хочаш быць за ўсіх мудрэй, — пачалі смяяцца з яго людзі. — Хіба ж можна ўсё ведаць?

Ды не верыць Андрэй, што нельга ўсяго ведаць.



— Пайду, — кажа, — да самога сонца. Яно ўсё бачыць і ўсё ведае. Яно мне і раскажа, чаго я сам не ведаю.

Пакінуў ён сваю хатку. І пайшоў шукаць таго месца, куды сонца на начлег спускаецца.

Ідзе ды ідзе, бачыць — сядзіць пры дарозе на камені чалавек. Ды пытаецца ва ўсіх:

— Дакуль я тут сядзець буду?

Андрэй яму таксама нічога не мог адказаць.

Пайшоў ён далей. Бачыць — чалавек падпірае плячыма плот.

— Што гэта ты, дзядзька, робіш? — пытаецца Андрэй. — Навошта гэты стары плот падпіраеш?

— Не ведаю... Можа, ты ведаеш?

— Каб ведаў, дык не шукаў бы таго, хто ўсё ведае, — адказаў Андрэй.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прайшоў крыху, бачыць — чалавек смецце пераграбае.

— Навошта ты, дзядзька, смецце пераграбаеш?

— Не ведаю...

— Ну і я не ведаю, — сказаў Андрэй і пайшоў далей.

Доўга ён ішоў ці нядоўга, прыйшоў у вялікі лес. І нарэшце выбраўся на палянку. І тут яму раптам аж вочы засляпіла. Адкрыў ён вочы, бачыць — недалёка сонцавы палацы, як агонь, гарацьць. Ледзьве ўвайшоў ён у палацы — нічога ад бляску не відаць. Бачыць — сядзіць у крэсле старэнькая сонцава маці. Выслухала яго і сказала, каб пачакаў, пакуль вернецца сонца.

1. Назавіце галоўнага героя казкі. Чым ён выдзяляўся сярод людзей?
2. Чаму рашыў пайсці да сонца?
3. З кім сустрэўся ён па дарозе? Чым занятыя былі тыя людзі?
4. Якімі ўбачыў Андрэй палацы сонца? Прачытайце.
5. Ці зразумела яго сонцава маці? Чаму?
6. Прачытайце казку па ролях. Перакажыце сваімі словамі.

## 2

Выйшаў Андрэй з палацаў.

Пайшоў да рэчкі і нагнуўся да вады.

Раптам бачыць — падымаецца з дна ракі дзяўчына. Ды такая прыгожая, што і вачэй не адарваць.



— Не пі вады з ракі, — кажа яна, — бо сонца цябе спаліць!

— Але ж мне вельмі піць хочацца...

— Ідзі за мною.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прывяла яго дзяўчына да старога дуба. А з-пад яго б'е крыніца чыстай сцюдзёнай вады.

Нагнуўся Андрэй і напіўся ўволю крынічнай вады. Тым часам пачало апускацца з неба сонца ў свае палацы. Трэба да яго ісці, ды не можа ён з прыгожаю дзяўчынаю расстацца.

— Ты ж глядзі, не кажы сонцу, што мяне бачыў, — сказала дзяўчына. Узнялася ўгору і заблішчала адтуль яснаю зоркаю.

Пайшоў Андрэй у палацы. А там сонца гэтак пячэ, што аж сцены палацаў трашчаць. Але Андрэю нішто — напіўся крынічнай вады. Не можа сонца яго даняць. Толькі шапку насунуў на лоб, каб вачэй не высмаліла.

Расказаў ён сонцу, чаго прыйшоў. Сонца кажа:

— Вучыць цябе мне няма часу. Але я зраблю так, што ты ўсё сам будзеш ведаць.

Сабрала сонца ўсе свае прамені ў адзін пучок ды бліснула яму ў галаву. І адразу адчуў Андрэй, што галава яго стала ясная і светлая. Толькі надта гарыць, а сэрца халодным зрабілася, як лёд...

Выйшаў ён з палацаў. Нядобра яму стала з халодным сэрцам. Успомніў ён пра дзяўчыну, і захацелася ўбачыць яе. Пачаў ён клікаць яе. Скацілася з неба ясная зорка і стала перад ім прыгожаю дзяўчынаю. Як глянуў на яе Андрэй, дык адразу і адчуў, што сэрца яго тое ж, як раней.

Узяў ён дзяўчыну за руку і павёў у свой край. І такі ён шчаслівы цяпер ішоў, што і птушкам з крыламі не зайздросціў.

Падышлі яны да таго чалавека, што смецце пераграбаў. Паглядзеў на яго Андрэй, і ўсё яму ясна стала.

— Ты, — кажа ён чалавеку, — шукаеш у смецці згубленыя капейкі. І дарма толькі час траціш. Бярыся лепш за работу, дык хутчэй заробіш тыя капейкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Паслухаў яго чалавек. Пачаў працаваць і нажыў грошы на патрэбу.

Ідуць яны далей. Убачылі чалавека, што плот плячыма падпіраў. Паглядзеў на яго Андрэй і кажа:

— Не падпірай ты, чалавеча, таго, што згніло. Зрабі лепш новы плот.

Паслухаў яго чалавек. І паставіў новы плот замест гнілога.

Дайшлі яны да таго чалавека, што на камені сядзеў. Не ведае ён, дакуль яму тут сядзець. Андрэй кажа яму:

— Не будзь, чалавеча, такі скупы. Дай пасядзець на гэтым камені і іншым людзям.

Зняў Андрэй чалавека з каменя і сеў сам з дзяўчынаю. Адпачылі яны крыху ды рушылі далей. У той край, дзе жыў Андрэй.

І цяпер не Андрэй у людзей аб усім распытваецца, а людзі ў яго.

Так стаў Андрэй за ўсіх мудрэй.

---

1. З кім сустрэўся хлопец ля крыніцы? Як яму дапамагла дзяўчына-зорка?
2. Ці стала слухаць яго сонца? Што зрабіла яно для Андрэя?
3. Хто растапіў яго халоднае сэрца?
4. Як адказаў Андрэй на пытанні сустрэчных людзей? Перакажыце.
5. Чаму сталі зваць Андрэя мудрым?
6. Да якой групы казак можна аднесці гэтую казку? Што ў ёй чароўнага?
7. Ці трэба хадзіць па веды да сонца? Паразважайце, як можна цяпер здабыць веды.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Ганарыстая варона

*Беларуская народная казка*

Раскаркалася неяк увосень адна варона на сметніку*.

— Вы сабе як хочаце, — кажа сяброўкам, — а я не магу тут цэлую зіму мерзнуць. Я не такая неразумная варона, як вы!

— А што ж ты думаеш рабіць, разумная? — пытаюцца сяброўкі.

— Палячу за мора: там, кажуць, зімы не бывае.

— Ну што ж, — паківалі галовамі сяброўкі, — шчаслівай дарогі. А мы ўжо як-небудзь і дома перазімуем.

Сабралася ганарыстая варона і паляцела за мора.

Доўга ляцела ці нядоўга, аж бачыць — пад ёю ўжо не вада. А зямля зялёная, зверху цёплае сонейка свеціць.

«Ну, — думае варона, — тут я спынюся».

Апусцілася на высокае дрэва ды пачала выглядаць спажыву. Выгаладалася ж, нябось, за дарогу.

Убачылі варону заморскія птушкі.

— Хто ты? — пытаюцца. — Ніколі мы ў сваіх краях такой птушкі не бачылі. Можа, ты паўночны салавей? Ён, кажуць, пяе, як званочак звініць.

— Але, але, — падхапіла варона. — Я — паўночны салавей!

А сама сабе думае: «Хіба я горш за салаўя спяваю? Чаму ж толькі яму гонар і павага?»

Зарадаваліся заморскія птушкі.

— Паспявай нам, паўночны салавейка! — просяць варону. — А мы паслухаем. Вельмі ж хочацца нам твой голас пачуць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Задрала варона ўгору сваю дзюбу і заспявала на ўсё горла:

— Кар-кар-р! Кра-кра! Гэй, гэй! Я — паўночны салавей!



Пераглядваюцца птушкі паміж сабою, вушы затыкаюць.

А потым не вытрымалі слухачы. Гуртам наляцелі на варону і давай дзяўбці.

— Ляці прэч са сваімі песнямі! Не хочам мы цябе слухаць.

Пакрыўдзілася варона на птушак і паляцела назад дадому.

А тут і вясна настала. Не захацела варона на сметнік варочацца. Паляцела на рэчку. Села там на беразе і цікуе за рыбамі. Бачыць: паўзе рак. **Ну, голад — не цётка: калі няма рыбы, то і рак — рыба.** Схапіла яна рака і сабралася ўжо снедаць. Ды чуе раптам ліслівы галасок рака:

— Вось добра, што трапіў у дзюбу не якой-небудзь чорнай галцы. А самой пані вароне. Як жа мне пашанцавала! Ты ж такая прыгажуня, такая красуня, што і сказаць няможна. Шэрыя перайкі* твае зіхацяць на сонейку. А галасок у цябе — як у таго салаўя. Хацеў бы я, пані варона, пачуць тваю песню яшчэ раз.

— Праўда, праўда! — каркнула ўзрадаваная ад пахвалы варона. — Ну дык слухай!

І завяла варона на ўсю ваколіцу*:

— Кар-кар-р! Я не простая варона!

Скончыла спяваць, глядзіць — **а рака і след прастыў.**

Давялося ганарыстай і галоднай вароне зноў на сметнік да сябровак ляцець.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Сме́тнік** — *тут*: месца збору смецця.
**Пе́райкі** — пёры, пер’е.
**Вакóліца** — *тут*: наваколле.

1. Дзе бавіла час варона з сяброўкамі?
2. Якой яна лічыла сябе ў параўнанні з іншымі?
3. Куды паляцела варона? Кім назвалася ў заморскай краіне?
4. Што ў яе атрымалася? Чаму заморскія птушкі яе прагналі?
5. Куды вярнулася варона? Дзе і як шукала ежу?
6. Дайце тлумачэнне выдзеленым выразам.
7. Як варону ашукаў рак? Знайдзіце трапны выраз.
8. Да якой групы казак належыць твор?
9. Якія людскія недахопы і заганы высмейваюцца ў гэтай казцы? Выберыце: *сквапнасць, глупства, ганарыстасць, жорсткасць, нахабства, гультайства, самаўпэўненасць.*

**Прыказкі**

- Якая птушка, такі і галасок.
- Дурная птушка свайго гнязда не шануе.
- Саву на жаўранка не пераробіш.

## З рога ўсяго многа**

*Беларуская народная казка*

**1**

Жылі сабе дзед ды баба. Бедна жылі. Вядома, старыя: ні рабіць, ні зарабіць не могуць. Толькі тое і мелі, што нажабруюць*.

Дачакаліся яны вясны. Людзі сеяць пачалі. Вось баба і кажа дзеду:


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Хоць бы ты, дзеду, пасеяў трошкі проса. Я прыхавала гарчык* на насенне. Мы тады кашы наварылі б, а то нажабраваныя сухары дужа цвёрдыя на нашы зубы.

— Добра, — кажа дзед, — пасею.

Ускапаў ён каля кустоў загончык ды пасеяў проса.

Узышло проса, расце. Сонца яго грэе, дождж паліваe. Цешыцца дзед з проса, не нацешыцца.

Вось так пайшоў ён аднойчы глядзець сваё проса. Бачыць: журавель шпацыруе* па ім.

— Акыш, каб цябе! — закрычаў дзед на жураўля. — Бач, дзе месца для пагулянак выбраў!

Журавель падняўся і паляцеў.

Паглядзеў дзед, аж усё яго проса патаптана ды паламана...

Зажурыўся дзед, прыйшоў дахаты і кажа бабе:

— Добрае проса зарадзіла, ды адна бяда: унадзіўся ў яго журавель лятаць. Усё чыста пабіў, паламаў сваімі доўгімі нагамі. І жаць не будзе чаго.

Пабедавала баба, а потым кажа:

— Ты ж, дзеду, быў некалі добрым стральцом. І стрэльба твая яшчэ на вышках валяецца. Вазьмі яе, пайдзі ды застрэль таго жураўля-нягодніка. Будзе ў нас хоць мяса замест кашы.

Паслухаў дзед, дастаў з вышак стрэльбу і пайшоў на свой загон.

Прыходзіць, глядзіць — журавель зноў у просе топчацца. Узлаваўся дзед і хацеў ужо бабахнуць па злодзею.

А той падняў галаву ды загаварыў чалавечым голасам:

— Чакай, дзядуля! Што гэта ты надумаўся рабіць?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Страляць цябе буду! — кажа дзед. — Ты ўсё маё проса вытаптаў сваімі доўгімі нагамі.

Журавель кажа:

— Не ведаў я, дзядуля, што гэта тваё проса: думаў — панскае. Даруй мне.

— Добры інтарэс — дараваць! — кажа дзед. — Няма ў мяне больш нічога. Толькі і меў надзею на гэтае проса. А цяпер давядзецца праз цябе з голаду паміраць.

Выслухаў журавель дзеда.

— Ну, калі ты такі бедны, — кажа, — дык пачакай трохі. Я прынясу табе падарунак за проса.

Узмахнуў крыламі і паляцеў за кусты.

**Нажабрава́ць** — *тут*: сабраць міласціну, папрасіць у людзей.

**Га́рчык** — тое ж, што гарнец; мера, роўная чвэрці вядра.

**Шпацырава́ць** — *тут*: няспешна хадзіць, прагульвацца.

1. Як жылі дзед з бабай?
2. Што пасеяў дзед? Якое вырасла проса?
3. Што здарылася на полі? Хто вытаптаў проса?
4. Як дзед хацеў пакараць злодзея? Што паабяцаў яму журавель?

**2**

Стаіць дзед з дубальтоўкаю* і думае: «Відаць, ашукаў мяне журавель. Дарэмна не застрэліў яго. Што я цяпер бабе скажу?»

Але толькі ён так падумаў, як бачыць: ляціць з-за кустоў журавель і ў дзюбе торбачку трымае.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Прыляцеў, падаў дзеду торбачку.

— На табе, — кажа, — дзядуля, за проса.

Дзед коса паглядзеў на торбачку — звычайная, зрэбная*! Пакруціў ён галавою і кажа:

— Навошта мне гэта торбачка? У мяне, братка, і сваіх хапае. Жабрак я. А ў жабрака, сам ведаеш, торбы — усё яго багацце.

— Бяры, дзядуля: такой у цябе няма... Гэта цудоўная торбачка. Ты толькі палажы яе перад сабой і скажы: «Торбачка, раскаціся, раскруціся, дай піцення, ядзення», — дык адразу ўсё будзе. А як наясіся, скажы: «Торбачка, скаціся, скруціся, піценне, ядзенне, згарніся». І торбачка зноў стане такой, як была.

— Дзякую, калі так, — сказаў дзед і пайшоў з торбачкаю дахаты.

Хочацца дзеду даведацца, ці праўду журавель сказаў. Прысеў ён ля дарогі, палажыў торбачку на зямлю і прагаварыў:

— Торбачка, раскаціся, раскруціся, дай піцення, дай ядзення!

І — дзіва! Тут такі багаты стол адкрыўся перад дзедам, што і ў паноў не ўбачыш. Пірагі ды каравай, варанае ды смажанае, міска вяндліны ды розныя віны...

— Малайчына, журавель, не ашукаў! — зарадаваўся дзед.

Наеўся, напіўся ён, потым загадаў торбачцы згарнуцца. Запіхнуў яе за пазуху ды вясёлы пайшоў далей.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прыходзіць дахаты:

— Ці жыва ты, бабка, ці здарова?

— Я жывая, дзядулька! А ты як? Нешта ты надта доўга хадзіў. Я ўжо думала, цябе ваўкі з'елі ці мядзведзі задушылі.

— Не, бабка, ваўкі не з'елі, мядзведзі не задушылі, прынёс я хлеба-солі, на ўсё наша жыццё будзе даволі. Садзіся, старая, за стол.

Выняў дзед з-за пазухі торбачку. Палажыў на стол і сказаў, што належыць.

Баба аж вочы вылупіла. Столькі ўсяго на стале з'явілася, і нават сама хатка пасвятлела...

— Адкуль ты гэта ўзяў, стары?

— Журавель той даў, што ты застрэліць загадала.

— Ай-яй! — хапілася за галаву баба. — Навошта ж страляць такога слаўнага жураўля?

Наелася баба, напілася і кажа дзеду:

— Давай гасцей паклічам!

— Якіх?

— А ўсіх, у каго няма чаго есці.

— Кліч, — згадзіўся дзед.

Пайшла баба па сяле, паклікала ўсіх бедных.

Спадабалася гасцям цудоўная торбачка. Кожны дзень цяпер пачалі хадзіць яны да дзеда і бабы частавацца.

*Што адбылося далей, даведаецеся, калі прачытаеце казку самастойна. Звярніцеся за казкай у бібліятэку. Адкажыце на пытанні.*

**Дубальто́ўка** — стрэльба.
**Зрэ́бная** (то́рбачка) — з простага, грубага палатна.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Хто галоўны герой казкі?
2. Што падарыў журавель дзеду? Якая была торбачка?
3. Як праверыў дзед магчымасці торбачкі?
4. Чым ён парадаваў бабку?
5. Як дзед і баба падтрымалі галодных суседзяў?
6. Прачытайце казку па ролях.
7. Якая галоўная думка гэтай казкі? Хто каго перамог? Ці заўсёды бедны чалавек мог сябе абараніць?
8. Да якой групы належыць гэта казка? Якія чарадзейныя прадметы ў ёй паказаны?
9. Дайце назву кожнай частцы. Перакажыце часткі па пытаннях, а пасля — усю казку цалкам. Раскажыце яе сваімі словамі сябрам і бацькам.

## Музы́ка-чарадзей**

*Беларуская народная казка*

Жыў некалі на свеце адзін музы́ка. Пачаў ён іграць яшчэ змалку. Бывала, пасе валоў — зробіць з лазы дудачку ды як зайграе. Дык валы скубці траву перастануць, натапыраць вушы ды слухаюць. У лесе птушкі прыціхнуць. Нават жабы ў балоце не крумкаюць*.

Паедзе на начлег — там весела. Хлопцы і дзяўчаты пяюць, жартуюць — ведама, маладосць. А ноч цёплая, аж парыць. Любата.

Тут музы́ка як зайграе на сваёй дудачцы. Усе — і хлопцы і дзяўчаты — адразу, як па камандзе, суцішацца. Сядзяць начлежнікі, слухаюць і не зварухнуцца. Забыліся, што натруджаныя за дзень рукі і ногі баляць. Што голад даймае. І хочацца сядзець гэтак усё жыццё і слухаць ігру музы́кі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Змоўкне дудачка. Ды ніхто не адважыцца і з месца скрануцца. Каб не спужаць таго чароўнага голасу, што рассыпаўся пошчакам* па лесе, па дуброве ды ўзнімаецца ў самае неба.

Зноў зайграе дудачка, ужо жаласліва. І тут такая нудота народ ахопіць... І такі жаль людзей агорне. Што не толькі бабы, а і мужыкі, старыя, барадатыя, плачуць. І так плачуць, як над нябожчыкам або нібы сынкоў у салдаты праводзяць.

Але вось музы́ка зайграе вясёлае. Пакідаюць мужчыны і бабы косы, граблі, вілы. Возьмуцца ў бокі і давай скакаць. Скачуць людзі, скачуць коні. Скачуць дрэвы ў дуброве. Скачуць зоркі, скачуць хмаркі — усё скача і весяліцца.

Такі быў той музы́ка-чарадзей: што захоча, тое з сэрцам зробіць.

Падрос музы́ка. Зрабіў сабе скрыпачку ды пайшоў у свет. Куды прыйдзе — пайграе. За гэта яго накормяць, напояць, як самага лепшага госця. І яшчэ на дарогу дадуць.

Доўга хадзіў так па свеце музы́ка. Весяліў добрых людзей, а ліхім панам да зарэзу* надаеў. Бо куды ён ні прыйдзе, там людзі перастаюць паноў слухаць. Стаў ён ім упоперак дарогі, **як костка ў горле**.

Надумаліся паны са свету яго звесці. Пачалі падгаворваць аднаго, другога, каб музы́ку хто забіў ці ўтапіў. Ды не знайшлося ахвотніка. Простыя людзі любілі музы́ку. А прыганятыя баяліся — думалі, што ён чараўнік.

Згаварыліся тады паны з чарцямі. А ведама: **паны і чэрці — аднае шэрсці**.

Ідзе аднаго разу музы́ка лесам. А чэрці наслалі на яго дванаццаць галодных ваўкоў. Заступілі яны музы́ку дарогу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Стаяць, зубамі ляскаюць. Вочы, як распаленыя вуглі, гараць. Няма ў музы́кі нічога ў руках. Толькі пад пахаю скрыпка ў мяшэчку. «Ну, — думае ён, — канец мой прыйшоў».

Дастаў музы́ка з мяшэчка скрыпку. Каб яшчэ раз перад смерцю пайграць. Прыхінуўся да дрэва ды і павёў смычком па струнах.

Як жывая загаварыла скрыпка. Пайшоў пошчак па лесе. Замерлі кусты і дрэвы — лістком не варухнуць. А ваўкі як стаялі з разяўленымі пашчамі, так і скамянелі. Слухаюць і пра голад забыліся.

Перастаў музы́ка іграць. А ваўкі, як сонныя, у лес пацягнуліся.

Пайшоў музы́ка далей. Сонейка ўжо за лес закацілася. Толькі яшчэ свеціць на самыя верхавінкі. Быццам аблівае іх пазалотаю. Ціха, як у вуху. Вельмі харошы вечар.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сеў музы́ка на беразе ракі. Дастаў з мяшэчка скрыпку і зайграў. Ды так прыгожа, што заслухаліся і неба, і зямля. А калі полечку зайграў, дык усё вакол давай скакаць. Зоркі мітусяцца, як зімою мяцеліца. Хмаркі плаваюць па небе. А рыба так узгулялася, што рака кіпіць, як вада ў гаршку.

Не вытрымаў і вадзяны цар — пусціўся ў скокі. Ды так разышоўся, што вада заліла берагі. Тым часам бачыць музы́ка, што вадзяны цар нарабіў бяды. Заліў людзям палеткі і агароды. Перастаў ён іграць. Палажыў скрыпку ў мяшэчак і пайшоў далей.

Ідзе ён ды ідзе, аж вось падбягаюць да яго два панічы.

— У нас сёння ігрышча, — кажуць. — Пайграй нам, пане музы́ка. Мы табе заплацім, што захочаш.

Падумаў музы́ка. Ноч на дварэ, начаваць няма дзе. Дый грошай няма.

— Добра, — кажа, — пайграю.

Прывялі панічы музы́ку ў палац. Бачыць ён — панічоў і паненак там хоць гаць гаці*. На стале нейкая вялікая глыбокая міска стаіць. Панічы і паненкі па чарзе падбягаюць да яе. Памочаць палец у міску і мажуць сабе вочы.

Падышоў да міскі і музы́ка. Памачыў палец і памазаў вочы. І толькі зрабіў так, бачыць, што гэта не паненкі і панічы. А ведзьмы і чэрці. Што ён не ў палацы, а ў пекле.

«Эге ж, — думае музы́ка, — дык вось на якое ігрышча зацягнулі мяне панічы! Ну, добра. Я ж вам зараз пайграю!»

Наладзіў ён скрыпку. Ударыў смычком па жывых струнах. І тут адразу ўсё пекла ў трэскі разляцелася. А чэрці з ведзьмамі разбегліся хто куды.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Кру́мкаць** — *тут*: квакаць.
**По́шчак** — *тут*: песня, музыка.
**Да зарэ́зу** — *тут*: вельмі надаеў.
**Хоць гаць гаці́** — вельмі шмат.

1. Паслухайце або прачытайце казку. Назавіце галоўнага героя.
2. Як іграў таленавіты музы́ка? За што яго любілі людзі?
3. Як адносіліся да яго паны? Ці любілі яны музыку? Чаму?
4. Што прыдумалі паны? Чаму хацелі загубіць музы́ку?
5. З кім паны згаварыліся на загубу?
6. Што ў іх атрымалася?
7. Да якой групы належыць гэта казка?
8. Якая галоўная думка твора? Што ўслаўляецца?
9. Абмяркуйце з дарослымі, чаму талент чалавека выклікае зайздрасць у людзей.

Беларускія пісьменнікі Змітрок Бядуля, Максім Багдановіч, Якуб Колас услаўлялі музы́ку ў творах. Самы славуты твор пра скрыпача — паэма «Сымон-музы́ка» Якуба Коласа.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. З якімі групамі беларускіх казак вы пазнаёміліся?
2. Хто стварае народныя казкі?
3. Ці толькі ў беларусаў ёсць народныя казкі? Прывядзіце прыклад грузінскай казкі.
4. Пра каго расказваецца ў казках пра жывёл? Што ў іх высмейваецца? Прывядзіце прыклады.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Якія казкі называюць чарадзейнымі? З чым змагаюцца героі гэтых казак? Хто ім дапамагае? Прывядзіце прыклады.
6. Што асуджаецца ў бытавых казках? Хто іх галоўныя героі? Якая якасць дапамагае героям перамагаць зло? Прывядзіце прыклады.
7. У якой казцы залаты птах прылятаў па залатыя яблыкі? Коратка раскажыце яе змест. Да якой групы можна аднесці гэтую казку?
8. У якой казцы нядобрыя старыя звычаі перасталі існаваць? Які новы звычай усталявалі людзі? Якія цяпер адносіны да пажылых людзей?
9. У якой казцы хітры мужык дзяліў адзін на шэсць і пяць на шэсць? Ці правільнае было дзяленне?
10. Якія казкі з гэтага раздзела вам асабліва запомніліся? Перакажыце коратка іх змест.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



# ВЯСНА, ВЯСНА! УСЕ ЁЙ РАДЫ!..

## Веснавыя ручайкі

Лес і луг пасля адлігі
абудзіў
вясёлы звон.
Па рацэ сплываюць крыгі* —
за снягамі наўздагон.

Так звінелі, так звінелі,
лёд зламаўшы,
ручайкі,
што на звон іх прыляцелі
сустракаць вясну шпакі.

*(Віктар Гардзей)*

**Кры́га** — *тут*: ільдзіна на рацэ ў час ледаходу.

1. Прачытайце. Пра якія з'явы гаворыцца ў вершы?
2. Хто вясёлым звонам абудзіў лес і луг?
3. Калі весела звіняць ручайкі?
4. Хто прыляцеў сустракаць вясну?
5. Які гэта верш — пра перажыванні чалавека, пра прыроду ці пра грамадства?
6. Вывучыце верш на памяць.

## Прыйшла вясна

### 1

Мароз яшчэ начамі дакучаў. Але ж сонейка ўсё мацней грэла і залівала ціхія палі і сенажаці.

Яго магутныя прамяні ўпалі на страху Янкавай хаткі. І нават заглянулі праз аконца ўсярэдзіну. Янка адчуў іх цёплую ласку. Хуценька апрануўся, выбег у садок.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Там яго бацька ўважна аглядаў кожнае дрэва. Ды адпілоўваў сухія галінкі. Пасля ачышчаў ствалы і грубейшыя сукі ад моху.

Угледзеўшы Янку, бацька весела крыкнуў:

— Што, сынок, сустракаць вясну выйшаў?

— А дзе ж тая вясна? Снег усюды ляжыць. Ды яшчэ гэтак сцюдзёна, — адказаў Янка, паціраючы зачырванелыя ручкі.

— Пачакай, сынок, хутка будзе ўжо цёпла і хораша, — сказаў бацька, — кожны дзень вясна да нас набліжаецца. Вось з гэтых пупышак, што бачыш на дрэвах і кустах, вырастуць зялёныя лісточкі. Палі зазелянеюць. Сенажаці і балоты пакрыюцца жоўтымі дыванамі малачаю* і матачніку*. Як толькі сыдзе снег з лясных узгоркаў, глянуць на нас з-пад кустоў ляшчыны сіненькія вочкі пралесак. Помніш, колькі іх было летась?

— Я помню, помню, татачка. Дык, значыцца, як закрасуюць пралескі, то ўжо будзе вясна? — пытаўся Янка.

Хацеў хлопчык яшчэ нешта спытацца ў таты. Але ж той адышоў. Пастаяў Янка яшчэ крыху, падумаў ды пайшоў дахаты.

**Малача́й** — расліна, што цвіце ў маі, мае белы сок.
**Ма́тачнік** — *тут*: падбел (*рус.*: мать-и-мачеха).



Малачай



Матачнік (падбел)



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

?!
1. Якое надвор'е апісана ў апавяданні?
2. Каго ўбачыў Янка ў садзе? Што рабіў бацька?
3. На якія прыкметы вясны ён указаў? Знайдзіце ў тэксце.
4. Што зразумеў малы Янка? Калі надыдзе вясна?
5. Прачытайце па ролях. Перакажыце змест па пытаннях.

## 2

У наступныя дні надвор'е было вельмі кепскае. Дробны дождж барабаніў у вокны ад раніцы да вечара. Вецер згінаў дрэвы аж да зямлі. Доўга прыйшлося сядзець Янку ў хаце. Але нарэшце аднае раніцы сонейка неспадзявана* выглянула з-за хмар. Хлопчык выбег у садок.

Якая перамена! Як цяпер інакш усё выглядала! Снегу не было нідзе ні крышку. Праз жоўтую леташнюю траву прабівалася ўжо свежанькая зялёная траўка. Кусты агрэсту пакрыліся маладзенькімі лісточкамі. Вербы распусцілі пупышкі. Высока ў небе звінеў жаваранак. А на страсе адрыны* стаяў бусел.

Але ж Яначка сам сабе не верыў, што гэта сапраўды вясна. Ён схапіўся і хуценька пабег за вёску ў лясок. У яго галоўцы было адно пытанне, адна думка. Ці праўда, што вясна прыйшла?

Вось ужо і лясок. Пераскочыў Янка невялікі роў. І спыніўся сярод шэрых, голых яшчэ кустоў ляшчыны.

Глянуў на зямлю, і з вуснаў яго сарваўся крык радасці:

— Ёсць, ёсць!



Сярод леташняга лісця аж зіхацелі сінія пралескі. Жоўтыя іх вочкі радасна выглядалі паміж сіненькіх пялёсткаў. Янка пусціўся бегчы дамоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Убачыўшы бацьку, які стаяў каля варот, ён голасна крыкнуў:

— Тата, тата! Закрасавалі пралескі, прыйшла вясна!

*(Паводле Зоські Верас)*

**Неспадзява́на** — *тут*: нечакана.
**Адры́на** — збудаванне для захавання сена.

1. Як змянілася надвор’е пасля дажджлівых дзён?
2. Як выглядала траўка? Агрэст? Вярба? Знайдзіце адказы ў другім абзацы.
3. Назавіце першых птушак.
4. Чаму Янка пабег у лясок? Што правяраў?
5. Што ўбачыў хлопчык пад кустамі? Апішыце кветку па фотаздымку і тэксце.
6. Што было для Янкі доказам вясны?
7. Прачытайце падкрэсленыя словы. Які настрой тэксту яны ствараюць? Радасны, пяшчотны? Строгі, сур’ёзны?
8. Якія колеры вясны вы можаце назваць?
9. Перакажыце тэкст па частках, а пасля цалкам.

### Вясёлая песня

Жаўранак узвіўся
ў паднябессе*
і звініць
вясёлым ручаём,
бачыць ён —
успыхвае на ўзлессі
лісцейка
зялёным аганьком.

Жаўранак віецца
вышай, вышай.
Зверху, бы стажок,
відаць сасна.
Ходзіць лесам
вечаровай цішай
з песнямі
вясёлая вясна.



*(Авяр’ян Дзеружынскі)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Паднябе́ссе** — *тут*: высока; пад самае неба.

1. Прачытайце верш. Які яго настрой?
2. Знайдзіце параўнанні і дапоўніце: *жаўранак звініць, як ...; лісцейка ўспыхвае, як ...; сасна, як ...* .
3. Знайдзіце словы, што адказваюць на пытанні *які*? *якая*?
4. Прачытайце выразна. Перадайце радасны настрой верша.
5. Вывучыце верш на памяць.

## Добры дзень, вясна!

Добры дзень, мая вясна!
Добры дзень, чаканая!
Добры дзень, вясна-ясна!
Добры дзень, жаданая!

Заспявалі ручаіны,
сонейка заззяла.

Пад крылом зямля
буслінымм
так цябе чакала.
І нябёс празрыстых далеч*,
і бяроз малеча*
так цябе, вясна, чакалі,
выбеглі на стрэчу.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзе знайсці такія словы?
Іх шукаць не варта*.
Уся зямля ў адзенні
новым
з тонкіх нітак жартаў.

І алешыны галіны
цягнуцца да сонца.
Свет вясёлы, гаманлівы,
будзь жа ты бясконца!

*(Аксана Данільчык)*

**Да́леч** — далечыня.
**Мале́ча** — *тут*: маладыя дрэўцы.
**Не ва́рта** — не трэба.

---

1. Каго вітаюць у вершы? Якая тэма твора?
2. Як называюць вясну? Прачытайце.
3. Хто як чакаў вясну? Чытайце па слупках. Пераказвайце змест сваімі словамі.
4. Знайдзіце з дапамогай настаўніка адпаведныя пытанню словы: *крылом (якім?) ..., нябёс (якіх?) ..., адзенні (якім?) ..., свет (які?) ...* . Ці прыгожую карціну ствараюць гэтыя словы?
5. Прачытайце выразна, адпаведна знакам прыпынку. Пакажыце, як вы вітаецеся з вясной.

---

### Гульня «Падбярыце гукі вясны»

| | |
|---|---|
| Ручай | *лопаюцца* |
| Жаўранак | *гудзе* |
| Пупышкі | *булькоча* |
| Вада з ледзяша | *шуміць* |
| Вецер | *ка́пае* |
| Трактар | *спявае* |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Мамін дзень

Сонца ў небе ззяе,
снег з палёў зганяе.
Па зямлі вясна ідзе...
Сёння свята — мамін дзень.
Маму я сваю люблю,
ёй прыемнае зраблю:
прыбяру ў кватэры,
вытру вокны, дзверы,
посуд чыста ператру,
пасцялю на стол абрус,
вазу з кветкамі пастаўлю.
Маму шчыра прывітаю:
пажадаю роднай
шчасця і здароўя,
бо няма нідзе такой —
блізкай, сэрцу дарагой!

*(Хведар Жычка)*

1. Прачытайце. Якая назва верша?
2. Які дзень называюць маміным? Калі яго адзначаюць?
3. Які падарунак зробіць дзіця? Прачытайце.
4. Дайце адказ словамі верша, чаго жадае дзіця маме.
5. Як вы рыхтуецеся да свята мам? Якія падарункі зробіце? Падзяліцеся з класам.
6. Паразважайце, якія падарункі для мам даражэйшыя: купленыя ў краме рэчы або падзяка і добрыя справы дзяцей.

У Беларусі мам ушаноўваюць двойчы на год. Восьмага сакавіка — у Міжнародны жаночы дзень. І 14 кастрычніка — у Дзень маці.

## Пільная варта

Некалі тут быў лес. Але яго высеклі, пакінуўшы толькі хмызняк ды валежнік*. На гэтай паляне аблюбавалі* мы месца для пабудовы жытла.

...Праз два гады расчысцілі зямлю ад пнёў і пачалі жыць ды радавацца. Усё расце добра, паветра чыстае. Але адна



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

бяда: на ўсіх гародах у нашых навасёлаў вялікая колькасць розных агародных шкоднікаў. У некаторых столькі вусеняў, што людзі сем'ямі выходзяць збіраць іх. Збіраюць рукамі, пасыпаюць усякай атрутай*.

Пытаюцца суседзі:

— А як у вас?

Мы адказваем, што ў нас няма ніякіх чарвякоў. Суседзі гавораць:

— Вы, мабыць, нешта робіце. Навучыце нас.

Мы гаворым, што рабіць нічога не робім. Нічым не пасыпаем, апрача толькі як попелам чыстым... Не вераць нам ды ўсё. А быў на нашай сядзібе адзін кавалачак яшчэ недакарчаваны.

Раслі там дзве-тры ялінкі ды пара кусточкаў бружмелю*. Адным словам — тое-сёе. І стаяў тут невялікі мурашнік. Жывуць мурашкі, бегаюць скрозь па нашым агародзе. Аднаго разу нават жонка занепакоілася, паклікала мяне:

— Ідзі глянь, нешта дужа па гурках разбегаліся мурашкі.

Падышоў я, пастаяў з паўгадзіны — бегаюць, нешта шукаюць. Але гуркоў тых зусім не кранаюць. А побач — капуста наша. Пры мне сеў матылёк-капуснік і паклаў, мабыць, паўсотні ці сотню яечак. Такія, як макавыя зярняткі, толькі жоўтага колеру. Глядзім мы з жонкаю на гэту лісціну ды разважаем:

— Дзе ж ты пераможаш тых чарвей! Праз некалькі дзён з яечак з'явіцца сотня вусеняў.

Пакуль мы так з ёй разважалі, бачым — на лісціну ўзбягаюць чарадой мурашкі. Ну нібыта ім нехта тэлеграму адбіў: «Гайда сюды, яечкі падрыхтаваны!» Праходзяць



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

мурашкі адна за адной і яечкі забіраюць, забіраюць. Не прайшло і пяці мінут — ніводнага не засталося.

— Век жыві, век вучыся, — кажа жонка. — Ну адкуль жа ў нас могуць быць на агародзе чэрві, калі самыя яечкі мурашкі адразу забіраюць?

Мы яшчэ падумалі тады, што для мурашкі матыльковае яечка куды большае, чым, скажам, для нас курынае.

Так мы і жылі без клопату колькі гадоў, маючы такіх выдатных памочнікаў і вартаўнікоў на сваім агародзе. Сказалі мы суседзям пра свае нагляданні. Параілі і ім завесці мурашнікі на агародзе.

*(Паводле Уладзіміра Дубоўкі)*

**Вале́жнік** — *тут*: ламачча, паваленыя дрэвы.
**Аблюбава́лі** — *тут*: выбралі, нагледзелі.
**Атру́та** — ядавітае рэчыва.
**Бружме́ль** — ягадны куст (*рус.*: жимолость).

---

**1.** Прачытайце. Якая тэма гэтага твора?
**2.** Якое месца спадабалася людзям пры пабудове дамоў?
**3.** Што расло на агародах? Як вялі барацьбу са шкоднікамі?
**4.** Чаму ў адной сям’і не было шкоднікаў на агародзе? Хто ў гэтым дапамог?
**5.** Што параілі гаспадары сваім суседзям? Знайдзіце ў тэксце.
**6.** Чаму Уладзімір Дубоўка даў назву апавяданню «Пільная варта»? Абмяняйцеся думкамі.
**7.** Успомніце з урокаў «Чалавек і свет», хто яшчэ ратуе агароды і сады.
**8.** Паразважайце, што сталася б з мурашкамі, калі б гаспадары выкарыстоўвалі атруту. Ці змаглі б мурашкі ўратаваць агарод?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Гасцінец

Ёсць у мяне ў лесе адна любімая палянка. А на гэтай палянцы быў сухі пянёк, вельмі падобны на табурэт. Не адну вясну я на ім сустрэў, не адну восень праводзіў. Насупраць гэтага пянька стаіць асінка, уся падзяўбаная дзятламі.

Вось сяджу я неяк веснавым днём на сваім пні і лясную гамонку слухаю. Дыхаю водарам* раслін, што абудзіліся ад зімовага сну.



Раптам на асінку попаўзень сеў. Спінка ў птушкі блакітная, брушка светлае, зграбны куртаты хвосцік. У дзюбцы, бачу, птах трымае лясны арэх. Вось ён спрытна ўторкнуў яго ў шчыліну ў кары і на мяне цікаўна пазірае. Быццам сказаць хоча: во, гасцінец табе прынёс. Бяры яго, вельмі смачны.

Птушка тоненька ціўкнула і знікла ў лесе.

— Ну і попаўзень, ну і штукар! — падзівіўся я. — І дзе ён яго толькі знайшоў цяпер, вясной?!

Я ўзяў гасцінец. Не арэх, а цуд — буйны́ такі, важкі*. Так і хочацца пакласці на зубы.

Пакруціў я гасцінец у пальцах ды назад у шчыліну паклаў. Каб гэта восенню, дык можна было б з'есці. Ці ж мала іх у лесе. А зараз, вясною, калі ў звяроў і птушак усе запасы канчаюцца, нельга. Гэта ж для птаха сапраўдная знаходка. Няхай птушка лепей сама яго спажыве.

*(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

**Во́дар** — прыемны пах.
**Ва́жкі** — *тут*: моцны, адчуваецца яго вага.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Ад чыйго імя вядзецца гаворка?
2. Куды хадзіў адпачыць апавядальнік? На якім пяньку сядзеў?
3. Якую птушку ўбачыў? Апішыце попаўзня па фотаздымку і тэксце.
4. Што прынесла птушка? Куды схавала арэх?
5. Ці забраў арэх чалавек? Чаму? Для каго арэх — гасцінец?
6. Як можна назваць гэтага чалавека? Ці з'яўляецца ён сапраўдным сябрам прыроды? Падзяліцеся думкамі.

## Па-над белым пухам вішняў...

Па-над белым пухам вішняў,
быццам сіні аганёк,
б'ецца, уецца шпаркі*, лёгкі
сінякрылы матылёк.



Навакол усё паветра
ў струнах сонца залатых, —
ён дрыжачымі крыламі
звоніць ледзьве чутна ў іх.

І ліецца хваляй песня, —
ціхі, ясны гімн вясне.
Ці не сэрца напявае,
навявае яго мне?

*(Максім Багдановіч)*

**Шпáркі** — хуткі.

1. Прачытайце. На якую тэму гэты верш?
2. Якая пара года апісана ў вершы? Знайдзіце доказы ў тэксце.
3. З чым параўноўваецца матылёк? Знайдзіце яго апісанне.
4. Якія гукі вясны чуюцца ў прыродзе?
5. Якія колеры выкарыстаў паэт для апісання вясны?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

6. Якое надвор’е вы ўявілі, чытаючы верш?
7. Праслухайце песню «Па-над белым пухам вішняў» на музыку Ігара Паліводы. Ці супадае ваш настрой і настрой песні?

## Як птушкі вучыліся будаваць гнёзды

*Казка*

### 1



Гэта было даўно, калі птушкі яшчэ не мелі гнёздаў. На вялікім дрэве сабраліся аднаго разу сава, варона, верабей, ластаўка. У ляску пад дрэвам грэбалася курыца. Жар-птушка ўбачыла сваіх сяброў-бязгнёзднікаў* і наважылася навучыць іх будаваць гнёзды.

Прысела да іх на галінку і прамовіла:

— У кожнай з вас павінна быць гняздо. Але навучыцца будаваць яго — няпроста. Як і ўсякая навука, гэта патрабуе шмат цярплівасці, увагі. Інакш нічога не выйдзе.

Але не даказала яна гэтыя словы, як курыца пачала торкаць носам і тут жа заснула.

Сава, вылупіўшы круглыя жоўтыя вочы, сонна пазірала на жар-птушку. «Задужа стракатае пер’е ў гэтай



жар-птушкі і занадта прыгожы голас. Хіба такая красуня можа чаму-небудзь навучыць? Дарэмна я прыцягнулася сюды». І яна гучна зарагатала. Совы заўсёды рагочуць, калі ім што-небудзь не падабаецца. І адляцела.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З тых часоў і перабіваецца сава — днём спіць дзе-небудзь у дупле, а ўначы сядзіць на галіне. А гнязда так і не ўмее рабіць.

**Бязгнёзднікі** — птушкі, якія не ўюць гнёздаў.

1. Да якой групы адносіцца гэта казка?
2. Якія птушкі прысутнічалі на вучобе?
3. Чаму вучыла іх жар-птушка?
4. Як слухалі яе птушкі-бязгнёзднікі?
5. Хто першым пакінуў урок? Ці навучылася чаму-небудзь сава?

**2**

А жар-птушка тым часам казала:

— Перш чым будаваць гняздо, трэба падумаць, дзе яго будаваць. Добра выбраць на дрэве галіну з трыма развілкамі. Потым назбіраць дубчыкаў* і, памагаючы сабе дзюбаю і лапамі, сагнуць іх, адзін на адзін...

Пачуўшы гэта, варона сказала сама сабе: «Дык гэта ж зусім проста. Такіх развілак на дрэвах колькі хочаш». Варона лічыла сябе самаю разумнаю і была рада, што яна першая ўцяміла*, што такое гняздо.

І тут жа пракаркала:



— Кра-кра! Усё залежыць толькі ад моцнай дзюбы і ўчэпістых лап. Кра-ўрра! У мяне будзе цудоўнае гняздо. Больш мне і слухаць не трэба. Я ўсё і так ведаю!

І, каркнуўшы яшчэ раз, яна адляцела.

З тае пары варона робіць сабе гняздо. Але якое гэта гняздо! Тоўстыя дубцы тырчаць з яго на ўсе бакі, вецер прадзімае яго наскрозь, дождж палівае яго зверху!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А жар-птушка тлумачыла далей:

— Гняздо можна, але зусім неабавязкова будаваць на развілцы галін. Яшчэ лепш звіць яго пад страхою хаты, дзе не будуць страшныя ні дождж, ні снег...

Мітуслівы* верабей, які не мог уседзець на адным месцы і ўсё пераскокваў з галінкі на галінку, тут не ўтрымаўся. «Вось і добра, — падумаў ён. — Палячу хутчэй, каб гэтыя птушкі не занялі ўсё падстрэшша*».



І ён пырхнуў, нават забыўся чылікнуць на развітанне.

Так і жыве з таго часу верабей дзе-небудзь у шчылінах на падстрэшшах ці паддашках*.

**Ду́бчык** — пруток.
**Уця́міць** — *тут*: зразумець.
**Мітуслі́вы** — неспакойны, непаседлівы.
**Падстрэ́шша, падда́шак** — месца, дзе дах навісае над сцяной.

1. Ці ўважлівай вучаніцай была варона? Ці даслухала яна ўрок?
2. Чаму яе гняздо нязручнае і непрывабнае?
3. Як паводзіў сябе верабей? Ці навучыўся ён будаваць гняздо?
4. Чаму ён зімуе пад страхой?

### 3

Але жар-птушка яшчэ не скончыла:

— Пасля таго як выбрана месца і дубчыкі звіты, трэба прынесці ў дзюбе гліны і як след замазаць усе шчыліны.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Потым трэба паслаць усярэдзіне сухой травы і мяккага пуху. Вось тады і будзе цудоўнае жыллё.

Жар-птушка змоўкла. Маленькая ластавачка, якая даслухала яе да канца, падзякавала і паляцела. Адляцела і жар-птушка.

Толькі курыца мірна спала і нічога не чула. Праз нейкі час яна прачнулася і сказала:

— Я, здаецца, трошкі задрамала. Але ж ці трэба ўмець віць гняздо, тлуміць галаву рознаю навукаю? Ці не лепш жыць на гатовым?

Так курыца і дагэтуль не ўмее віць гнязда: месціцца на седале* ў куратніку, які будуюць для яе людзі.

Толькі ластаўка, адна з усіх птушак, цярпліва і ўважліва слухала ўсё, што казала жар-птушка. І яна ўмее віць сапраўднае гняздо.



Гняздо ластаўкі знадворку аблеплена глінаю, усярэдзіне выслана сухою травою і мяккім пухам. Яму не страшныя ні дождж, ні вецер, і птушаняткам яе цёпла і ўтульна.

*(З народнага)*

**Се́дала** — *тут*: месца ў куратніку, жэрдачка, дзе сядзяць куры.

1. Якая з птушак была самай уважлівай і цярплівай? Чаму толькі ластаўка навучылася рабіць сапраўднае гняздо?
2. Як ластаўка ўе гняздо? Раскажыце.
3. Ці мае гняздо курыца? Чаму? Ці можна яе лічыць старannай вучаніцай?
4. Чаго патрабуе ўсякае вучэнне?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**5.** Прачытайце казку па ролях.

**6.** Якія адмоўныя якасці людзей высмейваюцца ў гэтай казцы? Да каго б вы хацелі быць падобнымі? А да каго — не? Якія птушкі могуць стаць прыкладам для людзей?

**7.** Зрабіце з дапамогай дарослых інсцэніроўку казкі.

## Жаваранкі над Хатынню**

*Урывак з аповесці*

### 1

Немцы ўсіх сагналі ў прасторнае гумно*. Зачынілі дзверы, аблілі заднюю сцяну бензінам і падпалілі. Калі загарэўся саламяны дах і на галовы пасыпаліся іскры, людзі зразумелі, што іх паляць жывымі. Усе кінуліся да дзвярэй. Лёкса з маці аказаліся прыціснутымі да сцяны. Адэля моцна трымала сына за руку. Полымя разгаралася, і ўжо нельга было дыхаць — пякло паветра. Плакалі дзеці, галасілі бабы, крычалі мужыкі. Вось-вось упадзе на іх галовы палаючы дах... І тады ў гэтым страшэнным пекле некалькі жанчын усё ж здолелі акружыць сваіх дзяцей, запіхнуўшы іх у самую сярэдзіну, і прыкрылі іх сабою... Нават у такую хвіліну яны спадзяваліся на тое, што дзеці застануцца жывымі.

Немцы пачалі страляць з аўтаматаў у зачыненае палаючае гумно. Закрычалі параненыя, забітыя наваліліся сваімі целамі на жывых. А агнём ужо ўзялося ўсё! Тады мужчыны з усяе сілы націснулі на дзверы, але тыя не паддаваліся. І раптам быццам чыясьці рука адчыніла знадворку завалу*!.. Дзверы паваліліся разам з людзьмі, жывымі і мёртвымі. Тыя, хто мог, уставалі на ногі і, ахопленыя полымем, тут жа падалі, скошаныя кулямі. Адэлю і Лёксу вынесла з палаючага гумна натоўпам. Ім удалося ўстаяць



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

на нагах, і яны кінуліся бегчы. А немцы ўсё стралялі. Адэля ўпала, пацягнуўшы за сабой Лёксу...

**Гумно́** — *тут*: збудаванне для сена ці збожжа.
**Зава́ла** — клямка, замок.

1. Калі адбываліся гэтыя страшныя падзеі? Дзе?
2. Куды сагналі людзей немцы? Якое злачынства ўчынілі?
3. Як жанчыны хацелі ўратаваць сваіх дзяцей?
4. Як ратаваліся людзі з палаючага гумна?
5. Што рабілі немцы? У каго стралялі?

**2**

Доўга хлопчык так ляжаў, не варушыўся, слухаючы стрэлы, крыкі, трэск агню. Раптам стала ціха — абваліўся дах, і адразу скончыліся нечалавечыя пакуты няшчасных. Адэля не варушылася. Лёкса ціха паклікаў:

— Мама!

Адэля не азвалася. Лёкса ляжаў, прыціснуты яе целам. Анямела рука. Ён яшчэ раз паклікаў:

— Мама!

Адэля маўчала. На ёй тлела* адзежа. Лёксу стала страшна. Ён выбраўся з-пад цела маці, адпоўз убок і страціў прытомнасць.

Немцы хадзілі і дабівалі тых, хто быў яшчэ жывы. Адзін падышоў да Лёксы, пхнуў яго ботам і, вырашыўшы, што хлопчык нежывы, адышоўся. Доўга яшчэ не сціхала страляніна...

Палала Хатынь. Чорна-барвовым было над ёй неба, а наўкол застылі сосны ў глыбокай жалобе, моўчкі глядзелі на страшнае злачынства...

**Тле́ла** — дагарала, дымілася.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Ці ўдалося людзям уратавацца?
2. Што рабілі немцы з параненымі і абгарэлымі людзьмі?
3. Якім цудам застаўся жывы хлопчык? Хто яго ўратаваў?
4. Прачытайце апошнія два радкі. Як прырода глядзела на злачынства людзей?

### 3

Прайшло дваццаць шэсць гадоў пасля пажару. І над хатынскім лесам зазванілі званы.

Дзін-дон!..

Звоняць званы, быццам папярэдзіць хочуць тых, хто жыве сёння, пра магчымасць новай вайны...

Хто б ты ні быў, мой чытач, калі прыйдзеш у Хатынь, пакінь свае кветкі на магільнай пліце, а сам прысядзь. Прысядзь, адпачні пасля дарогі і паглядзі на неба, паслухай жаваранкаў. Хатынскія жаваранкі спяваюць не так, як другія. Пра што яны спяваюць?.. А ты паслухай, падумай — і сэрцам пачуеш іх песню: «Людзі добрыя, помніце: мы любілі жыццё, і Радзіму, і вас, дарагія. Мы згарэлі жы-





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вымі ў агні. Наша просьба да ўсіх: беражыце мір! Каб нідзе і ніколі ў віхуры пажараў жыццё не ўмірала!»

Дзін-дон!.. Усё гэта было на свеце! Людзі добрыя, помніце! Помніце! Помніце!

*(Паводле Алены Кобец-Філімонавай)*

1. Што цяпер знаходзіцца на месцы спаленай вёскі? Разгледзьце фотаздымкі.
2. Па кім звоняць званы? Аб чым яны нас папярэджваюць?
3. Пра што пяюць хатынскія жаўранкі? Прачытайце.
4. Да чаго заклікае аўтар? Што мы павінны помніць?

## Бусел над Хатынню

Закружыўся над Хатынню бусел
сонечна-пагодлівай вясной:
каміны* стаяць. І людзі ў скрусе*.
А нідзе хаціны ні адной.

Заміраюць галасы людскія,
гукі абуджальнае вясны,
і плывуць трывожныя такія,
тонкія жалобныя званы...

*(Паводле Васіля Жуковіча)*

**Каміны́** — печы з трубамі.
**У скру́се** — у жалобе, у горы.

1. Што бачыць бусел над Хатынню цяпер, у мірны час?
2. Аб чым трывожна звіняць званы?
3. Чаму тут змаўкаюць людзі? Які настрой у людзей?
4. У вольны час разам з дарослымі наведайце з экскурсіяй Хатынь.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Два полі

Было ў салдата два полі:
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён ваяваў.

Два полі было ў салдата.
Адно зелянела травой.
Другое было ўзарата
вайной і паліта крывёй.

Ціха было і чыста
ў полі яго дзяцінства,
былі агонь і дым
на полі ратным* тым.

Было ў салдата два полі:
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён паміраў.

*(Анатоль Вярцінскі)*

**Ра́тнае по́ле** — поле бітвы.

1. Прачытайце. На якую тэму гэты верш?
2. Каму ён прысвячаецца? Які настрой твора?
3. Што было ў дзяцінстве салдата? Прачытайце радкі з верша.
4. Якое было поле, калі гулялі і рвалі кветкі хлапчукі?
5. Што сталася з полем у вайну? Прачытайце.
6. Параўнайце першы і апошні слупок. Якім словам яны адрозніваюцца? Што стала з салдатам?
7. Прачытайце выразна. Перадайце смутак аб загінулым салдаце.
8. Вывучыце верш на памяць.

## У апошнія дні вайны

### 1

На борце ваеннай машыны, накрытай брызентам, стаяў чорны даўганогі певень і раз-пораз спяваў.

Раптам з-пад машыны вытыркнулася* галава і гукнула:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



— Паветра!

Певень папярхнуўся і палез хавацца пад брызент.

Усе засмяяліся. Певень, відаць, добра засвоіў гэту салдацкую каманду, якую падаюць у часе налёту фашысцкіх самалётаў. Цяпер яго спрытна падманулі на яе: у небе не было ніводнага нямецкага самалёта.

Прыкладна год назад сяржант Даўмейка праязджаў цераз спаленае паселішча і спыніўся памяняць кола. Жыхароў там не было. Калі Даўмейка падышоў да ручаіны апаласнуць рукі, з кустоў пачулася ціхае кохканне. Там сядзеў певень. Ён быў зусім знясілены і не мог уцякаць. Даўмейка ўзяў птушку на рукі, накарміў з далоні хлебам, адпаіў вадою і — прыхапіў з сабою. Певень акрыяў* і хутка прызвычаіўся да ўсіх прыгод паходнага жыцця. Нават навучыўся хавацца разам з салдатамі пры воклічы «Паветра!»



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Заеду зараз туды, — усміхнуўся сяржант. — Можа, гаспадары вярнуліся. Няхай бяруць на развод. Трэба ж з нечага гаспадарку пачынаць.

**Вы́тыркнулася** — высунулася.
**Акрыя́ць** — паправіцца, ачуняць.

1. На якую тэму гэты твор?
2. Пра якія ваенныя звычкі пеўня расказваецца?
3. Як певень трапіў да салдат?
4. Як птушка прызвычаілася да паходнага жыцця? Якую каманду навучылася выконваць?
5. Куды хацеў вярнуць пеўня салдат?

## 2

Мне ўжо даводзілася чытаць у партызанскіх часопісах пра тое, як свойскія жывёлы сыходзілі з дому. Калі ў адну вёску з'яўляліся немцы, адтуль адразу ж знікаў сабака. Ён бег кіламетраў за трыццаць да гаспадынінай сястры. Там ужо ведалі, што здарылася. І неадкладна паведамлялі партызанам. За гэту міжвольную паслугу сабаку шанавалі і стараліся лепей накарміць. Дзіўней за ўсё тое, што сабака дакладна ведаў, калі мінецца небяспека, і толькі тады кіраваўся дадому.

Чытаў я нешта падобнае пра пеўня, які з прыходам немцаў уцякаў у лес і сядзеў у гушчарніку на высокай галіне.

А вось такі выпадак давялося пабачыць на ўласныя вочы. Праз некалькі дзён пасля вызвалення Мінска немцы апошні раз наляцелі бамбіць горад. На шчасце, усё для нас абышлося добра. Потым мы сядзелі на бярвенцах і размаўлялі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Непрыкметна найшла хмара і ўдарыў гром. Калмаценькі сабачка падціснуў хвост і кінуўся ў садовы бункер. Там звычайна хавалася ўся сям'я падчас ваенных нягод. Пабачыўшы, што ніхто не бяжыць туды, сабака вярнуўся і вінавата памахаў хвастом.

— Ай-яй, Жучок! — сказала гаспадыня. — І не брыдка табе: забыўся, як гром грыміць!

А мы стаялі на роднай зямлі, слухаючы далёкія раскаты, ад якіх і сапраўды пачалі адвыкаць за тры доўгія гады.

Лінуў дождж, прыйшоў час расці жыту і траве.

*(Паводле Максіма Лужаніна)*

1. Раскажыце пра ваенныя звычкі жывёл з гэтай часткі твора.
2. Як сабака даносіў у іншую вёску звесткі пра ворага?
3. Як прызвычаіўся певень уцякаць ад фашыстаў?
4. Чаму Жучок, пачуўшы гром, пабег у бункер?
5. Якая з гісторый вам запомнілася больш? Чаму?
6. А ў вас ёсць хатнія жывёлы? Якія? Ці ёсць у іх свае звычкі? Раскажыце.

Падчас вайны дадзеныя разведкі перадавалі паштовыя галубы. Ім на спіну прымацоўвалі маленькую скрынку з паперамі. Птушкі дастаўлялі данясенні на адлегласць да тысячы кіламетраў. Яны ўратавалі шмат чалавечых жыццяў. Немцы трэніравалі драпежных ястрабаў паляваць на паштавікоў. Так што служба ў галубоў была небяспечная. Пасля вайны птушкам былі пастаўлены помнікі ў многіх краінах Еўропы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Май



Май урачысты,
май пераможны —
самы квяцісты,
самы прыгожы.

Жыта кусціцца,
промні іскрацца,
рэчка бруіцца*,
птушкі гняздзяцца.

Сонейка свеціць
ярка над краем.
Мілыя дзеці,
вітаем вас з Маем!

*(Юрась Свірка)*

**Бруі́цца** (рэ́чка) — льецца, булькоча.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Прачытайце верш. На якую ён тэму?
2. Які настрой мая перадае верш?
3. Прачытайце верш па слупках. Пра што ў кожным расказваецца?
4. Гэты верш пра мір ці пра вайну?
5. Чаму май называюць урачыстым і пераможным? Якое гэта свята? Хто каго перамог?
6. Вывучыце верш на памяць.

Наведайце разам з дарослымі салют увечары 9 Мая. Скажыце «дзякуй!» тым людзям, якія прынеслі мір на нашу зямлю.

**А хіба ёсць, што забываюць?**

Ляжыць салдат ля пераправы*,
каля маленькае ракі.
Ляжыць салдат
вялікай славы,
крывёй здабытай на вякі.

Шуміць над ім гушчар зялёны,
плывуць аблокаў караблі.
Ён паў,
пазбавіўшы палону*
вось гэты кут сваёй зямлі...

Ляжыць і сніць ён аб народзе,
якому шчасце вольна жыць!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

І рады ён, калі прыходзяць
хоць зрэдку з ім пагаварыць,

калі сцяжыначка малая
не зарастае да яго...
А хіба ёсць, што забываюць
выратавальніка* свайго?

*(Паводле Петруся Броўкі)*

**Перапра́ва** — месца, дзе перапраўляюцца на другі бераг.
**Пало́н** — захоп ворагамі.
**Выратава́льнік** — *тут*: вызваліцель.

1. Прачытайце. На якую тэму гэты верш?
2. Дзе загінуў салдат?
3. За што змагаўся салдат? Як набліжаў перамогу?
4. Як захоўваюць памяць загінулых пасля вайны? Ці зарастае сцежка да помнікаў героям?
5. Якім пытаннем заканчваецца верш? Што вы на яго адкажаце?

## Плошча Перамогі

І ў будні дзень, і ў радаснае свята
сюды, да плошчы, шмат дарог вядзе.
Тым, што загінулі ў баях, салдатам
народ вянкі да помніка кладзе!

*(Паводле Анатоля Астрэйкі)*

1. Куды прыходзяць людзі ўшанаваць памяць загінулых?
2. Што кладуць да помніка?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



3. Дзе знаходзіцца плошча Перамогі?
4. Якія помнікі ёсць у вашай мясцовасці?
5. Даведайцеся ў дарослых, колькі людзей загінула падчас вайны.

Падчас свята Перамогі заўсёды ўшаноўваюць памяць герояў-вызваліцеляў. Арганізуюць хвіліну маўчання. Гэта традыцыя існуе ўжо больш за сто гадоў. У гэтую хвіліну ўсе прысутныя ўспамінаюць тых, хто загінуў на вайне, смуткуюць і не гавораць ні слова. Так людзі выказваюць павагу да подзвігу салдат.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Назавіце раздзел, з творамі якога вы знаёміліся. Звярніцеся да «Зместу» ў канцы дапаможніка.
2. Назавіце вершаваныя творы гэтага раздзела. Якой тэмай можна аб'яднаць вершы «Веснавыя ручайкі» Віктара Гардзея і «Вясёлая песня» Авяр'яна Дзеружынскага?
3. Пра што гаворыцца ў творы «Прыйшла вясна» Зоські Верас? Якія кветкі ўзгадваюцца ў апавяданні?
4. Якое веснавое свята называюць маміным? А восеньскае? Раскажыце, што вы ведаеце пра гэтыя святы. Прачытайце або раскажыце верш пра іх.
5. Што новага вы даведаліся пра зайцаў? З якога твора? Назавіце яго аўтара.
6. З якога апавядання гэтыя словы: «Сказалі мы суседзям пра свае назіранні, параілі і ім завесці мурашнік на агародзе»? Хто яго аўтар?
7. Да якой групы казак можна аднесці казку «Як птушкі вучыліся гнёзды будаваць»? Якія людскія недахопы паказаны ў гэтай казцы? Чаму яна вучыць?
8. На якую тэму творы «Два полі» Анатоля Вярцінскага, «Бусел над Хатынню» Васіля Жуковіча і «А хіба ёсць, што забываюць?» Петруся Броўкі?
9. Назавіце майскія святы. Якое свята называюць урачыстым і пераможным? Калі яго святкуюць?
10. Якія з твораў гэтага раздзела вам запомніліся? Чым?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



# ПРЫХОДЗІЦЬ ЛЕТА ЗВОНКАЕ

## Залатая пара**

Летам усюды зялёны прастор і прыгажосць.

У полі бушуе жыта. Коцяцца пад лёгкім павевам ветрыку зялёныя хвалі. Коцяцца, і няма ім ні канца, ні краю. Раптам над гэтым жытнёвым морам падымаецца сівы лунь-мышалоў. Міжволі здаецца табе, што гэта сапраўды мора, у якім дзесьці на небасхіле* праплывае малюсенькі паруснік.



Узлесак і паляны патанаюць у белых карунках рамонкаў. Цешацца ў бірузе* лугавога льну і браткоў, у тонкім переразвоне ліловых* званочкаў.

Хораша летам і на лузе. Сухое паветра настоена на тонкім водары ружовай смолкі, на мядовым паху канюшыны...

Хораша гэтай парой паляжаць у цяньку дрэў або асвяжыцца ў рэчцы. Але яшчэ больш прыемна прабрацца на світанні да азярца і бясшумна закінуць у ваду вуду. Закінуць і моўчкі любавацца, як лёгкі паплавок далікатна* пачне раскланьвацца...

Вось з-за лазняку* выглянула велізарнае чырвонае сонца. Пасля яно падымаецца над лугамі, і ўсё навокал



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

раптам паплыве ў нейкім казачным тумане. І ты сам тады з вудай у руцэ, здаецца, плывеш у бязмежную рухомую далячынь...

Лета! Залатая пара...

*(Паводле Рыгора Ігнаценкі)*

**Небасхі́л** — гарызонт.
**Біруза́** — *тут*: блакітна-зялёны колер.
**Ліло́вы** — фіялетавы.
**Даліка́тна** — асцярожна, пакрысе.
**Лазня́к** — зараснікі лазы.

---

1. Прачытайце. Якая тэма гэтага твора?
2. Якую пару года называюць залатой? Ці толькі лета? Чаму?
3. Як апісана жытнёвае поле? Прачытайце першы абзац.
4. Скажыце словамі з тэксту, якія былі палі, лугі, узлескі.
5. Складзіце разам з настаўнікам план тэксту-апісання.
6. Перакажыце тэкст па плане.
7. Раскажыце, за што вы любіце лета.

### Летнім днём

І рана ўстаць мы ўмеем
самі,
і знаем сцежкі нацянькі*
ў светлы лес, дзе між дубамі
чакаюць нас баравікі.

Дзень добры вам,
лясы-дубровы,
і гулкі бор, і хмызнячок.
Паклон табе, рудагаловы*
крамяны друг — баравічок!

*(Кастусь Кірэенка)*

**Нацянькі́** — напрасткі; кароткая дарога.
**Рудагало́вы** — грыб з рудым капелюшом, каласавік.

---

1. Прачытайце верш. Гэты твор пра прыроду ці грамадства?
2. Куды раненька ідуць дзеці? Што іх чакае?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Як дзеці вітаюць лясы-дубровы? Знайдзіце ветлівыя словы.
**4.** Які настрой перадаецца ў вершы?
**5.** Вывучыце верш на памяць.
**6.** Ці былі вы ў лесе летнім днём? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі.

Перад паходам у лес апранаюць высокія шкарпэткі. Яны засцерагуць ад кляшчоў, што хаваюцца ў траве. Выбіраюць абутак, які не прамакае і які не зможа пракусіць змяя. На галаву завязваюць хустку. Або надзяюць кепку ці капюшон, каб за каўнер не сыпалася ігліца. Кашулю, кофту апранаюць доўгую, каб не заставалася адкрытая спіна.

### У грыбах**

Два браты, васьмігадовы Алесь і дзесяцігадовы Пятрусь, прасілі маці пабудзіць іх рана-рана. Каб заўтра зранку, да ўзыходу сонца зайсці ў лес. Хлопцы надумаліся пайсці ў грыбы. З вечара падрыхтавалі лапці, кошыкі і залезцы*, каб адразаць карэньчыкі баравікам. Прыгатаваўшы ўсё як мае быць, хлопцы павячэралі і ляглі спаць. Спаць не хацелася. Чорныя баравікі так і стаялі ў іх вачах. А назаўтра, чуць толькі пабляднелі на небе зоркі, хлопцы ўжо выйшлі з дому.



Да лесу было вярсты* чатыры. Свежае, чыстае паветра раніцы прымушала хлопцаў паскорыць крок. Ім хацелася хутчэй зайсці ў лес.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А слаўна-такі ўстаць да сонца! Прырода толькі прачынаецца ад кароткага летняга сну. Дзень занімаецца. Над лесам і полем яшчэ ляжыць цемната. Тонкі белаваты туман ціха ўздымаецца над лугам. Неба на ўсходзе чырванее. Раннія жаваранкі затрапяталі ў небе крыльцамі. І ўжо льецца іх вясёленькая песня. Хлопцы ўвайшлі ў лес. Верхавіны хвой ужо залаціліся першымі промнямі сонца. Хвоі стаялі ціха, не варушыліся. Недзе высока звінелі мошкі. Птушкі шчабяталі на ўсе лады. Спяваў дрозд. Пераклікаліся сойкі. Стукаў дзяцел па дрэве сваім крэпкім дзюбам. Далёка-далёка, у гушчары яловага лесу, чуваць голуба.

Па дарозе хлопцам пападаліся ўсякія грыбы: казлякі, лісіцы, сыраежкі і іншыя. Але хлопцы не глядзелі на іх. Іх цягнулі баравікі. Вось прыйшлі ў малады хваёвы лес. Летам тут бывае многа грыбоў. У лесе яшчэ нікога не было. І дзеці былі рады, што яны прыйшлі першыя.

Перад тым як разысціся, яны дамовіліся не гукаць моцна, каб не пачуў іх ляснік. Толькі ціхенька свістаць і старацца трымаць у полі зроку адзін аднаго. Але ўсё гэта забылася, як толькі сталі пападацца баравікі. Вясёлы крык сам вырываўся ў хлопцаў: «Пятрусь! Вось хіба слаўнага найшоў баравіка!» Пятрусь бег да Алеся, і баравіка клалі ў кош. Потым баравікі сталі пападацца цэлымі кучамі. Сядзіць адзін, як капыт, пасярэдзіне. А вакол яго штук дзесяць малых. Часам адзін з іх знаходзіў маленькага баравічка. І толькі ставіў на зямлю кош, каб узяць яго, тады ўглядаў другога, большага. Хлопцы смяяліся і бралі наўперад «бацьку». Так называлі яны самага большага баравіка, потым меншых.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Яшчэ сонца чуць толькі ўспела падняцца над лесам, а ў хлопцаў ужо былі поўныя кошыкі баравікоў.

— Бачыш ты іх, — казалі цёткі, — якія малыя, а колькі набралі грыбоў!

*(Паводле Якуба Коласа)*

**Залéзцы** — *тут*: самаробныя жалезныя ножыкі.
**Вярстá** — мера адлегласці ў даўнія часы (1 км 6 м).

1. Прачытайце або праслухайце твор. Назавіце галоўных герояў.
2. Куды раніцай збіраліся хлопчыкі? Якога яны ўзросту?
3. Як выглядала наваколле да ўзыходу сонца? Прачытайце трэці абзац, перакажыце сваімі словамі.
4. Якіх грыбоў хацелі назбіраць хлопчыкі? Ці ўсе грыбы бралі ў кошыкі? Знайдзіце і прачытайце ў тэксце.
5. З якімі дарункамі лесу яны вярталіся дамоў?
6. За што хвалілі іх дарослыя?
7. Перакажыце тэкст па пытаннях.
8. Паразважайце, калі адбываліся падзеі. У даўнія часы ці цяпер? Знайдзіце доказ у тэксце.
9. Уявіце, што вы здымаеце з дарослымі фільм па творы. Якіх птушак вам трэба знайсці для здымак? Якія мясціны? Якіх акцёраў? У які час дня пачаць здымкі?

Вярста — гэта адзін кіламетр і шэсць метраў. Палічыце, якая была адлегласць да лесу ў апавяданні Якуба Коласа «У грыбах». Ці далёка трэба было ісці?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Узыход сонца



На ўсходзе неба грае
пераліўным блескам,
сыпле золата над гаем
і над пералескам.

Чуць-чуць дрогне, праліецца
чырвань на ўсходзе —
гэта неба ўсміхнецца
людзям і прыродзе.

*(Паводле Якуба Коласа)*

1. Прачытайце. Што апісваецца ў вершы?
2. Якія колеры раніцы апісаны аўтарам? Назавіце словамі верша.
3. Разам з дарослымі разбярыце значэнне выразаў «неба грае», «сыпле золата», «чырвань праліецца».
4. Якую карціну раніцы вы ўяўляеце праз гэты верш? Намалюйце яе.
5. Як трэба чытаць верш? Хутка, весела або павольна, разважліва?
6. Вывучыце верш на памяць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Летні дзень

Слава травам, слава кветкам,
слава летнім яркім дням,
і засеяным палеткам*,
і пакошаным лугам!

Слава людзям дружнай
працы,
слава ім! Мінуць вякі, —
будзе так жа выгінацца
шкло празрыстае ракі,

будзе мак цвісці на градах,
будзе ў сэрцы з веку ў век
несці творчай працы
радасць
непакорны чалавек.

*(Пятро Глебка)*

**Палéтак** — поле.

1. Прачытайце. Якая тэма твора?
2. Знайдзіце паўторы. Што апяваецца ў вершы?
3. Знайдзіце ў тэксце, якія былі палеткі, якія лугі. Хто іх засеяў, пакасіў?
4. З чым параўноўваецца рака? Ці падобная рака да шкла?
5. Які настрой верша? Як яго трэба чытаць: ціха, задуменна або гучна, урачыста?
6. Прачытайце выразна. Перадайце радасць ад працы ў летні дзень.

## Грыбы-лесавікі

Грыбы — цікаўныя лясныя жыхары.

Неяк выйшлі мы з Вадзікам на сонечную верасовую паляну. Прыселі на купіну*, каб перадыхнуць, агледзеліся і заўсміхаліся.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ


Трутавік


Абабкі


Баравік


Махавік

Проста перад намі пазіраў у неба, узабраўшыся на высокі пень, грыб-трутавік. Як бы паказвае сваю напружанасць і цікаўнасць: што там робіцца на небе?

А там кучаравяцца белыя воблакі, між імі разліваюцца азёрцы блакіту. Над воблакамі кружыцца коршак*, імкне серабрысты рэактыўны самалёт.

А вунь да стажка мурашніка падышоў баравік. Важны, бурагаловы, з пукатай* ножкай. Стаў і, узяўшы нябачныя рукі ў бокі, дзівіцца з мурашак, з іх мітуслівай работы.

Далей — болей.

Вунь да самага камля бярозкі прыціснуўся шэрабокі абабак. Відаць, ён намагаецца залезці на дрэва і з вышыні яго агледзець увесь лес. А можа, проста хоча пагушкацца на галінах і пагрэцца на сонцы?


Лісічкі


Сыраежка

За гэтым абабкам замірае, сагнуўшыся і злёгку прыкрыўшыся мохам, махавік. Ён слухае зямлю: ці хутка вылезуць на свет ягоныя браты і сябры?

Збоку махавіка — зеленаватая сцежка. Па ёй чародамі бягуць да лясной ручаіны шустрыя лісічкі і сыраежкі. Ім дужа цікава паглядзець там на сябе. І прыхарашыцца, папіць халоднай вадзіцы.

*(Паводле Міхася Вышынскага)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Ку́піна** — куст травы, зямля, парослая мохам (*рус.*: кочка).
**Ко́ршак** —драпежная птушка.
**Пука́ты** — тоўсты.

1. Пра якіх лесавікоў вы даведаліся?
2. Чаму ў творы іх называюць цікаўнымі?
3. Прачытайце, як паводзіў сябе баравік. Ён паказаны як жывая ці нежывая істота?
4. Да чаго праяўлялі цікаўнасць грыб-трутавік, абабак? Які грыб «слухаў» зямлю?
5. Намалюйце стог. Чаму мурашнік названы стажком?
6. Якую думку хацеў данесці да нас аўтар? Як трэба глядзець на прыроду?
7. Прачытайце па абзацах. Перакажыце блізка да тэксту.

## Суніцы

Лета напоўніла
спёкай нябёсы,
выжар* у сонечных
промнях іскрыцца,

спіну сваю
разгінае калоссе.
Пойдзем у лес,
пазбіраем суніцы.

Тут прахалода,
тут свет асаблівы,
царства звяроў
і птушыных палацаў.

Сёлетні год
на суніцы ўрадлівы,
змогуць усе іх
збіраць-частавацца.

Плямкі святла
і сунічныя шчочкі
так упрыгожваюць
мяккі імшанік*,

толькі збіраць іх
даводзіцца моўчкі —
таюць у роце
за шарыкам шарык.

*(Аксана Данільчык)*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Вы́жар** — выжарына, выпаленае месца.
**Імша́нік** — мясціна, парослая мохам.

1. Прачытайце верш. На якую ён тэму? Пра прыроду, грамадства ці перажыванні чалавека?
2. Калі паспяваюць суніцы? Дзе яны растуць? Што азначаюць словы «сунічныя шчочкі», «за шарыкам шарык»? Збярыце з літар слова: *г, а, Я, д, ы.*
3. Як у вершы названы лес? На якіх галінах размясціліся птушыныя палацы?
4. Чаму даводзіцца збіраць суніцы моўчкі? Ці смачныя ягады?
5. Што значыць «спіну сваю разгінае калоссе»? Пакажыце рухамі, як гэта адбываецца.
6. Прачытайце выразна. Перадайце настрой верша.
7. Ці збіралі вы суніцы? Чым гэтыя ягады не падобныя да іншых? Апішыце іх па колеры, форме і смаку.

Суніцы — смачныя вітаміны. Ягады лечаць ангіну, хрыпату, прастуду, грып, запаленне дзяснаў, дыябет, хваробы нырак. Карыснае будзе і варэнне з суніц, і кампот, і пасціла, і цукаты, і сушаныя ягады. А сунічнае лісце сушаць і робяць з яго смачную гарбату.

## Лета ў серванце**

### 1

На зіму мы лета ў серванце хаваем.

Як?

А вось як.

Чэрвеньскім ранкам, яшчэ да сонейка, узнімае нас маці з ложкаў:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Уставайце, дзеткі! Па ягады пойдзем.

Мы ўстаём. Але сон неахвотна адпускае нас. Хвілін колькі з заспанымі вачамі тупаем па пакоі, пазяхаем.

Нарэшце выходзім з хаты. Збягаем з горачкі да рэчкі і па роснай звілістай сцяжынцы ідзём да лесу. Свежае, нібы настоенае на туманах і кветках паветра праганяе сон-дрымоту. Ды і маці падбадзёрвае:

— Хутчэй, хутчэй, дзеткі! Летам збярэш, а зімой як знойдзеш.

Хораша ў лесе. Вясёлая бярозавая палянaчка, на якой то тут, то там паблісквaюць ярка-чырвоныя духмяныя суніцы.

Суніцы — самыя хітрыя ягадкі. Зашыюцца* пад лісцейка, і не відаць іх. Толькі калі сонейка загляне на палянку, заўсміхаюцца яны, яркімі зорачкамі ўспыхнуць. Вось і збірай іх тады.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ды за адной ягадкай не ганяйцеся, — вучыць нас маці. — Адну кладзі, другую бяры, а трэцюю прыкмячай. Інакш з пустым гарлачыкам* прыйдзеш дадому.

А ўслед за суніцамі ў сасновых барах, па нізкіх мясцінах і вакол балацянак* паспяваюць чарніцы.

Чарніцы — цёмныя ягады з сінявата-шызым* адценнем. Кіславатыя на смак. І вельмі цікаўныя. Так і глядзяць на цябе сваімі дапытлівымі вочкамі. Нібы пытаюць: «А хто гэта прыйшоў да нас?» І адразу выдаюць сябе.

Каб збіраць чарніцы, дастаткова мець спрытныя рукі. І, вядома, вытрымку.

— Ну што ты чарнічнік топчаш, ад купіны да купіны бегаеш! — сярдуе маці. — Гэта толькі здаецца, што на другой ягад больш.

А следам за чарніцамі ў сярэдзіне ліпеня заружавелі маліны.

Маліннік высечкі* і лагчынкі з рэдкім алешнікам выбірае. Маліны — цудоўныя ягадкі! І колерам, і пахам, і смакам чаруюць. Праўда, адшукаць іх не так і лёгка. У рост чалавека ўзняліся густыя кусты малінніку, хаваючы сваё багацце.

— А вы ціхенька кусцік разгарніце або прысядзьце ды знізу гляньце, — раіць нам маці. — Знізу відней. Заўважыце коску — за яе і абірайце.

Коску! І сапраўды, доўгая зялёная каса, пацеркамі ягад аздобленая!

**Зашы́цца** — схавацца.
**Гарла́чык** — збанок.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Балацянкі** — забалочаныя, сырыя месцы.
**Шызы** — шэры.
**Высечка** — месца, дзе высечаны дрэвы.

?! 1. Прачытайце або праслухайце тэкст. На якую тэму гэта апавяданне?
2. Пра якія ягады ўпамінаецца ў тэксце? Назавіце.
3. Апішыце ягады па форме, колеры, паху, смаку.
4. Як маці вучыла дзяцей збіраць суніцы? Раскажыце словамі з тэксту.
5. Як трэба збіраць чарніцы? Перакажыце словы маці.
6. Якія парады дае маці па зборы малін?

## 2

Гулкі жнівень на прасеках і ў лагчынках ажыны высыпаў. Няма ягад, прыгажэйшых за ажыны! Чырвона-чорныя, з таемным бурштынавым* бляскам. І смак у іх асаблівы — салодка-гаркавы. Ажыны — ягады, якія пастаяць за сябе ўмеюць. Галінкі іх калючкамі пакрыты. Колюцца! Каб ажыны збіраць, не толькі ўменне, а і цярпенне патрэбна. Так і хочацца не рукамі, а чаравікам* галіну прыгнуць. Ды маці папярэджвае:

— Асцярожна, асцярожна вакол кустоў хадзіце. І на наступны год сюды заглянем. А не заглянем мы, дык некага іншага гэтая сонечная мясцінка парадуе.

У ціхім жнівеньскім лесе збіраем мы апошні падарунак лета — брусніцы.

Брусніцы — у нашых мясцінах ягады рэдкія. Таму яшчэ загадзя, бываючы ў лесе, прыкмячаем мы брусьнічныя мясцінкі, звычайна на сонечных ускрайках бароў, вакол высечак. Ярка-чырвоныя, з бялюткімі, не кранутымі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

сонцам бачкамі, вісяць брусніцы паміж цвёрдых цёмназялёных лісцікаў. Гронкамі каля самай зямлі.

Пасля кожнага паходу ў лес маці варэнне варыць. А мы пенкамі ласуемся ды слоікі завязваем. Потым у сервант* ставім. Так слоік за слоікам хаваецца ў нашым серванце лета.

Снежаньскім вечарам уся наша дружная сямейка за сталом збіраецца. Бацька батон рэжа, а маці чай у кубачкі налівае. Калі нальe, пытаецца:

— Па якія ягады сёння пойдзем?

— Па суніцы!

— Па ажыны!

— Па малінку! — крычыць маленькая Проська.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Няхай будзе па-твойму, Прануська, — кажа маці і прыносіць з серванта слоік з малінавым варэннем. Аблівае лыжку кіпенем і накладвае варэнне ў талерачку. Варэнне густое, цёмна-ружовае, з залацістымі зярняткамі. Увесь пакой умомант напаўняецца малінавым водарам. Намазваем варэнне на лустачкі батона і п’ём чай. П’ём — і летнія паходы ўспамінаем. Як на лясной сцяжынцы калючага вожыка сустрэлі, як шэрая сава ад сваіх птушанят нас адводзіла, як у ельніку соннага зайца спудзілі, як...

За акном завіруха шуміць, мароз патрэсквае, а ў нашай хаце лецейка гасцюе.

І так аж да наступнага лета, калі чэрвеньскім ранкам, яшчэ да сонейка, узніме нас маці з ложкаў:

— Уставайце, дзеткі! Па ягады пойдзем.

*(Паводле Міколы Янчанкі)*

**Буршты́навы** — празрыста-жоўты, мядовы колер (*рус.*: янтарный).
**Чараві́кі** — туфлікі.
**Серва́нт** — шафа для посуду з зашклёнымі дзверцамі.

1. Пра якія лясныя ягады гаворыцца ў гэтай частцы?
2. Якія з ягад паспяваюць раней за іншыя? А якія — пазней?
3. Што гатавалі ў сям’і з дарункаў лесу? Які ўдзел у гэтым прымалі дзеці?
4. Паразважайце, чаму тэкст мае такую назву. Парайце дома даць зімовым запасам назву «лета ў серванце».
5. З якіх ягад гатуюць варэнне на зіму ў вас дома? Хто гэтым займаецца? Раскажыце ў класе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Рэха

Заблудзіўся ў лесе
неяк раз Ігнатка:
— Татка, дзе ты, татка?!

Рэха кажа:
— А-а-тка!

Разгубіўся хлопчык
і гукае:
— Мама!

Рэха паўтарае:
— Ама, ама, ама!

Горка плача хлопчык
і крычыць:
— Ратуйце!

Рэха нібы
дражніць:
— Туйце, туйце, туйце!

Чуе раптам хлопчык:
— Гэй, агу, Ігнатка!

І панесла рэха:
— Татка, татка, татка!

*(Авяр'ян Дзеружынскі)*

**1.** Што здарылася ў лесе з Ігнаткам?
**2** Як хлопчык гукаў сваіх бацькоў? Што чулася ў адказ?
**3.** Чаму плакаў Ігнатка?
**4.** Хто яго выратаваў?
**5.** Прачытайце выразна па ролях.

## Арэхі

І зноў кліча **звонкае** рэха:
— **Спяшайцеся** ў лес, **сябрукі**!
З галін **паказалі** арэхі
свае залатыя бачкі.



Такога занятку-пацехі
дагэтуль не **ведаю** я.
Арэхі, арэхі, арэхі —
**дзіцячая** радасць мая!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

... Лес повен і крыку, і трэску —
арэхі **спрабуем** на зуб,
сагналі вавёрку-гарэзку* —
агнём шуганула на дуб.



... Арэхі, арэхі, арэхі,
вас бачу праз гэтулькі год,
вы — рэха, вы — рэха, вы — рэха,
вы — рэха дзяцінства **майго**!

*(Мікола Янчанка)*

**Гарэ́зка** — гарэза, непаседа.

1. Прачытайце. На якую тэму гэты верш?
2. Назавіце летні занятак дзяцей.
3. Якія падобныя словы паўтараюцца ў вершы? Ці сапраўды яны нагадваюць рэха?
4. Што ўспамінае герой са свайго дзяцінства? Прачытайце ў апошнім слупку.
5. Што значыць выраз «агнём шуганула на дуб»? Якога колеру была вавёрка?
6. Ці даводзілася вам збіраць арэхі ў лесе? Раскажыце.

**Гульня «Слова схавалася ў слове»**

Знайдзіце ў вершы Міколы Янчанкі «Арэхі» слова *спрабуем*. Бачыце, у ім схаваўся дзеяслоў *абуем*? Паглядзіце ўважліва, якія словы схаваліся ўнутры іншых выдзеленых слоў.

Для даведкі: *рукі, дзіця, звон, каза, ай, май, даю*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Блытанка

Аблавухая* качка
пазяхае ў будзе*.
Белалобы сабачка
вудзіць рыбку будзе.

Акунёк — на сучок,
кажа: — Ку-ка-рэ-ку!
Падчапілі на кручок
пеўня-прастарэку*.

*(Данута Бічэль-Загнетава)*

**Аблаву́хая** — *тут*: з абвіслымі вушамі.
**У бу́дзе** — *тут*: у будцы.
**Прастарэ́ка** — балбатун.

1. Ці зразумелі вы верш? Ці бывае так?
2. Чаму твор мае такую назву? Гэта жартоўны ці сур'ёзны верш?
3. Пастаўце словы на месца, каб усё стала зразумела.

## Першы вылет

Эдзік выйшаў на ганак, спыніўся і незадаволена зірнуў навокал. Зноў кепскае надвор'е, зусім не летняе, як і ўсе апошнія дні! Зноў нельга купацца!

Хлопчык спусціўся па прыступках* і пайшоў мокрай пасля начнога дажджу сцежкай. Маці паслала яго назбіраць трускалак* на агародзе.



Толькі ён хацеў сарваць і кінуць у міску першую ягаду, як раптам убачыў вялікага светла-шэрага птаха*, які змагаўся з рэзкімі парывамі ветру. Птаха ўсё больш і больш адносіла ўбок. Вось ён ужо над самым агародам. Выставіў наперад доўгія ногі,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

нібы самалёт перад пасадкай, і павольна прызямліўся недалёка ад Эдзіка.

Хлопчык адразу забыўся і на міску, і на ягады, стаў набліжацца да птаха, што стаяў пасярод бульбы.

— Эдзік, хто гэта? — пачуўся голас сястрычкі Інкі. Яна хуценька збегла з ганка і апынулася каля брата.

Эдзік схапіў малую за руку.

— Ціха!.. — прашаптаў ён. — Хіба не бачыш? Чапля!

Інка паслухмяна спынілася.

— Стой тут і не варушыся! — скамандаваў Эдзік, а сам пачаў асцярожна набліжацца да чаплі.

Птушка і не думала адлятаць. Стаяла нерухома, бо была маладая, нядаўна пакінула гняздо і яшчэ не прывыкла баяцца людзей.

Хлопчык падскочыў да чаплі і схапіў яе за спіну, каб яна не магла ўзмахнуць крыламі або стукнуць дзюбай. Адной рукой ён прыціснуў чаплю да сябе, а другой моцна трымаў дзюбу. Чапля не супраціўлялася, не спрабавала вырвацца.

— Хадзі сюды! — паклікаў Эдзік сястру. — Бачыш, якая прыгожая?

Цяпер і дзяўчынка магла добра разгледзець птушку. Яе белую гнуткую шыю, і жоўтую дзюбу, і круглыя залацістыя вочы, і нават чорную чупрынку на патыліцы, якая смешна вісела ззаду, нібы маленькая незаплеценая коска.

Інка асцярожна пагладзіла шчыльнае блакітна-шэрае апярэнне.

— Што ты будзеш рабіць з ёю? — запыталася дзяўчынка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Да гэтай хвіліны Эдзік і сам добра не ведаў, нашто ён злавіў маладую чаплю, але, пачуўшы запытанне сястры, адказаў:

— Злавіў, каб табе паказаць. А цяпер аднясу ў поле і выпушчу. Хай ляціць куды хоча!

— І я з табою! І я!.. — з захапленнем закрычала Інка.

Яны выйшлі з агарода і падаліся да лугавіны за пасёлкам. Ісці было недалёка, бо хата стаяла на самай ускраіне.

Эдзік нёс чаплю пад пахай, адной рукой усё яшчэ сціскаючы дзюбу. Інка ступала побач, не зводзячы з птаха вачэй. Па вільготнай траве яны дайшлі да лугавіны і спыніліся. Тут, за кустамі, было зацішна. Эдзік паставіў чаплю на зямлю, а сам адышоў з Інкаю ўбок.

Вецер тым часам суняўся*. Неба ачысцілася ад хмар. Выглянула сонца.

З цікавасцю сачылі дзеці за кожным рухам цыбатага птаха. Чапля зрабіла некалькі няўпэўненых крокаў наперад, агледзелася, страсянулася. Узмахнула шырокімі, чорнымі на канцах крыламі і адарвалася ад зямлі. Узляцела яна цяжка, нязграбна. Спачатку бездапаможна боўтала ў паветры нагамі і нібы кулялася з боку на бок. Потым рухі чаплі набылі ўпэўненасць. Галаву яна адкінула на спіну, ногі выпрастала назад. Палёт яе зрабіўся роўным, павольныя ўзмахі крылаў — рэдкімі, дужымі.

Інка памахала ёй на развітанне рукой.

Неўзабаве крылатая госця знікла за лазняком.

Брат і сястра вярнуліся на агарод і ўзяліся за трускалкі. Спелыя ягады прывабна чырванелі сярод зялёных лісточкаў. Урадзіла іх нямала, і былі яны ўсе буйны́я, салодкія.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Калі дзеці пайшлі дахаты, набраўшы поўную міску духмяных ягад, Інка раптам спынілася.

— Чаму яна была на нашым агародзе? — спытала дзяўчынка. — Чаго яна хацела?

— Нічога не хацела, — паважна адказаў Эдзік. — Вецер быў надта моцны. Чапля стамілася і мусіла апусціцца. Крылы яшчэ не дужыя. Добра лятаць не навучылася, нявопытная. Відаць, гэта быў яе першы вылет у свет.

— Першы вылет, — задуменна паўтарыла Інка.

*(Паводле Віталя Вольскага)*

**Прысту́пкі** — сходы (*рус.*: ступеньки).
**Труска́лкі (труска́ўкі)** — клубніцы.
**Птах** — птушка.
**Суня́ўся** — сціх.

1. Прачытайце або праслухайце тэкст. На якую ён тэму?
2. Якое стаяла надвор'е?
3. Навошта Эдзік адправіўся ў агарод? Каго ўбачыў?
4. Як паводзіла сябе птушка? Чаму не ляцела?
5. Як хлопчык злавіў чаплю? Чаму яна не баялася дзяцей?
6. Як выглядала чапля? Апішыце яе па фотаздымку, карыстайцеся словамі з тэксту.
7. Дзе выпусцілі чаплю дзеці? Ці правільна зрабілі?
8. Якім быў спачатку палёт чаплі? Прачытайце. Чаму?
9. Што дзяўчынцы растлумачыў брат? Чаму твор атрымаў такую назву?
10. Падзяліце ў класе тэкст на часткі. Дайце кожнай назву. Перакажыце змест па плане.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Загар

*Байка*

Гавораць: **добрага патроху,**
Перабаршчы* — і справа дрэнь...
Уздумалася раз Цімоху
на сонцы смажыцца ўвесь дзень.

— Спячэш дашчэнту* скуру!
Кашулю б нацягнуў,
схаваўся б у цянёк,
а то ад гэткай працэдуры

патрапіш у бальніцу, галубок, —
добразычліва хтось засцерагае.
— Ты з сонцам не жартуй!..
Цімох і ўвагі не звяртае.

— **У чужое проса,** —
кажа, — **носа**
**лепш не суй!..**

Пот коціцца з Цімоха градам,
ужо не ўзяцца за плячук.
Ну, а хлапчук таму і рады:
— Вось буду чорны, нібы жук!

...А вынік быў непажаданы,
бацькам марока* і ўрачам была:
лямантаваў* ён нібы апантаны*,
а скура, як з вужа, спаўзла.

*(Эдуард Валасевіч)*

**Перабаршчы́ць** — перастарацца.
**Дашчэ́нту** — зусім.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Маро́ка** — лішнія клопаты.
**Лямантава́ў** — крычаў.
**Апанта́ны** — *тут*: ашалелы.

1. Прачытайце або праслухайце байку.
2. Што ўздумалася галоўнаму герою байкі?
3. Ад чаго перасцерагалі яго людзі?
4. Ці ветлівы быў хлопчык? Што адказваў іншым?
5. Якім быў вынік яго загару?
6. Чаму вучыць гэта байка? Як трэба было загараць?
7. Байка — гэта сур'ёзны верш ці жартоўны? Павучальны ці проста вясёлы?
8. Якая галоўная думка байкі? Дзе ў байцы змешчана мараль — у пачатку ці ў канцы? Знайдзіце і прачытайце.
9. Прачытайце выдзеленыя ў байцы прымаўкі. Выберыце адпаведнікі да іх з наступных выслоўяў:

*Не тыцкай нос, куды не просяць.*
*Усё добра, што ў меру, а што зашмат, тое не ў лад.*
*Не ўстаўляй свае тры грошы.*
*Што задужа — не здарова.*
*Не твайго розуму справа.*

Летняе сонца небяспечнае ўдзень: можна атрымаць апёк і сонечны ўдар. Лепш загараць раніцай — да адзінаццаці гадзін, а потым увечары — пасля трох гадзін. Яшчэ ў гарачыню на сонцы стараюцца піць болей вады, апранаюць галаўны ўбор.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Успомніце назву раздзела, які вы прачыталі. На якую тэму ў ім падабраны творы?
2. Чым у жыцці школьнікаў лета адрозніваецца ад іншых сезонаў года? Чаму лета называюць залатой парой?
3. Пра што расказваюць творы «У грыбах» Якуба Коласа і «Грыбы-лесавікі» Міхася Вышынскага? Які з іх пра прыгоды хлопчыкаў у даўнія часы?
4. Што новага вы даведаліся з твора «Лета ў серванце» Міколы Янчанкі? Дзе можна выкарыстаць гэтыя веды?
5. Успомніце, якую ягаду так вучыла збіраць маці: «Ды за адной ягадкай не ганяйцеся. Адну кладзі, другую бяры, а трэцюю прыкмячай. Інакш з пустым гарлачыкам прыйдзеш дадому». З якога твора гэтыя радкі?
6. Успомніце твор, дзе пераклікаюцца словы *рэха і арэхі*. Пра што гэты твор? Гэта верш ці апавяданне?
7. Перакажыце змест апавядання Віталя Вольскага «Першы вылет».
8. Як не трэба загараць? Перакажыце сваімі словамі змест байкі «Загар» Эдуарда Валасевіча.
9. Які твор вам больш за ўсё спадабаўся? Чым?
10. Праверце свае поспехі за 6 клас. Прачытайце незнаёмы тэкст. Разам з дарослымі палічыце, колькі слоў у хвіліну вы цяпер чытаеце. Параўнайце з вашымі поспехамі ў пачатку навучальнага года.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЛІТАРАТУРА

**1.** Літаратурнае чытанне: вучэб. дапам. для 6-га кл. першага аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання / І. М. Бобла, Л. І. Данільчанка, Ф. І. Шалабасава. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2012.

**2.** *Гардзей, В.* Жнівень [Электронны рэсурс] / В. Гардзей // karotkizmest.by. — Рэжым доступу : https://karotkizmest.by.html. — Дата доступу : 14.08.2020.

**3.** *Гарун, А.* Вясна [Электронны рэсурс] / А. Гарун // Вясёлка. — 2017. — 29 сак. — Рэжым доступу : http://www.veselka.by/?p=10085. — Дата доступу : 12.08.2020.

**4.** *Глебка, П.* Летні дзень [Электронны рэсурс] / П. Глебка // Беларуская Палічка — беларуская электронная бібліятэка. — Рэжым доступу : https://knihi.com/Piatro_Hlebka/Viersy_1925—1967.html#chapter96. — Дата доступу : 14.08.2020.

**5.** *Данільчык, А.* Павуцінка на агрэсце: вершы : для сярэд. шк. узросту / А. Данільчык ; маст. В. Г. Паўлавец. — Мінск : Маст. літ., 2005.

**6.** *Караткевіч, У.* Верабей, сава і птушыны суд : зб. тв. : у 8 т. / У. Караткевіч. — Мінск : Маст. літ, 1988. — Т. 2.

**7.** *Колас, Я.* У грыбах [Электронны рэсурс] / Я. Колас // Беларуская Палічка — беларуская электронная бібліятэка. — Рэжым доступу : https://knihi.com/Jakub_Kolas/U_hrybach.html. — Дата доступу : 14.08.2020.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ЗМЕСТ

**ПРЫЙШЛА З ВЯТРАМІ ВОСЕНЬ, ШУМІЦЬ ВЫСОКІ ЛЕС** ........ 3

«Заціх на лузе звон пчаліны...». *В. Жуковіч* ........ 3
Верасень. *Паводле К. Каліны* ........ 4
Надыход восені. *Паводле П. Броўкі* ........ 5
«З часоў далёкіх...». *Паводле М. Чарняўскага* ........ 6
Колькі раніц месціць ранец? *Р. Барадулін* ........ 6
Твая настаўніца. *Э. Агняцвет* ........ 7
Школа. *Паводле Я. Коласа* ........ 8
Новы сшытак. *Паводле Л. Арабей* ........ 9
Падранены журавель. *Паводле І. Навуменкі* ........ 12
Услед за сонцам. *Паводле З. Бяспалага* ........ 15
Бабка. *Паводле М. Танка* ........ 16
Гутарка грыбоў. *А. Дзяружынскі* ........ 17
Мухамор. *Паводле В. Хомчанкі* ........ 18
А таму! *Паводле М. Янчанкі* ........ 20
Хлеб. *В. Кудлачоў* ........ 23
Залаты лістапад. *Паводле В. Гардзея* ........ 25
Не сілай, а розумам. *Беларуская народная казка* ........ 26

**Пытанні і заданні для паўтарэння** ........ 27

**ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ** ........ 29

Я — беларус. *Н. Гілевіч* ........ 29
«Ёсць у кожнага з нас...». *Паводле Я. Крупенькі* ........ 30
Мая Беларусь. *Паводле У. Караткевіча* ........ 31
Радзіма. *А. Дзяружынскі* ........ 34
Буслы. *Казка. Паводле К. Каліны* ........ 35
Драч і Крот. *Казка. Паводле А. Клышкі* ........ 37
Дрымотна ціснуцца кусты. *Паводле А. Грачанікава* ........ 39



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Непаўторны край. *Паводле Я. Сіпакова* ........................ 39
Дзіва-пшаніца. *Паводле П. Пестрака* ........................ 41
Галасы поля. *Е. Лось* ........................ 43
Зайцава помста. *Паводле Р. Бензерука* ........................ 44
Яблыня. *П. Макаль* ........................ 47
**Пытанні і заданні для паўтарэння** ........................ 48

**ЗНОЎ ДА НАС ПРЫЙШЛА ЗІМА РУПНАЙ ГАСПАДЫНЯЮ** ........................ 49
Зімовы вечар. *Ц. Гартны* ........................ 49
Снег. *М. Хведаровіч* ........................ 50
Надыход зімы. *Паводле Я. Коласа* ........................ 51
Зімой. *Паводле М. Багдановіча* ........................ 52
Неўміручая зорка паэта. *Паводле В. Віткі* ........................ 53
Зіма-матуля. *А. Данільчык* ........................ 54
На лыжах. *Паводле Т. Хадкевіча* ........................ 55
Пакатаўся. *В. Зуёнак* ........................ 58
Сініца-жартаўніца. *Паводле З. Бяспалага* ........................ 58
Бегаў зайчык. *В. Зуёнак* ........................ 60
Зайцу не спіцца. *Паводле Я. Крамко* ........................ 60
Дабрадзей. *А. Дзеружынскі* ........................ 62
Зіма. *А. Ставер* ........................ 63
Маленькі лесавічок. *Паводле Р. Ігнаценкі* ........................ 64
Што прыносіць Новы год? *Л. Дайнека* ........................ 66
Ёлка. *М. Чарняўскі* ........................ 67
Пустыя кармушкі. *М. Маляўка* ........................ 68
Калінавая рукавічка. *Паводле А. Васілевіч* ........................ 68
Мяцеліца. *Паводле М. Янчанкі* ........................ 75
Знаходка. *Паводле М. Корзуна* ........................ 77
Зайцаў кажушок. *Казка. Паводле Р. Бензерука* ........................ 80
**Пытанні і заданні для паўтарэння** ........................ 82



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## РАСЦІ САПРАЎДНЫМ ЧАЛАВЕКАМ ........................... 83

Шануйце ўсё жывое. *Паводле У. Дубоўкі* ........................ 83
Малайчына. *У. Паўлаў* ........................................... 84
Як Сяргейка навучыўся шкадаваць. *Паводле В. Сухамлінскага* ........................................ 85
Гора. *Н. Мацяш* .................................................. 87
Бяроза і сасна. *А. Дзяржынскі* ................................ 88
Добрая фея. *Паводле Л. Арабей* ............................... 89
Бабуля захварэла. *І. Муравейка* .............................. 92
Прытворка. *І. Муравейка* ...................................... 93
Пiлiпка. *Э. Валасевіч* .......................................... 94
Загадкі з адгадкамі. *В. Жуковіч* .............................. 96
Гасцінцы. *Паводле Я. Івановіча* ............................... 97
Вавёрачка і Зубраня. *В. Жуковіч* .............................. 99
Ілгун. *В. Швед* .................................................. 101
Два яблыкі. *Паводле П. Рунца* ................................ 101
Як Шурык з дому ўцякаў. *Паводле Д. Слаўковіча* ........ 103
Подзвіг даяра. *Паводле У. Ліпскага* ......................... 106
Рукі рабочыя. *Н. Галіноўская* ................................ 109
Зароблены рубель. *Грузінская народная казка* ............ 110
**Пытанні і заданні для паўтарэння** ............................ 112

## З НАРОДНАЙ КРЫНІЦЫ ........................................ 114

Казка пра быка і яго сяброў. *Беларуская народная казка* ........................................................ 115
Стары бацька. *Беларуская народная казка* ................. 117
Разумная дачка. *Беларуская народная казка* .............. 119
Залаты птах. *Беларуская народная казка* .................. 122
Хітры мужык. *Беларуская народная казка* .................. 125
Як мужык гусей дзяліў. *Беларуская народная казка* .... 129



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Андрэй за ўсіх мудрэй. *Беларуская народная казка* ..... 132
Ганарыстая варона. *Беларуская народная казка* .......... 136
З рога ўсяго многа. *Беларуская народная казка* ............ 138
Музы́ка-чарадзей. *Беларуская народная казка* ............ 143
**Пытанні і заданні для паўтарэння** ............ 147

**ВЯСНА, ВЯСНА! УСЕ ЁЙ РАДЫ!..** ............ 149

Веснавыя ручайкі. *В. Гардзей* ............ 149
Прыйшла вясна. *Паводле З. Верас* ............ 149
Вясёлая песня. *А. Дзеружынскі* ............ 152
Добры дзень, вясна! *А. Данільчык* ............ 153
Мамін дзень. *Х. Жычка* ............ 155
Пільная варта. *Паводле У. Дубоўкі* ............ 155
Гасцінец. *Паводле Р. Ігнаценкі* ............ 158
Па-над белым пухам вішняў... *М. Багдановіч* ............ 159
Як птушкі вучыліся будаваць гнёзды. *Казка* ............ 160
Жаваранкі над Хатынню. *Паводле А. Кобец-Філімонавай* ............ 164
Бусел над Хатынню. *Паводле В. Жуковіча* ............ 167
Два полі. *А. Вярцінскі* ............ 168
У апошнія дні вайны. *Паводле М. Лужаніна* ............ 168
Май. *Ю. Свірка* ............ 172
А хіба ёсць, што забываюць? *Паводле П. Броўкі* ............ 173
Плошча Перамогі. *Паводле А. Астрэйкі* ............ 174
**Пытанні і заданні для паўтарэння** ............ 176

**ПРЫХОДЗІЦЬ ЛЕТА ЗВОНКАЕ** ............ 177

Залатая пара. *Паводле Р. Ігнаценкі* ............ 177
Летнім днём. *К. Кірэнка* ............ 178
У грыбах. *Паводле Я. Коласа* ............ 179



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Усход сонца. *Паводле Я. Коласа* .................................. 182
Летні дзень. *П. Глебка* .................................................. 183
Грыбы-лесавікі. *Паводле М. Вышынскага* ................... 183
Суніцы. *А. Данільчык* .................................................. 185
Лета ў серванце. *Паводле М. Янчанкі* ........................ 186
Рэха. *А. Дзеружынскі* .................................................. 192
Арэхі. *М. Янчанка* ......................................................... 192
Блытанка. *Д. Бічэль-Загнетава* ...................................... 194
Першы вылет. *Паводле В. Вольскага* .............................. 194
Загар. *Э. Валасевіч* ......................................................... 198

**Пытанні і заданні для паўтарэння** ................................. 200

**ЛІТАРАТУРА** ..................................................................... 201



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вучэбнае выданне

**Воюш** Інга Дзмітрыеўна
**Аляшкевіч** Валянціна Іосіфаўна

# Літаратурнае чытанне

**Вучэбны дапаможнік для 6 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання**

Адказны за выпуск *Т. Ф. Рослік*
Рэдактар *Т. Ф. Рослік*
Дызайн вокладкі *Д. Э. Герасімовіча*
Мастакі *А. А. Барташэвіч, С. Ю. Піскун*
У афармленні вокладкі выкарыстана рэпрадукцыя карціны
«Летні вечар у Слабодцы» Ганны Сілівончык
Камп'ютарная вёрстка *А. Л. Архіповіч, В. М. Крупскай*
Карэктар *Н. Б. Кучмель*

Падпісана да друку 30.12.2021. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 15,63. Ул.-выд. арк. 8,4. Тыраж 384 экз. Заказ 85.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ